# НЯСВІЖ

## ДА РОДНАГА КРАЮ З ЛЮБОЎЮ

# НЯСВІЖ

## ДА РОДНАГА КРАЮ З ЛЮБОЎЮ

Мінск
«Колорград»
2023



# ДАРАГІЯ ЖЫХАРЫ І ГОСЦІ НЯСВІЖЧЫНЫ!

Гісторыя нашага краю – гэта восем стагоддзяў паступальнага развіцця. У ёй пераплятаюцца падзеі і лёсы мноства пакаленняў людзей, якія ўзгадавалі ў сучасніках такія каштоўнасці, як добразычлівасць, беражлівыя адносіны да сваіх каранёў, жаданне захоўваць унікальную спадчыну продкаў.

Любоў да Радзімы, таленты і руплівая праца мінулых пакаленняў зрабілі Нясвіжчыну такой, якой усе мы бачым яе сёння: гасціннай, прыгожай, вядомай сваімі маляўнічымі ландшафтамі, адмысловай архітэктурай і культурнымі каштоўнасцямі. Даўнія традыцыі – той скарб, які ў наш час аб'ядноўвае ўсіх нашчадкаў гэтай зямлі, людзей розных лёсаў, характараў, узростаў, у адзінае цэлае, падахвочвае ганарыцца квітнеючым краем і ствараць новыя старонкі яго летапісу.

Сёння жыхары раёна ўпэўнена глядзяць наперад і працуюць дзеля надзейнага эканамічнага, сацыяльнага і духоўна-маральнага патэнцыялу Радзімы. Шчыра жадаю нашаму краю далейшага росквіту, а ўсім яго жыхарам – моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

Упэўнены, што будучыня прынясе нам яшчэ больш яркіх поспехаў.

З павагай,
старшыня Нясвіжскага раённага
выканаўчага камітэта

Аляксандр Ломскі


1 Arx Principis
2 Templu Corporis Christi
3 Collegium soci. Iesu
4 Monast. ord. minoru de observantia
5 Monast. S. Euphemia monialium
6 Pistorium
7 Hospitale S Spirit
8 Templum Graecorum
9 S. Lazari
10 Domus Capitanei
11 Domus Parochi
12 Porta Mirensis
13 Porta Sluczkum versus

# ГІСТОРЫЯ




# СТАРАЖЫТНЫ ВЯНОК НЯСВІЖА

Нясвіжская зямля... Прыгожая, шчодрая і... шматпакутная. Яна знаходзіцца амаль у цэнтры суверэннай Беларусі і неаднойчы станавілася разменнай манетай у войнах паміж дзяржавамі. Праз выпрабаванні і росквіт прайшлі яе жыхары, якім на працягу стагоддзяў давялося захоўваць нацыянальную самабытнасць у складзе і Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), і Рэчы Паспалітай, і Расійскай імперыі, і Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік... Усё гэта, вядома, наклала пэўны адбітак на фарміраванне нацыянальнай свядомасці і характару людзей, якім сёння ёсць чым ганарыцца і пра што расказаць.

А яшчэ гэты куточак Беларусі – адзін з самых рамантычных, чароўных і прыцягальных для турыстаў. Нясвіжскі замак, які ўваходзіць у склад гісторыка-культурнага музея-запаведніка, разам з мясцовым Фарным касцёлам з 2005 года ўключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. У горадзе пануе непаўторная атмасфера, сатканая з сучаснасці і паданняў, помнікаў архітэктуры, усмешак людзей...



# ПРА ШТО РАСКАЗАЛІ ГАРАДЗІШЧЫ

Пра далёкую мінуўшчыну наваколля Нясвіжа распавядаюць знаходкі, зробленыя падчас археалагічных раскопак. Работа гэта працягваецца і, магчыма, будзе яшчэ нямала адкрыццяў, аднак з таго, што дакладна вядома на сённяшні дзень, можна сцвярджаць: першыя пасяленні на тэрыторыі раёна з'явіліся даволі позна – толькі ў жалезным веку (пачатак I тысячагоддзя да н. э.). Гэта тлумачыцца тым, што першабытныя людзі рассяляліся ў першую чаргу па берагах вялікіх рэк, у якіх было шмат рыбы. Нясвіж жа размешчаны на галоўным водападзеле, тут працякаюць толькі невялікія рачулкі Уша і Лань. Адна нясе свае воды да Балтыйскага мора, другая – да Чорнага.

Старажытныя гарадзішчы каля в. Аношкі і в. Качановічы адносяцца да гэтага часу. Чаму менавіта ўмацаваныя паселішчы, якія абаранялі насельнікаў ад нападзення ворагаў? Кім былі тыя ворагі? Вучоныя мяркуюць, што з адкрыццём жалезных прылад працы ўзровень жыцця людзей значна палепшыўся (з'явіліся запасы харчавання, вялікія статкі жывёл) і радавыя абшчыны пачалі ваяваць паміж сабой за магчымасць валодаць гэтым багаццем.

Гарадзішча ля в. Качановічы размяшчалася на пагорку, вышыня якога зараз складае каля 6 м. Паселішча мела форму авала 70×40 м і адзіны ўваход. Вакол было балота, якое значна павышала абарончыя здольнасці гарадзішча. Гэтая мясцовасць упершыню апісана ў 1951 годзе вучоным-археолагам Астапавым, які пачаў даследаваць паўднёва-ўсходнюю частку пляцоўкі. Было ўстаноўлена, што культурны пласт, які ўтварыўся тут у выніку жыцця людзей, на месцы шурфа (спецыяльнага вертыкальнага



паглыблення ў зямлі для даследаванняў і пошуку артэфактаў) дасягаў 1,4 м, а ў цэнтры – 0,4 м. Яшчэ адзін шурф быў закладзены ў цэнтры гарадзішча даследчыкам Леанідам Побалем у 1964 годзе.

У 1953 годзе раскопкі на гэтым гарадзішчы правёў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук (НАН) Беларусі кандыдат гістарычных навук Аляксей Мітрафанаў. Ён даследаваў паўночна-ўсходнюю частку паселішча на плошчы 48 $м^2$. Падчас экспедыцыі было знойдзена шмат фрагментаў керамікі, костак жывёл, металургічных шлакаў, сустракаліся металічныя вырабы.

Таксама Аляксей Мітрафанаў устанавіў, што гарадзішча было пабудавана ў I–V стагоддзях нашай эры: пра гэта сведчылі знойдзеныя тут гліняныя праселкі, маленькі жалезны серп, нож з выгнутай спінкай, шылы. Так, серп дазволіў выказаць меркаванне пра тое, што мясцовае насельніцтва займалася земляробствам, а косці каровы, свінні і каня – што людзі разводзілі гэ-





Аляксей Мітрафанаў



Леанід Побаль

тую жывёлу і карысталіся ёй. Палявалі жыхары паселішча на лася, кабана, аленя, а з балотнай руды ў невялікіх печах-домніцах здабывалі жалеза.

Знойдзеныя на Качановіцкім гарадзішчы вырабы з гліны і іншыя характэрныя рэчы адносяцца да так званай культуры штрыхавай керамікі. Яе адметная рыса – глінянае начынне, якое яшчэ ў неабпаленым стане было пакрыта хаатычнымі штрыхамі, зробленымі пучком саломы. Трэба адначыць, што большасць навукоўцаў лічаць плямёны, якія пакінулі названую культуру, носьбітамі балцкіх дыялектаў. Дарэчы, і назва ракі Ушы, якая бярэ свой пачатак недалёка ад Качановіцкага гарадзішча, мае балцкае паходжанне.

Гарадзішча Аношкі ўзвышаецца над зямлёй таксама на 5–6 м і мае авальную форму памерам 110×80 м. У 1951–1952 гадах яго ўпершыню адзначыў У. Астапаў. Мясцовасць некалькі разоў абследавалася археолагамі, аднак раскопкі былі праведзены толькі ў 1988 годзе. Імі кіраваў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Эдвард Зайкоўскі.

Падчас раскопак было знойдзена шмат ляпной штрыхаванай керамікі і цікавыя вырабы з металу, сярод якіх – невялікая жалезная шпора ў выглядзе сагнутага дугой дроту. На вяршыні яго быў размешчаны шып, а на канцах адагнуты кручкі, з дапамогай якіх прылада мацавалася да абутку. Выкапалі таксама даволі вялікі (31 см) серп, некалькі гліняных прасліц і фігурку нейкай жывёлы. Самая буйная знаходка – рэшткі гаспадарчай пабудовы (3,6×3,2 м), якая мела блізкую да чатырохкутніка форму.

Гарадзішча каля в. Аношкі заснавана па меркаваннях даследчыкаў у III–V стагоддзях да нашай эры, так што яно магло існаваць адначасова з Качановіцкім. Дарэчы, і тут археолагі знайшлі пахаванне, зробленае ў пазнейшыя часы, але ўжо па хрысціянскім звычаі.



## ЦІКАВЫ ФАКТ

Рабоце па выяўленні старажытных рэчаў на Качановіцкім гарадзішчы перашкаджала тая акалічнасць, што пазней на гэтым месцы размясцілі могілкі. Аналіз пахаванняў дазволіў меркаваць, што гэта была, хутчэй за ўсё, брацкая магіла татарскіх ваяроў, якія загінулі ў бітве 1506 года пад Клецкам. Аднак дакладных доказаў гіпотэзы няма. І гэта толькі адна з існуючых таямніц, якія хавае нясвіжская зямля.

# НАШЫ ПРОДКІ – ДРЫГАВІЧЫ

*Паміж пустак, балот беларускай зямлі*
*На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,*
*Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, –*
*Ўдзірванелы курган векавечны.*
*Дуб галлё распусціў каранасты над ім,*
*Сухазелле ў грудзі ўпілося;*
*Вецер стогне над ім уздыханнем глухім, –*
*Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.*
*Янка Купала. Курган*




Да X стагоддзя нашай эры на землях цэнтральнай часткі сучаснай Беларусі пражывала ўжо шмат плямёнаў дрыгавічоў. Увогуле на тэрыторыі краіны знаходзілася некалькі этнічных аб'яднанняў усходніх славян: не толькі дрыгавічы, але і радзімічы, крывічы, палачане. Гэта былі ўжо не плямёны, а даволі ўстойлівыя аб'яднанні (протанароднасці) і адначасова пачатковыя дзяржаўныя ўтварэнні (протадзяржавы).

На жаль, дакладна невядома, як і калі плямёны дрыгавічоў з'явіліся ў наваколлі Нясвіжа, але захавалася нямала курганоў таго часу, больш глыбокае вывучэнне якіх здольна праліць святло на лад жыцця гэтых людзей.



Ужо сёння ў выніку даследаванняў старажытных паселішчаў і курганоў устаноўлена, напрыклад, што жылі дрыгавічы ў невялікіх зрубах, пакрытых дахам. У прадстаўнікоў племені была характэрная адзнака: жанчыны тут насілі ў якасці ўпрыгожання зярнёныя пацеркі, зробленыя з медзі і срэбра. Такое спалучэнне розных металаў надавала вырабу асаблівае хараство.





Яшчэ больш даведацца пра гісторыю мясцовасці дазваляюць 11 курганных груп (старажытных могільнікаў) X–XIII стагоддзяў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Нясвіжскага раёна.

Адна з іх размешчана ў наваколлі в. Чанавічы. Яе ў 1965 годзе даследаваў Пётр Лысенка, а ў 1985-м – Вольга Ляўко. А яшчэ, як паведаміў навукоўцам мясцовы жыхар, у 30-я гады XX стагоддзя адзін з курганоў быў самавольна раскапаны, у ім знайшлі кавалак шаблі, некалькі жалезных прадметаў і чэрап пахаванага чалавека. У 1991 годзе гэта тэрыторыя была абследавана вучонымі, на ёй зафіксавалі 26 насыпаў вышынёй 0,6–1,5 м, некаторыя з іх былі пашкоджаны магіламі XIX–XX стагоддзяў.

Яшчэ больш курганоў – 33 – змаглі адшукаць у тым жа 1991 годзе каля в. Сейлавічы. Магчыма, раней іх было больш. Падставы так меркаваць даюць факты. Напрыклад, Астапаў у 1952 годзе абследаваў курганы каля в. Нялепава (у двары школы). Тады там было 19 насыпаў, у 1977 годзе – 4, а ў 1991-м – толькі 2.

Курганныя могільнікі выяўлены таксама ў наваколлі вёсак Грыцкавічы, Гусакі, Качановічы, Наруцавічы, Нялепава, Хадатавічы, Вялікая Быхаўшчына, Міцысавічы. Але бадай самы буйны курганны могільнік дрыгавічоў адкрыла ў 1977 годзе Вольга Ляўко каля в. Мацылёўшчына. Ён налічваў 62 насыпы дыяметрам 2,5–4 м і вышынёй да 2 м. На жаль, да нашых дзён захаваліся далёка не ўсе рукатворныя помнікі тых часоў.

Заканчваючы гэту тэму, нельга не сказаць яшчэ некалькі слоў пра Качановіцкае гарадзішча. За 200 м ад яго таксама былі зафіксаваныя некалькі курганоў, але цяпер яны не існуюць. А само гарадзішча ля в. Качановічы адметна яшчэ і тым, што гэта адзінае паселішча дрыгавічоў у Нясвіжскім раёне, якое даследавалася археолагамі. Раскопкі паказалі, што акрамя ніжняга пласта, які адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі (пра гэта напісана вышэй), маецца яшчэ адзін, які датуецца эпохай ранняга феадалізму. Пра гэта сведчаць знойдзеныя там жалезныя ключы, цвікі, нажы, чатырохгранны наканечнік стралы, а таксама абломкі гаршчкоў, якія былі зроблены на ганчарным коле. У гэты час людзі ўжо жылі не толькі на самім гарадзішчы, але і вакол яго на плошчы каля 4 га. Там быў закладзены шурф, у якім таксама зроблены цікавыя знаходкі. Напрыклад, ганчарная кераміка X–XI стагоддзяў. Але большасць абломкаў адносілася да XII–XIII стагоддзяў (асобныя фрагменты – да яшчэ больш позняга часу). На некаторых чарапках заўважаны неглыбокія адбіткі трохвугольнага штампа. Гэта асаблівасць посуду з заходнеславянскіх земель, тэрыторыі Мазоўша. Таксама ў шурфе былі знойдзены фрагменты невялікіх жалезных нажоў, характэрных для X–XIII стагоддзяў.



**Прадметы, знойдзеныя падчас раскопак ля в. Качановічы**

## ЦІКАВЫ ФАКТ

Племянное княжанне дрыгавічоў доўгі час захоўвала сваю незалежнасць. Аднак паўночныя раёны іх тэрыторыі даволі рана ўвайшлі ў склад Полацкай зямлі, а пазней тут утварылася Менскае княства. У «Аповесці мінулых гадоў» дрыгавічы згадваюцца пад 116 годам, калі менскі князь Глеб «спустошыў быў дрыгавічоў». У апошні раз прадстаўнікі племяннога аб'яднання названы ў летапісе пад 1149 годам у сувязі з тым, што гарады «Слуцк, Клецк і ўсе дрыгавічы» апынуліся пад уладай «князя чарнігаўскага».

## ЦІКАВЫ ФАКТ

Вялікае паселішча было ў наваколлі і на месцы в. Фэрбаўшчына. Тут было знойдзена шмат рэчаў XVII стагоддзя. Па іх можна меркаваць, што тут знаходзіўся заможны панскі двор. Магчыма, гэта была сядзіба вядомага Каспара Фальберга, уладальніка вёскі, якая атрымала назву ад яго прозвішча. У 1675 годзе гэты населены пункт увайшоў у склад радзівілаўскіх уладанняў.



Гісторыю позняга Сярэднявечча ў наваколлі Нясвіжа можна было ўжо вывучаць з пісьмовых крыніц. Аднак гэта ніколькі не зніжае значэння археалагічных раскопак. Прычым вывучэнне помнікаў феадалізму на Нясвіжчыне пачалося адносна нядаўна. У 1991 годзе разгледжаны культурны пласт каля в. Панюцічы. Ён меў выгляд круга памерам да 50 м. Магчыма, на гэтым месцы стаяў невялікі двор, пра што сведчаць фрагменты гаршчкоў XVI–XIX стагоддзяў. Культурныя пласты прыблізна гэтага ж часу былі знойдзены каля вёсак Малева, Коханавічы, Лань.





# КАЛІ НАРАДЗІЎСЯ НЯСВІЖ?



Казімір IV Ягелончык

Адлічваць гісторыю Нясвіжа агульнапрынята з 1223 года. Летапісы таго часу сведчаць: на рацэ Калцы ў бітве з татарамі загінуў у ліку іншых князёў і князь Юрый «Несвежьскі». Аднак далейшыя даследаванні, у тым ліку археалагічныя, абвяргаюць гэту гіпотэзу. Шэраг вучоных лічыць, што прозвішча князя толькі сугучна назве беларускага горада, а сам Нясвіж узнік не раней за XV стагоддзе. Яго вуліцы правільна спланаваныя згодна з новаітальянскай сістэмай, населены пункт мае шэраг фартыфікацыйных збудаванняў.

Што тычыцца самой назвы «Нясвіж», то і тут няма агульнага меркавання. Адно з паданняў сцвярджае, што мясцовы князь падчас палявання забіў мядзведзя, аднак магчымасці адразу забраць з сабой тушу не меў. Праз некалькі дзён ён адправіў за ёй сваіх людзей. Мяса да гэтага часу ўжо сапсавалася, і князю далажылі, што мядзведзь «не свеж». Адсюль быццам і пайшла назва мясцовасці.

У аснову другога пункта гледжання пакладзена месцазнаходжанне горада. Кандыдат філалагічных навук А. Карцель у назве ўбачыла «воднае імя». Паселенне людзей, магчыма, узнікла на волаку – балоцістых мясцінах, з якіх білі крыніцы і выцякалі рэкі. Магчыма, побач з волакам, паміж рэкамі Уша і Лань, дзе, па паданнях, праходзіў знакаміты шлях «з варагаў у грэкі», і ўзнікла месца для адпачынку або захавання тавараў. Калі волак называўся «сведь», «свеж» або «свіж» ('балоцісты, дрыгва'), то месца на пагорку адпаведна было «не свіж» ('не балота, не дрыгва').

У XIV стагоддзі Нясвіж увайшоў у склад Вялікага Княства Літоўскага. У гэты ж час і з'явілася дакладнае найбольш ранняе ўпамінанне пра гэтую мясцовасць у пісьмовай крыніцы, аднесенае да 1445 года, дзе засведчана, што вялікі князь Казімір Ягелончык перадаў горад Мікалаю Яну Неміровічу. А да гэтага населены пункт належаў Сяляўку. 10 лістапада, згодна звесткам з архіва Радзівілаў, у Троках быў выдадзены прывілей на валоданне населеным пунктам Пятру Мантыгірду. Дарэчы, у гэтым дакуменце Нясвіж называецца не замкам, не горадам, а толькі дваром.

«Двор Нясвіжскі» ў XV – першай палове XVI стагоддзя быў цэнтрам невялікай гаспадарскай воласці. Насельніцтва яго займалася гандлем і рамёствамі.



Мікалай Ян Радзівіл Чорны

**ЯШЧЭ АДНО ЎПАМІНАННЕ ПРА НЯСВІЖ УТРЫМЛІВАЕ ХРОНІКА БЫХАЎЦА (1502 ГОД):**

«Татарове ж пайшлі загонамі на зямлю і дарогай ваявалі каля Клецка і Нясвіжа, і, спаліўшы горад Клецк, і, недайшоўшы Ноўгарадка шасці міляў, на Ісколты павярнулі».



Прысваенне Мікалаю Радзівілу Чорнаму і яго спадчыннікам тытула і герба князя Свяшчэннай Рымскай імперыі

Дачка Мантыгірда Ганна выйшла замуж за Станіслава Яна Кішку (у яго гэта быў другі шлюб), а ў якасці пасагу бацька даў за яе свае нясвіжскія ўладанні. Дачка Станіслава Яна Кішкі Ганна Кішка ў 1513 годзе пабралася шлюбам з Янам Мікалаем Радзівілам Барадатым. А калі ў 1523 годзе паміж ёй і братам Пятром Станіславам Кішкам адбыўся падзел бацькоўскай спадчыны, населены пункт разам з Алыкай перайшоў у валоданне Радзівілаў. У 1547 годзе Мікалай Ян Радзівіл Чорны атрымаў ад імператара Карла V тытул князя Свяшчэннай Рымскай імперыі і першым пачаў называцца князем на Нясвіжы і Алыцы, а ў 1549 годзе быў прызнаны вялікім князем ВКЛ, і з гэтага часу нясвіжскі маёнтак Радзівілаў стаў называцца Нясвіжскім княствам.

Цэлых чатыры стагоддзі знаходзіўся Нясвіж ва ўладанні сям'і Радзівілаў. Багатае і ўплывовае сямейства ператварыла яго ў найпрыгажэйшае месца, куды з'язджаўся ўвесь тагачасны бамонд. Але пра ўсё па парадку.





# ЗАМАК НА СТАГОДДЗІ

Яшчэ пры Кішках або Радзівілу Барадатым у Нясвіжы быў узведзены драўляны замак (некаторыя даследчыкі магчымым заснавальнікам яго лічаць Радзівіла Чорнага). Будынак знаходзіўся на месцы цяперашняга Старога парка, у ім насельніцтва хавалася ў выпадку набліжэння да горада ворагаў.



Драўляны замак у Нясвіжы, фрагмент карціны Тамаша Макоўскага

## ЦІКАВЫ ФАКТ

Стварэнне новага горада пачалося па загадзе князя Крыштофа Радзівіла Сіроткі з узвядзення ў 1583 годзе мураванага замка. На той час гэта было першакласнае па еўрапейскіх мерках абарончае збудаванне. У 1586 годзе горад атрымаў Магдэбургскае права і герб. І праз тры гады пачалося будаўніцтва мураваных ратушы і гандлёвых радоў.



Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка

Нясвіж узводзіўся ў адпаведнасці з тэндэнцыямі эпохі Рэнесансу, а ў некаторых пытаннях з'яўляўся нават заканадаўцам мод. Менавіта тут у другой палове XVI – пачатку XVII стагоддзя знайшлі месца новыя архітэктурныя і горадабудаўнічыя прыёмы.

Прыблізна ў 1582 годзе для змянення выгляду замка і ўзвядзення гарадскіх будынкаў Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка запрасіў з Італіі архітэктара Джавані Бернардоні. Падмурак новай крэпасці быў закладзены 7 мая 1583 года.





План палаца ў Нясвіжскім замку, 1582 год



Выява рэканструяванага палаца Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі, 1582 год




Напачатку 1586 года ўладальнік населенага пункта выдаў прывілей нясвіжскім мяшчанам, у якім надзяляў іх пэўнымі льготамі пры ўмове, што падчас узвядзення мясцовых умацаванняў будуць пабудаваныя дзве каменныя брамы. Князь асабіста сачыў за ходам фартыфікацыйных работ у горадзе і замку, і да 1600 года яны былі ў асноўным завершаны. Самая дасканалая на той час новаітальянская абарончая сістэма грунтавалася на двух галоўных фактарах: наяўнасці штучных вадаёмаў і падземных камунікацый. І тое, і другое ў поўнай ступені было рэалізавана Сіроткам. Шляхам пашырэння рэчышча ракі Ушы вакол горада было створана шэсць вадаёмаў, якія існуюць і зараз. Яны складаюць адзіную каскадную сістэму з перападамі ўзроўняў прыкладна ў 1 м. Зямля, якую выкопвалі пры стварэнні сажалак, выкарыстоўвалася для насыпу земляных валоў.

Што тычыцца падземных збудаванняў, то, на жаль, сёння не існуе поўных звестак пра іх месцазнаходжанне, хоць некаторыя вядомыя і захаваліся ў добрым стане.

На гэты час прыйшоўся і эканамічны росквіт Нясвіжа, у замку назапашвалася шмат помнікаў культуры. Знаходкі на тэрыторыі ўмацавання адносяцца да канца XVI – пачатку XIX стагоддзя. Многія з іх падобныя да матэрыялаў з раскопак Мірскага замка, які з 1568 года, як і Нясвіжскі, належаў Радзівілам. Так, у кляштары бенедыкцінак знойдзеныя фрагменты паліванага і тэракотавага посуду, паліхромных і зялёных кафляў з геральдычным і раслінным дэкорам, шкляных вырабаў, будаўнічага матэрыялу.





Найбольш цікавыя знаходкі выяўленыя на паўночнай і заходняй частках былой гандлёвай плошчы, каля ратушы і гандлёвых радоў. Як і на тэрыторыі кляштара бенедыкцінак, тут знойдзены фрагменты кафляў, посуду, шкляных вырабаў, цэглы, дахоўкі. Так высветлена, што культурны слой на даследаванай тэрыторыі пачаў інтэнсіўна адкладвацца з канца XVI стагоддзя.

ТАКІМ ЧЫНАМ, РАСКОПКІ ПАЦВЕРДЗІЛІ, ШТО XV СТАГОДДЗЕ – НАЙБОЛЬШ ВЕРАГОДНЫ ЧАС НАРАДЖЭННЯ НЯСВІЖА, ПАКУЛЬ ЯШЧЭ Ў МЕЖАХ «ДВАРА». ЦІ ІСНАВАЎ ЁН РАНЕЙ – ДАКЛАДНА ПАКУЛЬ НЕВЯДОМА.

## ЦІКАВЫ ФАКТ

Сярод фрагментаў кафляў і будаўнічага матэрыялу трапляюцца і бракаваныя вырабы, што ўказвае на мясцовае паходжанне асноўнай колькасці будаўнічай, архітэктурна-дэкаратыўнай і бытавой керамікі. Вельмі нязначная частка белаглінянага паліванага посуду паступала ў XVII–XVIII стагоддзях у Нясвіж з Польшчы або Палесся. Менш за 1 % ад усіх знаходак складаюць фрагменты тэракотавых гаршчкоў, якія можна датаваць XV стагоддзем.



# БЛЯСК І ЗАНЯПАД РАДЗІВІЛАЎ

*...Замак, крамы, брама, вежы –*
*У здзіўленні тут стаіш.*
*Гэта дар ад Радзівілаў*
*Нашчадкам будучым – Нясвіж.*
*Уладзімір Богдан*

Але вернемся да Радзівілаў. Ян Радзівіл знаходзіўся ў вялікай пашане ў караля польскага і вялікага князя літоўскага Аляксандра, а затым быў і даверанай асобай малодшага брата Аляксандра Жыгімонта І. Аўтары мемуараў малююць Яна Радзівіла як сапраўднага рыцара, высакароднага чалавека, які, дзякуючы сваёй блізкасці да вялікага князя, заклаў падмурак для далейшага дабрабыту сваёй сям'і.

У XVI стагоддзі ў Еўропе пачалася Рэфармацыя. Цэнтрам гэтага руху ў Беларусі стаў Нясвіж. Сын Яна Радзівіла Мікалай Радзівіл Чорны прыняў вучэнне Кальвіна і нават заняўся друкаваннем рэлігійнай пратэстанцкай літаратуры.

Важнай падзеяй для сям'і Радзівілаў стала атрыманне ў 1551 годзе права на захаванне ў Нясвіжскім замку «Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага» – другога экземпляра архіўных дакументаў, якія тычацца гісторыі княства.

Друкарня ў Нясвіжы была заснаваная братамі Кавячынскімі і Лаўрэнціем Крышкоўскім. У 1562 годзе ў ёй выданы кнігі Сымона Буднага «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Гэта былі першыя беларускамоўныя кнігі, надрукаваныя кірыліцай на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Помнік Сымону Буднаму па праекце скульптара Святланы Гарбуновай устаноўлены ў Нясвіжы ў 1982 годзе ў скверы побач з каталіцкім храмам.










Старонка «Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага»

## ЦІКАВЫ ФАКТ

Мікалай Радзівіл Чорны, канцлер Вялікага Княства Літоўскага і ваявода віленскі, князь Свяшчэннай Рымскай імперыі, у сярэдзіне XVI стагоддзя быў, па сутнасці, другой асобай у дзяржаве. У 1561 годзе падчас ад'езду вялікага князя ў Польшчу ён стаяў на чале ВКЛ. З той пары Нясвіж сталі называць некаранаванай сталіцай дзяржавы.



Разварот адной з кніг метрыкі з запісамі за 1511–1518 гады

# ЧОРНАЯ ПАННА – КАХАННЕ КАРАЛЯ

*…Хай успаміны сэрцы нам поўняць,*
*Тая славутасць мінулых гадоў.*
*Дзеці і ўнукі, усе будуць помніць*
*Чорную панну, былую любоў.*
*Тамара Прыгун*

Такая ўплывовасць дома Радзівілаў мела пад сабой грунтоўную аснову. Справа ў тым, што стрыечная сястра Мікалая Радзівіла Чорнага Барбара была жонкай караля польскага і вялікага князя літоўскага Сігізмунда II Аўгуста.

Аднак каралевай Барбара прабыла зусім нядоўга, усяго пяць месяцаў. Каранаваная 5 снежня 1550 года, 8 мая 1551 года яна памерла. Лічыцца, што яе атруціла маці мужа Бона Сфорца.

Трэба сказаць, што і для Барбары, і для Жыгімонта гэта быў другі шлюб (першыя іх муж і жонка памерлі). Барбара і Сігізмунд кахалі адно аднаго, але маці караля марыла пра больш высакародную нявестку, таму ім прыйшлося абвянчацца таемна. І нават калі прадстаўніцу роду Радзівілаў афіцыйна каранавалі ў Вільні, Бона Сфорца ніяк не магла змірыцца з выбарам сына. Памірала Барбара ў пакутах.



Сігізмунд II Аўгуст і Барбара Радзівіл

Пры жыцці яна так і не пабывала ў Нясвіжскім замку, а пасля яе смерці Жыгімонт, які вельмі сумаваў па каханай, вырашыў уваскрэсіць жанчыну з дапамогай спірытычных сеансаў. Згодна з паданнем, дух Барбары прыйшоў да яго і князь, не стрымаўшы сваіх пачуццяў, захацеў каханую абняць. Душа спужалася і не знайшла зваротнага шляху, доўга блукала па свеце, пакуль, нарэшце, не пасялілася ў Нясвіжскім замку. З таго часу і ходзіць тут па начах Чорная панна, шукаючы супакаення, галосіць па сваім рана загубленым жыцці і каханні. Усе Радзівілы верылі ў гэта паданне, а прывід лічылі добрым.





# КАМЕННАЕ АБЛІЧЧА ГОРАДА

У 1565 годзе канцлер Вялікага Княства Літоўскага Мікалай Радзівіл Чорны раптоўна памёр, пакінуўшы чатырох сыноў. Паўнамоцтвы галавы сям'і перайшлі да старшага, Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі, які ўвайшоў у гісторыю як разумны і празорлівы правіцель. Менавіта ён пачаў фарміраваць каменнае аблічча Нясвіжа з квартальнай планіроўкай.

У 1566–1587 гадах ён набыў у прыватных уласнікаў мясцовасці Ліпу, Свержань, Алекавічы, Лань, Кукавічы, Юшавічы, Быхаўшчыну, Чанавічы, Салтанаву Гаць і інш., у 1568–1569 гадах атрымаў у спадчыну Мірскае графства і далучыў яго да Нясвіжскага княства, ператварыўшы апошняе ў буйную латыфундыю (маёнтак, землеўладанне).

## ЦІКАВЫ ФАКТ

Вучыўся будучы князь Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка ў пратэстанцкай школе свайго бацькі, аднак потым публічна адрокся ад кальвінізму і стаў прапаведаваць каталіцызм. Ён быў вельмі веруючым чалавекам і ў 1582 годзе нават адправіўся ў двухгадовае паломніцтва на Святую Зямлю. Наведаў Сірыю, Палесціну, Егіпет, Лівію. Храмам і манастырам Іерусаліма Сіротка зрабіў вялікія ахвяраванні.

Для паляпшэння ўмоў працы і гарантыі правоў рамеснікаў і купцоў, якія прыязджалі па запрашэнні Мікалая Радзівіла Сіроткі ў Нясвіж і сяліліся тут, князь звярнуўся да караля Стэфана Баторыя з просьбай аб наданні горады Магдэбургскага права і ўручыў яму ўжо падрыхтаваны праект. Пры ўвядзенні самакіравання за ўзор быў узяты буйны горад Вялікага Княства Літоўскага.



Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка

**На выяве Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка развітваецца з каралём Стэфанам Баторыем**



## ЦІКАВЫ ФАКТ

У 1586 годзе кароль падпісаў прывілей, у якім дараваў Нясвіжу Магдэбургскае права. Жыхары горада назаўсёды вызваляліся ад платы за грэблі і масты, на 50 гадоў – ад падаткаў, што збіраліся ў Вялікім Княстве Літоўскім. Апрача ранейшых, былі ўстаноўлены два новыя кірмашы: адзін – на Сёмуху, другі – перад Божым нараджэннем. Кожны працягваўся два тыдні.



22 студзеня 1796 года зацверджаны расійскі герб заштатнага г. Нясвіжа (разам з іншымі гербамі Мінскага намесніцтва): у верхняй частцы шчыта – герб мінскі, у ніжняй – герб, дадзены Стэфанам Баторыем, 24 чэрвеня 1586 года

# ГЕРБ І СЦЯГ

З гэтага ж часу горад займеў і свой герб: на ім з аднаго боку на залатым полі размяшчалася палова чорнага арла, рассечанага ўздоўж, але з цэлай галавой, а з другой – 10 касых палос (сімвалічны след ад удару мяча ці сякеры) блакітнага, чырвонага і залатога колераў. Выява геральдычнага сімвала была на гарадской пячатцы – гэтым падкрэслівалася незалежнасць Нясвіжа ад княжацкай і каралеўскай улады. У Нацыянальным музеі Беларусі захоўваецца чорна-белы фотаздымак гэтага герба, які, верагодна, быў зроблены ў 1880–1890-я гады.

Наяўнасць герба сведчыла пра тое, што горад перайшоў на больш высокую прыступку сацыяльна-прававога развіцця і ўжо істотна адрозніваўся ад навакольных вёсак у дадатак да таго, што ён і так з'яўляўся цэнтрам княства. Дазвол на выкарыстанне гарадскога геральдычнага сімвала зацвярджаў асобае, прывілеяванае палажэнне той або іншай установы. Выява герба ўпрыгожвала фасады мясцовай ратушы і будынкаў, якія былі ўласнасцю населенага пункта, а таксама гарадскія сцягі.



Гэтая выява была зацведжана ў якасці герба і ў наш час (рашэнне Нясвіжскага райвыканкама ад 23 снежня 1999 года № 19/35). З выкарыстаннем колераў геральдычнага знака быў спраектаваны сцяг горада, які мае форму сцягоў Сярэднявечча. Ён зацверджаны рашэннем Нясвіжскага райвыканкама ад 23 сакавіка 2001 года № 5/43.

18 чэрвеня 1586 года Мікалай Радзівіл Сіротка выдаў Нясвіжу прывілей, у якім гарантаваў поўнае захаванне пры праўленні роду Радзівілаў атрыманых горадам правоў. Уводзілася пасада войта, які атрымліваў шэсць валок зямлі. Войт і мяшчане выбіралі бурмістра і дарадчыкаў, устанаўлівалася апеляцыя гарадскога кіравання да князя і яго нашчадкаў. Мяшчане атрымалі ў вечнае валоданне зямельныя надзелы і права распараджацца імі без усякай аплаты.





Разбудаваны Нясвіж стаў галоўным горадам ардынацыі (неадчужальнай уласнасці магнацкага роду), утворанай 16 жніўня 1586 года ў адпаведнасці з сямейным пагадненнем паміж Мікалаем Радзівілам Сіроткам і яго братамі Альбрэхтам і Станіславам.

27 верасня 1592 года быў прыняты яшчэ адзін важны дакумент – «Ухвала месца Нясвіжскага», у якім замацоўваліся абавязкі гараджан па абароне свайго населенага пункта. Нясвіжскія мяшчане павінны былі рамантаваць гарадскія ўмацаванні і насыпаць валы там, дзе гэта спатрэбіцца. Яны маглі вызваляцца ад абавязку выконваць «валовую работу» пры ўмове, што кожны год будуць уносіць у бюджэт магістрата па 30 «грошаў літоўскіх» з кожнага пляца.



Сыны Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі: Ян Юры, Альбрэхт Уладзіслаў, Мікалай Крыштоф Радзівілы



«Ухвала месца Нясвіжскага», 27 верасня 1592 года

Падчас праўлення Мікалая Радзівіла Сіроткі актыўна развівалася культура, з'явіўся шэраг будынкаў духоўнага прызначэння. Шчыры католік Мікалай Крыштоф Радзівіл пачаў знішчаць усю рэлігійную літаратуру, выдадзеную бацькам. Па загадзе князя зачынілі друкарню, кальвініскіх пастараў замянілі каталіцкія святары. Па яго запрашэнні ў Нясвіж прыехалі езуіты, якія ў 1584 годзе адкрылі пачатковую школу граматыкі. Князь запісаў ім маёнтак Ліпск з шасцю вёскамі і вызваліў ад вайсковай службы, чыншу і наогул ад усіх павіннасцей. У 1586–1588 гадах паводле планаў з Рыма быў пабудаваны корпус езуіцкага калегіума (павялічаны ў 1593–1599 гадах), а ў 1587–1593 гадах архітэктарам Джавані Бернардоні ўзведзены касцёл Божага Цела. У 1591-м князь разам з жонкай Альжбетай Эўфеміяй (з Вішнявецкіх) заснаваў кляштар бенедыкцінак, аддаўшы ім набыты ў слуцкіх князёў Алелькавічаў фальварк Гавязна з вёскамі Ахрэмавічы, Вязавец, Зарэчча,

Петухоўшчына, а таксама 11 маргоў зямлі ў паўднёва-ўсходняй частцы горада і 9 тыс. злотых на пабудову кляштара. У 1598 годзе ён па волі сваёй памерлай жонкі заснаваў кляштар бернардзінцаў. Пры князі пачала фарміравацца і Нясвіжская карцінная галерэя.

Памёр Мікалай Радзівіл Сіротка ў 1616 годзе, улада перайшла да Яна Юрыя Радзівіла. Падчас яго праўлення ў верасні 1617 года Нясвіж наведаў будучы кароль Уладзіслаў IV. Яго цёпла віталі і князь, і гараджане. Насустрач Уладзіславу IV выйшлі з харугвамі цэхі, на замкавых валах госця сустракалі стрэламі. Улічваючы тое, што каралевіч ішоў у паход на Маскву, гаспадар Нясвіжа падараваў яму дзве вялікія гарматы.

Ян Юрый Радзівіл не меў нашчадкаў, таму пасля яго смерці ў 1625 годзе праўленне перайшло да яго брата Альбрэхта Уладзіслава. У 1625 годзе па ўсёй краіне лютаваў мор, які ў кастрычніку дасягнуў і Нясвіжскага княства. Загінула больш за пяць дзясяткаў людзей. У лістападзе бедства адступіла, а ўдзячныя жыхары Нясвіжа ў 1626 годзе ў прадмесці Новы горад пабудавалі капліцу. Хвароба паспрыяла і адкрыццю ў населеным пункце аптэкі (1627 год).

Пасля таго, як у 1634 годзе Уладзіслаў IV стаў каралём, ён пацвердзіў Нясвіжу ўсе атрыманыя прывілеі, вызваліў горад ад пошлін.

Давялося ўзысці на княжаскі трон і трэцяму сыну Мікалая Сіроткі Аляксандру Людвіку Радзівілу. Падчас яго праўлення ў 1636–1654 гадах Нясвіж квітнеў і развіваўся. У 1640 годзе ў горадзе прайшлі пышныя ўрачыстасці, прысвечаныя 100-годдзю з дня заснавання ордэна езуітаў. Па вуліцах прайшлі працэсіі, былі выстаўлены гербы ордэна і Радзівілаў, партрэт Мікалая Крыштофа Сіроткі, школьная моладзь выконвала пад музыку трыумфальныя гімны. Аляксандр Людвік Радзівіл паклаў у касцёле адлітае з золата ў натуральную велічыню сэрца.

Праект Фарнага касцёла (касцёла Божага Цела) у Нясвіжы





Фарны касцёл (касцёл Божага Цела) у Нясвіжы



Ян Юрый Радзівіл



Аляксандр Людвік Радзівіл



Міхаіл Казімір Радзівіл

На долю наступнага валадара Нясвіжа Міхаіла Казіміра Радзівіла прыйшлося нямала выпрабаванняў. Падчас вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй (1654–1967 гады) Нясвіж двойчы (у 1654-м і 1659-м) быў узяты штурмам і разрабаваны. Але ўтрымаць горад царскае войска не змагло. Беспасяховымі былі і аблогі замка. Заняць населены пункт у 1660 годзе не ўдалося, але разбурэнні былі значныя.

Пасля гэтага спусташэння Міхаіл Казімір дабіўся ад сейма Рэчы Паспалітай вызвалення ад падаткаў на чатыры гады. Прывілей караля Міхаіла Карыбута Вішнявецкага ад 29 кастрычніка 1669 года часова вызваліў мяшчан ад падаткаў «...звычайнага, старога, новага і чопавага». Але горад аднаўляўся марудна, князю даводзілася прыкладаць нямала намаганняў, каб адрадзіць былую веліч Нясвіжа. Не без яго старанняў у 1670 годзе сейм Рэчы Паспалітай на 20 гадоў вызваліў мяшчан ад выплаты мытных збораў, мыта старога і новага.

У 1672 годзе падчашы (прыдворны, які падаваў напоі да каралеўскага стала і такім чынам адказваў за асабістую бяспеку першай асобы дзяржавы) смаленскі Базыль Баканоўскі заснаваў кляштар дамініканцаў, пабудаваў і 26 жніўня 1680 года асвяціў мураваны касцёл святога Яна Хрысціцеля.

Каб заахвоціць людзей жыць ў Нясвіжы, 20 студзеня 1673 года Міхаіл Казімір Радзівіл выдаў універсал, у якім гарантаваў новапасяленцам розныя свабоды, у тым ліку магчымасць пакінуць горад у любы час. Гэтыя меры далі свой плён.

Кляштар дамініканцаў, 1672–1873 гады



### ЦІКАВЫ ФАКТ

У 1673 годзе ў Нясвіжы налічвалася каля 2,4 тыс. жыхароў і 366 двароў.

А князь тым часам адстойваў інтарэсы свайго горада перад каралеўскім дваром, і з 1674 года яму гэта было рабіць лягчэй. Справа ў тым, што Міхаіл Казімір Радзівіл знаходзіўся ў шлюбе з роднай сястрой Яна Сабескага Катажынай. Ян III, уступіўшы на трон, не толькі пацвердзіў Нясвіжу ўсе ранейшыя прывілеі, але і надалей вызваліў яго ад пошлін і мыта. Асобным прывілеем, у якасці ўзнагароды за мужнасць у барацьбе з ворагам, стаў устаноўлены ў 1681 годзе чатырохтыднёвы кірмаш, які пачынаўся 25 жніўня.

У 1680 годзе Міхаіл Казімір памёр. На працягу 12 гадоў пасля яго смерці памесцямі кіравала яго жонка Катажына. Яна звярнулася да свайго брата караля Яна III з просьбай не пакінуць яе ў гэтых няпростых абставінах. І той працягнуў руку дапамогі, узяўшы пад сваю апеку і яе сям'ю, і яе ўладанні.

На сейме 1681 года кароль зацвердзіў прадстаўлены Катажынай Радзівіл статут купецкага цэха, а 26 сакавіка 1682 года ў Яварове падпісаў прывілей, якім перанёс пачатак чатырохтыднёвага кірмашу з 25 жніўня на Уводную нядзелю.



Ганна Катажына Радзівіл

### ЦІКАВЫ ФАКТ

21 лютага 1688 года ўладальніца Нясвіжа з ведама караля выдала загад магістрата, якім забаранялася дапускаць гарадскіх яўрэяў у кіраўнічыя ўстановы. Ім прадпісвалася не чыніць ніякіх пабораў у кірмашовыя дні, каб не стрымліваць гандаль і не перашкаджаць развіццю і ўзбагачэнню горада.





# ПАПЯЛІШЧА ПАЎНОЧНАЙ ВАЙНЫ

Трагедыя напаткала Нясвіж падчас Паўночнай вайны 1700–1721 гадоў. Яшчэ з 1692 года ў замку гаспадарыў Караль Станіслаў Радзівіл.

У пачатку 1706 года шведскі кароль Карл XII, які з войскам стаяў пад Гродна, паслаў свае атрады нішчыць гарады і замкі прыхільнікаў караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста II Моцнага. У сакавіку 1706 года атрад пад камандаваннем падпалкоўніка Траўтфэтэра быў накіраваны ў Нясвіж. З прысвечанай Нясвіжскаму раёну кнігі «Памяць»: «...Акружаны валам і ровам, Нясвіж меў прыгожы і моцны замак – ён стаяў за межамі горада. Гаспадар замка не прыняў у яго сцены казакоў, а іх у горадзе налічвалася каля 2 тыс. чалавек, камандаваў імі палкоўнік Міхаіл Міклашэўскі, адзін з вышэйшых военачальнікаў Мазепы. Прыбыўшы вельмі рана (14 сакавіка) да гарадскіх муроў і выстраіўшы тры батальёны сваіх драгунаў, Траўтфэтэр ударыў адначасова на браму і гарадскія валы. Казакі, сабраўшыся на рынку, адказалі агнём. Але шведы, з ходу захапіўшы браму, напалі з палашамі на непрыяцеля так хутка, што казакі разбегліся па бліжэйшых дамах, а іх военачальнікі і 300 чалавек палеглі на полі бою. 500 казакоў зачыніліся ў мурах езуіцкага калегіума, якога Траўтфэтэр не змог узяць без гармат вялікага калібру. У замак не пусцілі ніводнага казака, адтуль не стралялі па шведах, хоць яны на вачах военачальніка



Карта тэрыторый вакол Нясвіжа часоў Паўночнай вайны 1700–1721 гадоў

ўшчэнт разбілі каля рова казацкі атрад. Тых, хто паўцякаў у дамы, Траўтфэтэр загадаў не забіваць. Але казакі, не жадаючы карыстацца ласкай шведаў, безупынна вялі з вокнаў і дзвярэй агонь. Тады военачальнік вырашыў выкарыстаць апошні сродак: даў загад падпаліць горад. У пажары загінула 500 або ўсе 600 казакоў.

Каля 180, уцякаючы з агню, добраахвотна здаліся ворагу. Чатыры гарматы, чатыры штандары, дзве пары літаўраў і дамашнія рэчы, якія не згарэлі ў агні пажараў, сталі здабычай пераможцаў. Траўтфэтэр адаслаў палонных і 50 чалавек параненых – сярод іх былі афіцэры і салдаты, а сам рушыў на Ляхавічы...»

У спаленым Нясвіжы застаўся стаяць абарончы замак, які шведам так і не ўдалося захапіць. Таму праз два месяцы Карл XII сам рушыў на яго. Гарнізон Нясвіжскай крэпасці налічваў 200 чалавек, толькі 90 з якіх былі сапраўднымі салдатамі. Падпалкоўніка Траўтфэтэра і генерала-ад'ютанта Расенштэрна паслалі да каменданта крэпасці Балімана з прапановай праз гадзіну здаць крэпасць. І яе здалі шведам. Тут былі разбураны абарончыя збудаванні (бастыён і ўваходная брама), спалены ўвесь ваенны рыштунак, у тым ліку сцягі, ручная зброя і шчыты. Затоплена 21 гармата. Каменданта, афіцэраў і ўвесь гарнізон адпусцілі на волю. Выгнаўшы яўрэяў і сялян, што хаваліся ў замку, і дазволіўшы ім узяць сваю маёмасць, шведы падпалілі крэпасць. Тое ж чакала і горад, які, за выключэннем касцёлаў і кляштараў, ператварыўся ў попел.



Караль Станіслаў Радзівіл





# ЯК ПТУШКА ФЕНІКС

Работы па аднаўленні замка вяліся марудна, і да канца жыцця Караля Станіслава (1719 год) яны завершаны не былі. Толькі ў 20-я гады XVIII стагоддзя пад кіраўніцтвам яго старэйшага сына – Міхаіла Казіміра Радзівіла Рыбанькі – Нясвіж пачаў адраджацца. Адной з першых сваіх пастаноў ад 26 ліпеня 1724 года ўладар, пацвярджаючы прывілеі сваіх папярэднікаў, дазволіў карыстацца гарадскімі правамі ўсім, хто хацеў тут пасяліцца. Былі адноўлены ўмацаванні замка і наогул населенага пункта, бо Нясвіж меў вялікае стратэгічнае значэнне для ўсяго Верхняга Панямоння і цэнтра Беларусі. З поўначы і захаду на падыходах да горада ўзвялі дадатковыя бастыённыя ўмацаванні, якія правым краем упіраліся ў штучнае вадасховішча.

У прывілеі Міхаіла Казіміра гораду ад 1731 года ёсць спецыяльны параграф пра вайсковыя вучэнні. Паводле яго на трэці дзень Сёмухі ўсе дарослыя мужчыны ўдзельнічалі ў спаборніцтвах стралкоў на прыз «караля куркоў».

Аднаўленне і перабудова замка ў стылі барока завяршыліся пасля 1726 года. У выніку ён атрымаў тое аблічча, якое захавалася да гэтай пары.



Ва ўмацаванні па-ранейшаму было многа зброі. Так, у 1765 годзе ў ім налічвалася 36 гармат, галоўным чынам мясцовай адліўкі, сотні мушкетаў, карабінаў, «янычарок», пісталетаў і інш.

Адраджалася і культурнае жыццё. У 1726 годзе па ініцыятыве першай жонкі Міхаіла Казіміра Францішкі Уршулі Радзівіл з Вішнявецкіх у горадзе з'явілася музычная школа, а ў 1740-м – і прыдворны тэатр з капэлай і балетнай школай, які спачатку працаваў як тэатр прыгонных сялян, а пазней ператварыўся ў прафесійны. Пад яго патрэбы выдзелілі будынак манежа так званай Рыцарскай акадэміі. Стацыянарны тэатр называўся камедыхаўзам і быў размешчаны побач з плошчай. У залежнасці ад надвор'я і жадання Радзівілаў тэатральныя пастаноўкі праходзілі таксама і на адкрытай пляцоўцы ў форме падковы, якая існуе па сённяшні дзень.

У 1747 годзе ў Нясвіжы адкрыўся кадэцкі корпус, каралеўскім прывілеем ад 27 жніўня 1750 года было дазволена аднавіць дзейнасць друкарні. У замку Радзівілаў знаходзіліся багатая бібліятэка, арсенал, карцінная галерэя. У прадмесці Альба, дзе ў XVI стагоддзі Сіроткам быў створаны парк і так званы эрмітарыум (месца для адзіноты і філасофскага роздуму), узвялі комплекс архітэктурных збудаванняў, у прыватнасці, мураваны палац і набярэжныя каналы.



Міхаіл Казімір Рыбанька вядзе свае войска на бой перад каралём Аўгустам III, 1744 год







Палац у прадмесці Альба

У 1678 годзе ўзнікла ідэя стварэння спецыяльнага памяшкання: галерэі для карцін. У калекцыі Радзівілаў у 1760–1770 гады было каля 1 тыс. палотнаў, і яна была самая значная і вялікая на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Праект галерэі быў даручаны архітэктару Аўгусціну Лоцы.

Характэрна, што ў гэтыя гады стварыўся трывалы эканамічны падмурак горада. У 1740-я была закладзена мануфактура шаўковых паясоў, пазней пераведзеная ў Слуцк. У 1752 годзе заснавалі дывановую і суконную мануфактуры, з 1755 года працаваў бровар.

Пасля смерці Міхаіла Казіміра Рыбанькі валадаром Нясвіжа стаў яго сын Караль Станіслаў Радзівіл (Пане Каханку), які ўвайшоў у гісторыю як самы багаты, шчадралюбны і непрадказальны прадстаўнік сям'і Радзівілаў.



Праект палаца ў прадмесці Альба

### ЦІКАВЫ ФАКТ

У Нясвіжскім замку заўсёды знаходзілі прытулак мастакі, акцёры і майстры розных спецыяльнасцей. Сярод іх, напэўна, і быў вынаходнік, які ў 1760-я гады зрабіў механічную вылічальную машыну, што выконвала чатыры арыфметычныя дзеянні: складанне, адніманне, множанне і дзяленне. Вылічэнні можна было рабіць у даволі шырокім дыяпазоне – ад аднаго да мільярда. Існаваў прыбор у адзінкавым экземпляры. Ён быў прыдуманы і зроблены Еўнам Якабсонам, гадзіннікавым майстрам і механікам. Зараз гэта лічыльная машына знаходзіцца ў музеі Міхаіла Ламаносава ў Санкт-Пецярбургу.



Караль Станіслаў Радзівіл (Пане Каханку)

Згодна з паданнем, аднойчы для таго, каб пацешыць гасцей, ён загадаў пасыпаць дарогу соллю і летам катаўся па ёй з запрошанымі на санях, запрэжаных мядзведзямі. Ён мог з'явіцца на Ратушнай плошчы ў адзенні Бахуса, седзячы на бочцы з віном... Усе экстравагантныя ўчынкі князя сталі падставай для шматлікіх цікавых гісторый.

Але лёс Пане Каханку склаўся даволі трагічна. Нягледзячы на сваю паказную лёгкасць і весялосць, ён быў значнай і прынцыповай палітычнай фігурай, рашэнні якой мелі вялікую моц і сур'ёзныя наступствы. У 1764 і 1768 гадах з-за антырасійскіх пазіцый князя, якія ён выявіў падчас выбараў новага караля Рэчы Паспалітай, і ўдзелу ў Радамскай і Барскай канфедэрацыях, горад займалі расійскія войскі.

У 1767–1768 гадах, калі князь Караль Станіслаў Радзівіл на кароткі тэрмін вярнуўся ў Нясвіж, ён паспрабаваў адрадзіць кадэцкі корпус, заснаваны бацькам. Корпус праіснаваў да 1776 года.

У ліпені 1769 года Пане Каханку быў вымушаны зноў пакінуць Рэч Паспалітую: Нясвіж перайшоў да расійскіх валадароў.

Радзівілаўскія землі тым часам сталі аб'ектам вялікіх спусташэнняў. Гістарычныя і мастацкія каштоўнасці замка былі канфіскаваныя. Значную частку бібліятэкі, 15 тыс. тамоў (з 20 тыс. агульнай іх колькасці), у 1772 годзе вывезлі ў Пецярбург і перадалі Акадэміі навук.

Князь цяжка перанёс усё гэта. Толькі ў 1780 годзе ён, адышоўшы ад палітычнай барацьбы, змог вярнуцца ў Нясвіж. Караль Станіслаў пачаў адраджэнне замка, але ў 1790-м памёр, не пакінуўшы нашчадкаў.





# У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе Нясвіжскі замак здаўся расійскім войскам пасля залпаў першых батарэй. Без асаблівых цяжкасцей быў узяты і горад, які ў тым жа годзе стаў часткай Расійскай імперыі. Указам Сената ад 23 красавіка 1793 года стварылася Мінская губерня, а ў яе складзе – Нясвіжскі павет з цэнтрам у Нясвіжы.

Са жніўня 1793 года ў горадзе знаходзілася правіянцкая камісія, якая павінна была забяспечваць войскі харчаваннем. Да гэтага часу ўмацаванні Нясвіжа і замка былі значна пашкоджаныя і страцілі сваю функцыянальнасць. Аднак рускія афіцэры ўлічвалі стратэгічнае значэнне населенага пункта і вартасць замкавай фартыфікацыі.

Падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі, мэтай якога стала барацьба за суверэннасць Рэчы Паспалітай і аднаўленне яе ў межах 1772 года, пачалося тэрміновае ўмацаванне фартыфікацыйных збудаванняў у Нясвіжы. У гэты час тут знаходзіўся сам генерал-губернатар Цімафей Туталмін – адсюль ён дасылаў шматлікія рапарты да імператрыцы Кацярыны ІІ, да князя Мікалая Рапніна, які камандаваў расійскім войскам на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, і да іншых военачальнікаў. У ліку іншага генерал-губернатар скардзіўся на спачувальны настрой да паўстанцаў з боку мясцовай шляхты і падкрэсліваў значную ролю ў гэтым князёў Радзівілаў.

Малалетні князь Дамінік Геранім Радзівіл, якому пасля смерці ў 1790 годзе Караля Радзівіла (Пане Каханку) дасталіся ўсе нясвіжскія ўладанні, у 1794 годзе знаходзіўся ў Галіцыі. Яго апякун і брат нябожчыкабацькі Мацей Радзівіл, падкаморы (суддзя па спрэчках аб межах маёнткаў) літоўскі, драматург і кампазітар, прыняў актыўны ўдзел у паўстанні. На свае грошы ён узброіў некалькі атрадаў пяхоты і кавалерыі, а сялян, якія далучаліся да барацьбы, вызваляў ад прыгонніцтва. За гэта Мацея Радзівіла пазбавілі права на апеку над князем Дамінікам. Да пачатку 1795 года паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі было падаўлена.



Дамінік Геранім Радзівіл

Князь Дамінік Геранім Радзівіл, дасягнуўшы паўналецця (1804 год) і ўступіўшы ва ўладанне спадчынай, прысягнуў на вернасць расійскай дзяржаве. Але гэта не перашкодзіла яму ў 1812 годзе падчас вайны Напалеона з Расійскай імперыяй заняць бок французаў. З пяцітысячным войскам князь Дамінік рушыў на Маскву, а потым адступаў разам з французскай арміяй. Паранены ў баі, Дамінік Радзівіл памёр у Францыі 11 лістапада 1813 года, пакінуўшы пасля сябе дачку Стэфанію.

За здраду князя Дамініка на працягу лістапада – снежня 1812 года радзівілаўскія багацці былі вывезены спачатку ў Мінск, а затым большая іх частка трапіла ў імператарскі Эрмітаж. 24 лютага 1814 года ўказам Аляксандра I замак быў перададзены прадстаўніку берлінскай лініі роду Радзівілаў князю Антонію Генрыку, вядомаму кампазітару, віяланчэлісту і намесніку прускага караля ў княстве Пазнаньскім, які і стаў XII ардынатам нясвіжскім. Ён сам і яго нашчадак Вільгельм жылі ў Берліне, а Нясвіжскі замак пуставаў да 1865 года.



**Нясвіжскі замак на акварэлі Юзэфа Пешкі, першая палова XIX стагоддзя**



# МАЦІ НЯСВІЖСКІХ ПАРКАЎ – МАРЫЯ

*Сонцам шчодрыцца*
*Высь блакітная.*
*Прыгажэе парк – вечны цуд.*
*О, Нясвіжчына знакамітая!*
*Гістарычны наш слаўны кут!*
*Іван Гурбан*

Доўгі час на нясвіжскіх землях панавала маёмасная неразбяруха, пакуль у 1865 годзе сюды не прыбылі законныя нашчадкі ардынацыі: Радзівілы берлінскай лініі родам з Клецка Антоні Вільгельм і яго жонка Марыя Дарота, народжаная маркіза дэ Кастэлян.

Марыя Радзівіл паставіла перад сабой мэту: захаваць і адрадзіць Нясвіж як сімвал гістарычнай, «еўрапейскай», па яе словах, ролі знакамітага роду. Ёй і яе мужу ўдалося дабіцца многага. У 1900 годзе ў замак вярнулі калекцыю зброі, у 1906-м сюды з пецярбургскага Эрмітажа прыбыла частка раней вывезенага багацця. Для гэтага Радзівілы звярнуліся да расійскага імператара Мікалая II. Яны прадставілі дакументы на канфіскаваную маёмасць спецыяльна створанай камісіі і атрымалі дазвол забраць некаторыя рэчы. Вярнуць здолелі, зразумела, далёка не ўсё.

Адначасова аднавілася і свецкае жыццё ў замку. Тут, як і раней, на паляўнічыя сезоны збіраліся прадстаўнікі кіруючых дамоў, арыстакраты, дыпламаты, дзеячы мастацтва.

Дзякуючы намаганням Марыі дэ Кастэлян вакол замка быў створаны цудоўны парк. Ён кампазіцыйна завяршыў станаўленне Нясвіжскага замкавага ансамбля.



## ЦІКАВЫ ФАКТ

Нясвіжскі парк уяўляў сабой, па сутнасці, пяць розных па сваім выглядзе кампазіцый агульнай плошчай 108 га (уключаючы сажалкі), якія не мелі агароджы і візуальна працягваліся, утвараючы адзіны ансамбль вады і зеляніны.

У 1875 годзе ў Нясвіжы замест закрытага дамініканскага кляштара па ініцыятыве міністра асветы Расіі графа Дзмітрыя Талстога і папячыцеля Віленскай навучальнай акругі М. Сергіеўскага была створана настаўніцкая семінарыя, мэтай якой стала падрыхтоўка настаўнікаў для пачатковых школ. Пры ўстанове дзейнічала ўзорнае пачатковае вучылішча. У пачатку 1900 гадоў у ёй з'явілася метэаралагічная станцыя, у 1910-м – музей наглядных навучальных дапаможнікаў і прыстасаванняў. У снежні 1919 года гімназія была закрытая з-за адмовы польскіх акупацыйных улад ад фінансавання ўстановы. У розны час у семінарыі вучыліся этнограф Антось Галіна, бацька паэта Максіма Багдановіча Адам Багдановіч, фалькларыст і этнограф Аляксандр Сержпутоўскі, а таксама Павел Дземідовіч, Васіль Камлюк, Васіль Сташэўскі, Аляксандр Сташэўскі, Кузьма Чорны і інш. Класік беларускай літаратуры Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч) атрымліваў тут адукацыю «за казённы кошт» у 1896–1902 гадах.

Наступны нясвіжскі ардынат Ежы Фрыдрых Радзівіл пераехаў з Берліна ў Нясвіж у 1905 годзе. Разам з ім у мясцовым замку апынуліся багатая калекцыя манет, мушкеты, сталовыя прыборы, паляўнічыя трафеі і іншыя



Марыя Дарота Радзівіл







рэчы, сабраныя сям'ёй у Германіі. З-за хваробы князю цяжка было спраўляцца з гаспадаркай (свае апошнія гады ён правёў у Вене), таму збудаваннем па-ранейшаму займалася яго маці Марыя дэ Кастэлян-Радзівіл.

На пачатку XX стагоддзя замак быў цалкам адрэстаўраваны. У сакавіку 1913 года Радзівілы адзначылі 400-годдзе свайго знаходжання ў Нясвіжы. На ўрачыстасці з гэтай нагоды быў запрошаны хор Варшаўскай оперы, а вынікам мерапрыемства ў Варшаве стала дамоўленасць з Янам Якубоўскім аб напісанні гістарычнага рукапісу пра Нясвіж, які так і не быў скончаны з-за смерці заказчыкаў і пачатку Першай сусветнай вайны.



Ежы Фрыдрых Радзівіл

Руская настаўніцкая семінарыя ў Нясвіжы



У настаўніцкай семінарыі



# ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА

Падчас Першай сусветнай вайны – з 1915 года – Нясвіжчына стала прыфрантавой зонай. Да гэтага царскія войскі таксама былі размешчаныя на гэтай тэрыторыі, а з пачаткам ваенных дзеянняў іх колькасць павялічылася. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя ў горадзе знаходзіліся штабы 40-й артылерыйскай брыгады і 40-га лятучага артылерыйскага палка. У 1915 годзе ў Нясвіжы размясціўся штаб 2-й арміі Заходняга фронту.

Са жніўня 1915 года згодна з распараджэннем расійскай ваеннай улады замак Радзівілаў быў узяты пад ахову.

Падчас вайны ў Нявіжы знаходзіўся лазарэт, у якім пасля ранення ляжаў вядомы рускі празаік Канстанцін Паўстоўскі. Пра гэта ён згадваў у аўтабіяграфічнай аповесці «Гнілая зіма». Некаторы час пісьменнік з атрадам кватараваўся ў Замір'і (цяпер Гарадзея).

1917 год Беларусь сустрэла разрэзанай на дзве часткі лініяй фронту. Нясвіжчына была прыфрантавой зонай, у вёсках размяшчаліся розныя вайсковыя часці.





Казарма 4-й батарэі 40-й артылерыйскай брыгады, 1906 год





Карціна Івана Уладзімірава «Далоў арла!», 1917 год

У гэты час газета «Минский голос» неаднойчы паведамляла пра бамбаванне Замір'я. Так, у маі 1917 года тут здарыўся вялікі пажар ад таго, што нямецкі самалёт скінуў снарады. Згарэла больш за 100 дамоў і лавак.

27 лютага 1917 года ў Петраградзе адбылася Лютаўская рэвалюцыя і ўлада перайшла да Часовага ўрада. Аднак ён не спыніў галоўную перашкоду развіццю краіны – сусветную вайну. Не было вырашана і зямельнае пытанне, не ўдалося ліквідаваць прыгнёт нацыянальных меншасцей. Склаліся ўсе перадумовы для новай рэвалюцыі.

І Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя грымнула ў кастрычніку 1917 года. Часовы ўрад быў скінуты.

25 кастрычніка ў Петраградзе адбыўся II Усерасійскі з'езд Саветаў. У ім прымалі ўдзел 25 дэлегатаў з Беларусі. Нясвіжскі Савет прадстаўляў бальшавік А. Стулаў.

Мінскі Савет, выканаўчы камітэт якога адначасова рэалізоўваў і функцыі выканаўчага органа Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці, неадкладна прыняў меры па ўстанаўленні савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце. 27 кастрычніка для гэтага быў створаны Ваеннарэвалюцыйны камітэт (ВРК), куды ўвайшлі і бальшавікі з франтавога камітэта.

1 лістапада ў Нясвіжы ў замку Радзівілаў пачаў сваю работу II з'езд 2-й арміі. Ён падтрымаў уладу Саветаў, стварыў армейскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Нясвіжскі ВРК быў арганізаваны 5 лістапада 1917 года.

Але 16 лютага 1918 года Германія паведаміла Савецкай Расіі, што скончыўся тэрмін перамір'я, і 18 лютага аднавіла наступальныя дзеянні.

Калі немцы захапілі цэнтральны ўчастак Заходняга фронту Маладзечна – Замір'е, штаб расійскіх вайскоўцаў уначы з 19 на 20 лютага эвакуіраваўся ў Смаленск. У гэты ж дзень Нясвіж быў заняты пяхотай працiўнікаў. Акупацыя прынесла з сабой бязлітасную эканамічную эксплуатацыю і затрымку рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Вакол горада дзейнічала бальшавіцкае падполле. Найбольш актыўнымі яго ўдзельнікамі былі А. Залескі, Ф. Залескі, І. Валодзька, Ф. Валодзька, П. Лабаноўскі, А. Жук.

Восенню ў Германіі адбыліся рэвалюцыйныя падзеі, і 13 лістапада Брэсцкая дамова была ануляваная. Пачалася эвакуацыя нямецкага войска.

Так, 1 студзеня 1919 года была абвешчана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. А 4 студзеня ў Нясвіжы прайшоў мітынг, які падтрымаў яе стварэнне. Праз некалькі тыдняў прайшлі выбары ў Нясвіжскі Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

Між тым войскі Польшчы пачалі наступленне на Беларусь. У сакавіку атрады ворагаў падышлі да раёна Слуцк – Сіняўка – Нясвіж. 16 сакавіка былі захопленыя Баранавічы, пазіцыі фронта знаходзіліся за 10–15 вёрст ад Нясвіжа. Абстаноўка патрабавала мабілізацыі энергічных, вытрыманых, добрых агітатараў. Збіраліся розныя надзвычайныя падаткі, адбывалася «выкачванне» хлеба. Злоўжыванні з боку харчатрадаў, калі ў сялян адбіралі насенны фонд і прадукты, сталі адной з прычын антысавецкіх выступленняў у некаторых паветах, у тым ліку і ў Слуцкім, у які ўваходзіла Нясвіжчына.

Нясвіжскае паўстанне адбылося 15–18 сакавіка 1919 года, ім кіраваў Мечыслаў Валністы. Чырвонаармейскі атрад на чале з Андрэем Пракапчуком папрасіў дапамогу з Мінска. У выніку паўстанне было падаўлена, а яго кіраўнікі расстраляны.

6 жніўня 1919 года польскія войскі занялі Нясвіж. На захопленай тэрыторыі інтэрвенты ўсталявалі жорсткі рэжым, пазбавіўшы народ палітычных правоў. Праводзілася татальная паланізацыя грамадства: усё польскае насаджалася, а беларускае знішчалася.

Праявай нацыянальнай самасвядомасці ў гэты час было адкрыццё беларускіх школ у гарадах і вёсках і дзейнасць па перакладзе існуючых устаноў на беларускую мову. Тое, што гэта было небяспечна для ўдзельнікаў, не спыняла мясцовае насельніцтва: многія з такіх школ працавалі ў дамах жыхароў таемна.

Нясвіж быў вызвалены ад палякаў 15 ліпеня 1920 года, і неўзабаве мясцовыя падпольныя дзеячы стварылі рэўкам, старшынёй якога прызначылі М. Цывіна.





29 ліпеня 1920 года рашэннем Мінскага губернскага ВРК быў утвораны Нясвіжскі павет.

Пасля заключэння 18 сакавіка 1921 года Рыжскай дамовы паміж Польшчай і Расіяй Нясвіжчына апынулася пад уладай Польшчы. У адносінах да беларусаў новае кіраўніцтва зноў праводзіла палітыку прымусовай паланізацыі і асіміляцыі. Польская мова стала афіцыйнай ва ўсіх дзяржаўных установах, органах самакіравання, школах. Цяпер беларускую мову забаранялася вывучаць не толькі як асноўны, але і як дадатковы прадмет. Але хіба магло гэта паўплываць на людзей, якія ведалі свае карані і шанавалі Радзіму?

## ЦІКАВЫ ФАКТ

У 1930-я гады ў Заходняй Беларусі быў уведзены пачатковы ўсенавуч. У той час на Нясвіжчыне налічвалася 14 пачатковых 4-класных і 7-класных школ. У асноўным яны размяшчаліся ў прыстасаваных прыватных памяшканнях. У 1932 годзе за народныя сродкі пабудавалі Сноўскую імя Міцкевіча і Ліпскую школы.



**Нясвіжскі замак у міжваенны перыяд, 1920-я гады**



Альбрэхт Антоній Радзівіл на тэрасе Нясвіжскага замка



Марыя Роза Радзівіл з сынамі (злева направа) Лявонам, Альбрэхтам, Каралем і ўнучкай Эльжбетай на тэрасе Нясвіжскага замка

Пасля заключэння Рыжскай дамовы ў сваё разрабаванае радавое гняздо вярнуліся Радзівілы. Гэта быў князь Альбрэхт Антоній Радзівіл. Некаторы час пры ім тут размяшчалася настаўніцкая семінарыя, а асобным навучэнцам ён нават назначыў спецыяльную стыпендыю. Князь дбаў пра аднаўленне былога багацця і вяртанне страчаных скарбаў.

У міжваенны перыяд дзякуючы Альбрэхту Антонію Нясвіжскі замак зноў стаў цэнтрам культурнага жыцця. Менавіта пры ім была завершана работа Баляслава Таўрагінскага над кнігай, прысвечанай гісторыі горада і яго ўладальнікаў. Выданне пабачыла свет у 1937 годзе і да гэтай пары не страціла свайго значэння.

У Нясвіж прыязджалі на гастролі Варшаўскі і Віленскі тэатры.








25 кастрычніка 1926 года ў палацы Радзівілаў адбыўся з'езд «віленскіх кансерватараў» і сустрэча з маршалам Юзэфам Пілсудскім. У 1929 годзе замак наведаў прэзідэнт Польшчы Ігнацы Масціцкі.

Сямнаццатым і апошнім нясвіжскім ардынатам стаў малодшы брат Альбрэхта Леон Уладзіслаў Радзівіл (з пачатку 1939 года). А ў сярэдзіне ліпеня 1939-га польскі сейм прыняў рашэнне аб ліквідацыі ўсіх ардынацый.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі быў уведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэчы Паспалітай. Нясвіж цяпер быў цэнтрам павета, падпарадкаванага Навагрудскаму ваяводству. Акрамя яго, у склад павета, які меў тэрыторыю ў 1 984 км², уваходзілі Нясвіжская, Гарадзейская, Ланская, Сноўская, а таксама Гавязнянская (зараз Стаўбцоўскі раён), Грыцэвіцкая, Заастравецкая, Клецкая і Сіняўская (Клецкі раён) гміны.

У 1920–1930 гады польскія ўлады праводзілі на тэрыторыі Заходняй Беларусі зямельную рэформу, якая ўключала парцэляцыю, ліквідацыю сервітутаў, камасацыю, пасяленне асаднікаў, хутарызацыю. Супраць гэтага выступалі сяляне. У верасні 1929 года ў маёнтках Радзівіла адбылася вялікая забастоўка парабкаў і сезонных рабочых. У ёй прынялі ўдзел каля 300 чалавек. Яны патрабавалі павелічэння заробку і паляпшэння дабрабыту.

**Насельніцтва Нясвіжа ў 1937 годзе:**

**7 586** жыхароў;
3 182 чалавека – каталікі, 1 002 – праваслаўныя,
3 364 – яўрэі, 26 – евангелісты і 12 – магаметане.

**1 072 жылых цагляных і драўляных будынка.**

**Сялянскія гаспадаркі Нясвіжскага павета (да верасня 1939 года):**

**10 147** сялянскіх гаспадарак,
якім належала **56 908 га** зямлі;
586 двароў, якія мелі да 1 га зямлі.
Ад 1 да 2 га зямлі мелі 1 124 двары,
ад 2 да 3 га – 834,
ад 3 да 5 га – 3 563,
ад 5 да 10 га – 3 890;
**8 825 га** займалі памешчыцкія гаспадаркі
(братоў Харцінгі, Чапскага, Абуховіча і інш.);
**8 198 га** займалі гаспадаркі князя Радзівіла
(без маёнткаў у іншых месцах).



З'езд «віленскіх кансерватараў» у Нясвіжскім палацы, 1926 год

# ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ. УЗ'ЯДНАННЕ

*Калі праносіўся над хатай*
*З чырвонай зоркай самалёт,*
*Выходзіў парабак, араты,*
*Глядзеў з надзеяй на Усход.*
*Ішлі байцы праз лес палямі,*
*Грымела танкаў чарада.*
*Навекі ўцяклі з панамі*
*Прымус, нядоля і бяда.*
*Паўлюк Прануза*

У верасні 1939 года пачалася Другая сусветная вайна. 1 верасня гітлераўцы напалі на Польшчу, а 3 верасня Англія і Францыя аб'явілі вайну Германіі. У сярэдзіне месяца немцы ўжо падышлі да зямель Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Калі тэрыторыя карэннай Польшчы была занята войскамі Гітлера, урад СССР прыняў рашэнне ўзяць пад ахову жыццё і маёмасць насельнікаў сваіх былых тэрыторый. 17 верасня злучэнні Чырвонай Арміі прыступілі да вызвалення Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

У Нясвіж вайсковыя часці ўступілі а 4-й гадзіне раніцы, у м. Сноў – а 10-й. Іх цёпла вітала насельніцтва, на вачах у людзей былі слёзы радасці. 21 верасня ў Снове адбыўся мнагалюдны сход з удзелам жыхароў суседніх вёсак. На ім быў сфарміраваны народны орган улады – валасны Савет на чале з Сяргеем Курылам. У першыя дні вызвалення была таксама створана Часовая ўправа г. Нясвіжа і Нясвіжскага павета. Яе старшынёй стаў Мікалай Сіротка.

Новаўведзеныя мясцовыя ўпраўленні і сялянскія камітэты бралі на ўлік дзяржаўную маёмасць, займаліся падзелам памешчыцкай зямлі. У складзе адной з камісій, якія ў той час пабывалі ў Нясвіжы, знаходзіўся вядомы савецкі пісьменнік Валянцін Катаеў. У яго кнізе «Амаль дзённік» ёсць нататкі пра гэты час.

28–30 кастрычніка на Народным сходзе ў Беластоку нясвіжскія дэлегаты ў ліку іншых 926 пасланнікаў заходніх зямель прагаласавалі за ўваход Заходняй Беларусі ў склад БССР.

15 студзеня 1940 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у складзе Баранавіцкай вобласці быў створаны Нясвіжскі раён.

Пачыналася зусім другое жыццё: стваралiся калгасы, адраджалася прамысловасць, адкрываліся беларускамоўныя школы, мяняўся стан медыцынскага абслугоўвання, чыстай крыніцай біла культурнае жыццё. Але ўсё гэта стала толькі кароткай перадышкай перад новай жудаснай навалай...





# УСТАВАЙ, КРАІНА! НА СМЯРОТНЫ БОЙ...

22 чэрвеня 1941 года – дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Нясвіж быў акупаваны ўжо ў канцы чэрвеня. Дакументальных архіваў пра першыя дні змаганняў і першыя ахвяры не захавалася, а мясцовыя старажылы сцвярджаюць, што ўпартых баёў за горад амаль не было.

Адзіная смяротная бойка адбылася 25 чэрвеня на развілцы дзвюх дарог – на Гарадзею і Сноў. Салдаты Чырвонай Арміі, замацаваўшыся на ўзвышшы (сёння гэта тэрыторыя паміж 4-й школай і швейнай фабрыкай), трымалі абарону. Аднак сілы былі няроўныя, хоць абаронцы горада стаялі да апошняга. Пасля бою ўся гэта мясцовасць была пакрыта ўзгоркамі: немцы загадалі мясцовым жыхарам пахаваць загінуўшых чырвонаармейцаў. Пасля вайны былі знойдзены парэшткі 19 герояў, імёны 6 з іх удалося ўстанавіць. Астанкі былі перапахаваныя ў брацкую магілу ў Замкавым парку.

Палонных вывезлі ва ўрочышча Глінішча (раён стадыёна) і расстралялі. Усяго з 1941 па 1944 год тут было знішчана больш за 3 тыс. ваеннапалонных і мірных жыхароў.

З першых дзён акупацыі немцы і іх саўдзельнікі пачалі наводзіць «новы парадак» фашысцкага кшталту. Яны выкаранялі беларускую культуру, мастацтва, навуку, гналі на працу ў Нямеччыну савецкіх грамадзян, рабавалі мірнае насельніцтва, знішчалі вёскі і хутары.

Нязгодных, савецкіх актывістаў ды і простых людзей забівалі і катавалі. 23 кастрычніка 1941 года ў гарадскім парку Нясвіжа быў арганізаваны масавы




**Помнік на месцы масавага расстрэлу ў гарадскім парку г. Нясвіжа**

расстрэл: знішчана 1,5 тыс. мужчын, жанчын, дзяцей. Другі масавы расстрэл праходзіў за 1 км ад райцэнтра па дарозе на Сноў. Там былі пазбаўлены жыцця 1,2 тыс. чалавек.

Генацыду падверглася яўрэйскае насельніцтва Нясвіжскага раёна. 27 ліпеня 1941 года мясцовай паліцыяй і жандармерыяй у горадзе былі падпалены дамы, дзе жылі мірныя грамадзяне, так званае гета. Падчас пажару людзі, якім удалося выбрацца, расстрэльваліся на месцы. Было знішчана 700 чалавек. Расправіліся з гета і ў Гарадзеі. Раён пражывання яўрэяў ачапілі, насельніцтва сагналі на плошчу (для гэтага з вобшукам прайшліся па ўсіх дамах).

Вось як успамінае пра гэтыя падзеі відавочца Алена Бежанцава: «Усіх паклалі на зямлю тварам уніз, тых, хто імкнуўся падняць галаву, жорстка збівалі. Асоб, якія выказвалі пратэст, расстрэльвалі на месцы. Дзяцей у большасці забівалі палкамі. Пасля доўгіх здзекаў насельніцтва сталі грузіць на машыны. Машыны хадзілі па ляжачых на зямлі людзях, пасля гэтага іх вывозілі за мястэчка, дзе ў прыгатаваным рове расстрэльвалі з кулямётаў. Відавочцы, якія хадзілі закапваць роў, гаварылі, што зямля некалькі сутак варушылася, таму што многіх закапалі жывымі. На наступную ноч пасля расстрэлу з рова смерці ўдалося выбрацца адной жанчыне». Яе імя невядома. Было гэта 17 ліпеня 1942 года.

А 21 ліпеня 1942 года адбылося першае на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў гады Вялікай Айчыннай вайны паўстанне яўрэяў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яго жорстка падавілі. Загінула 800 чалавек.

5 жніўня 1942 года ў Малеўскім лесе (ур. Гайкі) фашысты расстралялі 73 чалавек польскай нацыянальнасці, у тым ліку жанчын і святароў. У ліпені 1943 года былі забітыя 300 жыхароў в. Сноў. Знішчылі гітлераўцы і цыганскі табар у Мяшчанскім лесе.

Зверствы фашыстаў не спыняліся ні на дзень. Але народ аказваў акупантам моцнае супраціўленне. Ужо ў канцы 1941 года ў Нясвіжскім раёне з вайскоўцаў, якія апынуліся на захопленай ворагам тэрыторыі, быў створаны першы партызанскі атрад у зоне вёсак Астроўкі і Макашы. Кіраваў ім Ж. Шэйнрок, пасля яго гібелі – М. Громаў (таксама загінуў, атрад стаў насіць яго імя).

У раёне дзейнічала група М. Каклюгіна, на базе якой у кастрычніку 1943 года быў створаны атрад імя М. Кутузава ў складзе 300-й брыгады імя К. Варашылава. На чыгунцы Стоўбцы – Гарадзея – Баранавічы праводзіў дыверсіі партызанскі атрад імя Н. Воранава брыгады Г. Жукава. Актыўна дзейнічалі падрыўнікі атрада імя М. Шчорса 27-й брыгады імя В. Чапаева.

Помнік на месцы Нясвіжскага гета








Да восені 1942 года на Нясвіжчыне зарадзіўся польскі рух супраціўлення акупантам пад умоўнымі назвамі «Стражніца» і «Вахмістр».

На тэрыторыі раёна дзейнічалі падпольныя райкамы Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі і Камуністычнай партыі Беларусі, якія словам і справай змагаліся супраць фашысцкіх акупантаў.

Нясвіжскі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў войскамі 1-га Беларускага фронту падчас жорсткіх баёў, якія адбываліся з 29 чэрвеня па 27 ліпеня 1944 года. Баявыя дзеянні вялі войскі 65-й, 48-й, 28-й армій, 4-га гвардзейскага кавалерыйскага і 1-га механізаванага корпуса коннамеханізаванай групы фронту.

Нясвіж быў вызвалены 2 ліпеня 1944 года часцямі 193-й стралковай дывізіі 65-й арміі ва ўзаемадзеянні з партызанскай брыгадай № 27 імя В. Чапаева. У той жа дзень Чырвоная Армія ўвайшла ў Гарадзею.

Дзень Перамогі людзі чакалі як ратунак, мільёны беларусаў зрабілі свой унёсак у тое, каб ён надышоў як мага хутчэй. Сёння памяць аб гадах вайны, яе ахвярах і героях увасабляецца ў творах пісьменнікаў, кампазітараў і сцэнарыстаў. Нагадваюць аб бязлітасных баях і археалагічныя раскопкі. Напрыклад, у 2018 годзе ў раёне вуліцы Савецкай г. Нясвіжа спецыялізаваным пошукавым падраздзяленнем вайсковай часці 28443 пад кіраўніцтвам камандзіра спецыялізаванага пошукавага ўзвода старшага лейтэнанта А. Куцука былі праведзены раскопкі і знойдзены астанкі 1 067 чалавек, з якіх 32 былі вайскоўцамі Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і 1 035 – мірнымі жыхарамі, якія загінулі восенню 1941-га.

Былі атрыманыя і спадарожныя знаходкі: асабістыя апазнавальныя медальёны вайскоўцаў і прадметы бытавога ўжытку мірных грамадзян. Адшукалі сярод артэфактаў і цікавыя манеты з выявай імператара ўсерасійскага Мікалая II наміналам пяць рублёў: тры – 1898 года, адна – 1897-га. Зараз яны знаходзяцца ў Нясвіжскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Астатнія прадметы часткова перададзены ў ваенны камісарыят Нясвіжскага і Капыльскага раёнаў, часткова – у музей, дзе іх могуць пабачыць жыхары і госці горада. Гэтыя знаходкі – захавальнікі памяці аб барацьбе людзей за Радзіму, іх укладзе ў далейшае стваральнае жыццё, якое прынесла сапраўдны росквіт беларускаму народу.

Помнік ахвярам Гарадзейскага гета



# У ЖЫЦЦІ НЯСВІЖЧЫНЫ ПАКІНУЛІ СВОЙ СЛЕД… ГАНАРОВЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ Г. НЯСВІЖА

- **Мікалай Лешчанка** (1975)
- **Алена Сцепановіч** (2002)
- **Дзмітрый Хмель** (2002)
- **Кім Сінічкін** (2002)
- **Марыя Худая** (2002)
- **Мікалай Герман** (2002)
- **Міхаіл Карвіга** (2002)
- **Міхаіл Карчміт** (2002)
- **Міхаіл Саленік** (2002)
- **Рыгор Каласоўскі** (2002)
- **Рыгор Лазар** (2002)
- **Уладзімір Гуль** (2002)
- **Уладзімір Дражын** (2002)
- **Якаў Аляксанкін** (2002)
- **Іван Мурын** (2006)
- **Леанід Крупец** (2006)
- **Міхаіл Фінберг** (2006)
- **Павел Прануза** (2006)
- **Яўген Ждан** (2007)
- **Валерый Мароз** (2008)
- **Рамуальд Клім** (2008)
- **Мікалай Радаман** (2013)
- **Мікалай Шымко** (2013)
- **Міхаіл Крыштаповіч** (2013)
- **Станіслава Вятр-Партыка** (2013)
- **Аляксандр Максімовіч** (2014)
- **Казімір Шкраба** (2014)
- **Рыгор Халецкі** (2014)
- **Анатоль Бутэвіч** (2015)
- **Мікалай Салавей** (2015)
- **Міхаіл Мясніковіч** (2015)
- **Ігар Богуш** (2020)





# ЯНЫ КІРАВАЛІ РАЁНАМ

## Першыя сакратары Нясвіжскага раённага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі

- **Васіль Перуноў** (1944–1946)
- **Гаўрыіл Дзянісаў** (1946–1951)
- **Георгій Ядроў** (1951–1952)
- **Віктар Юдзін** (1952–1958)
- **Анатоль Фаміч** (1958–1961)
- **Аляксей Міхалевіч** (1961–1964)
- **Кім Сінічкін** (1964–1976)
- **Мяфодзій Бандарчык** (1976–1981)
- **Анатоль Бычак** (1981–1983)
- **Марыя Худая** (1983–1988)
- **Уладзімір Дражын** (1988–1991)

## Старшыні Нясвіжскага раённага выканаўчага камітэта

- **Аляксандр Самойленка** (1944–1945)
- **Іван Фаменка** (1945–1947)
- **Рафаіл Сяржант** (1947–1950)
- **Міхаіл Спярански** (1950–1952)
- **Фёдар Кашпур** (1952–1959)
- **Георгій Фядотаў** (1959–1963)
- **Барыс Сасноўскі** (1963–1964)
- **Мікалай Кузьмянкоў** (1964–1969)
- **Уладзімір Пархімчык** (1969–1970)
- **Уладзімір Еўсючэня** (1970–1976)
- **Анатоль Бычак** (1976–1981)
- **Марыя Худая** (1981–1983)
- **Мікалай Жук** (1983–1991)
- **Уладзімір Дражын** (1991–1998)
- **Леанід Крупец** (1998–2002)
- **Фёдар Прывалаў** (2002–2006)
- **Ігар Макар** (2006–2010)
- **Іван Крупко** (2010–2018)
- **Генадзь Салавей** (2018)
- **Аляксандр Ломскі** (з 2019 года па цяперашні час)




# СУЧАСНАСЦЬ

# РОДНЫ КРАЙ – ПРЫГОЖЫ, ДЗІЎНЫ...

## Асноўныя характарыстыкі раёна:

- Нясвіжскі раён створаны **15 СТУДЗЕНЯ 1940 ГОДА**. Ён размешчаны на паўднёвым захадзе Мінскай вобласці, цэнтр – г. Нясвіж. Агульная плошча раёна – **863 км²**. Працягласць з поўначы на поўдзень складае **25 км**, з захаду на ўсход – **38 км**.

- Мяжуе з Карэліцкім раёнам Гродзенскай вобласці; з Баранавіцкім і Ляхавіцкім – Брэсцкай; з Клецкім, Капыльскім, Стаўбцоўскім – Мінскай.

- **ЛЕСАМ** занята прыкладна **12,6 %** тэрыторыі раёна, **БАЛОТАМ – 0,6 %**. Для **СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА** выкарыстання прыгодныя **74,8 %** зямлі.

- Па тэрыторыі раёна працякаюць рэкі Уша, Сноўка, Тур'я (басейн Нёмана), Лань і Цэпра (басейн Прыпяці).

- Раён добра ўзаемадзейнічае з іншымі рэгіёнамі Беларусі і замежжам. Па тэрыторыі Нясвіжчыны праходзіць электрыфікаваная чыгунка і аўтамагістраль **БРЭСТ – МІНСК – МЯЖА РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ**. Аўтамабільныя дарогі злучаюць Нясвіж з цэнтрамі суседніх раёнаў.

- На Нясвіжчыне пражывае больш за **38 ТЫС. ЧАЛАВЕК**, сярод якіх сустракаюцца прадстаўнікі **37 НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ І НАРОДНАСЦЕЙ**. Больш паловы жыхароў – эканамічна занятыя.

- Раён прадстаўлены г. Нясвіжам, г. п. Гарадзея, 114 населенымі пунктамі сельскага тыпу, пасялковым саветам (Гарадзейскім) і 7 сельскімі саветамі: Гарадзейскім, Казлоўскім, Ланскім, Ліпскім, Нясвіжскім, Сейлавіцкім, Сноўскім.



Нясвіж і Нясвіжскі раён сёння – гэта развітыя прамысловасць і сельская гаспадарка, моцныя будаўнічы патэнцыял, сацыяльная сфера. Гэта высокая культура і вялікая адказнасць за ўсё, што адбываецца на роднай зямлі.

**ЗА ДАСЯГНЕННЕ ВЫСОКІХ ВЫНІКАЎ У 2015, 2020 і 2022 ГАДАХ У СФЕРЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ НЯСВІЖСКІ РАЁН БЫЎ ЗАНЕСЕНЫ НА РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ДОШКУ ГОНАРУ.**

# Славутасці Нясвіжа

**Палацавы ансамбль роду Радзівілаў**. Фарміраваўся на працягу некалькіх вякоў: з канца XVI да канца XIX стагоддзя. Асноўныя будаўнічыя работы прыпадаюць на мяжу XVI–XVII і сярэдзіну XVIII стагоддзя. Як вынік, у архітэктуры помніка прысутнічаюць рысы розных стыляў: рэнесансу, барока, класіцызму, неаготыкі. Гэта манументальнае збудаванне з вежамі рознай велічыні і вышыні, акружанае ровам з вадой і цудоўнымі паркамі.

**Нясвіжская ратуша і гандлёвыя рады**. Датуюцца XVI–XVIII стагоддзямі. З трох бакоў да ратушы прымыкаюць гандлёвыя рады – крытыя галерэі з арачнымі праходамі. Сёння комплекс – адна з візітных картак Нясвіжа.

**Фарны касцёл Божага Цела**. Узведзены ў канцы XVI стагоддзя італьянскім архітэктарам Джавані Бернардоні. Касцёл выкананы ў стылі ранняга барока і прадстаўляе сабой трохнефную купальную базіліку з адной апсідай. У сутарэннях каталіцкага храма размешчана пахавальня роду Радзівілаў.

**Слуцкая брама.** Узведзена ў XVI стагоддзі як частка гарадскіх абарончых умацаванняў. У XVIII стагоддзі перабудавана ў стылі барока і ў такім выглядзе захавалася да нашага часу. З пяці гарадскіх брам, праз якія некалі можна было трапіць у Нясвіж, ацалела толькі яна адна – двух’ярусная пабудова з арачным праходам.
















**Помнік Сымону Буднаму**. Адкрыты ў 1982 годзе. У 1562 годзе Сымон Будны выдаў у Нясвіжы першыя друкаваныя беларускамоўныя кнігі на тэрыторыі сучаснай Беларусі: «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам».

**Замкавая вежа**. Была часткай гарадскіх абарончых умацаванняў. Архітэктурны стыль – эклектыка, якая спалучае ў сабе рысы готыкі і рэнесансу.

**Кляштар бенедыкцінак.** Пабудаваны Радзівіламі ў 1596 годзе. Дзейнічаў да 1877 года. Цяпер ад яго захаваліся толькі брамы, вежа з купалам і шпілем, рэшткі земляных валоў. Ва ўцалелых памяшканнях кляштара знаходзіцца Нясвіжскі дзяржаўны каледж імя Якуба Коласа.

**Дом рамесніка (Дом на рынку)**. Адзін з нямногіх узораў жылой пабудовы пачатку XVIII стагоддзя, які можна ўбачыць і ў нашыя дні. Першы паверх – каменны, другі – драўляны, з вузкімі пакоямі. У доме захавалася сапраўдная ляпніна і дэкаратыўныя ліштвы.





## Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж»

Сёння музей-запаведнік – гэта складаны і эфектыўны комплекс, у які ўваходзяць помнікі гісторыі і культуры, што вызначаюць аблічча Нясвіжа. Галоўнымі яго аб'ектамі, што прыцягваюць найбольшую ўвагу турыстаў, з'яўляюцца палацавы ансамбль роду Радзівілаў, гарадская ратуша, Слуцкая брама. Палацавы ансамбль – частка аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Архітэктурны, жылы і культурны комплекс роду Радзівілаў», у які таксама ўваходзяць прылеглыя да яго паркі і касцёл Божага Цела з фамільнай крыптай.

Агульная плошча тэрыторыі ўсіх аб'ектаў музея-запаведніка складае 8,4 га, дзе палацавы ансамбль займае 0,8 га (з агульнай плошчай памяшканняў 7 880 м$^2$, у тым ліку экспазіцыйных – 3 035 м$^2$).

Актыўная работа комплексу пачалася пасля рэстаўрацыі палацавага ансамбля: 20 ліпеня 2012 года ўсе інтэр'еры адкрыліся для наведвальнікаў. Праект музея ўключаў абсталяванне 30 экспазіцыйных залаў і фондаў, у якіх захоўваецца звыш 28 тыс. прадметаў. Штогод архітэктурны, жылы і культурны комплекс роду Радзівілаў у Нясвіжы наведваюць каля 400 тыс. турыстаў.

Супрацоўнікамі ўстановы распрацаваны шырокі спектр разнастайных музейных праграм: звыш 10 экскурсійных маршрутаў па экспазіцыях палацавага ансамбля і ратушы, славутасцях горада і парках; экскурсіі-анімацыі, інтэрактыўныя праекты, тэатралізаваныя гістарычныя квэсты, адукацыйныя праграмы і інш.

Акрамя ўключэння ў 2005 годзе ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, у 2016 годзе калектыў установы быў адзначаны прэстыжнай еўрапейскай узнагародай – прэміяй Europa Nostra ў катэгорыі «Адданая служба».

Па выніках работы ў 2018 годзе Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару.











Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падчас урачыстага адкрыцця рэканструяванага палацавага комплексу ў Нясвіжы пакінуў у кнізе ганаровых гасцей першы запіс, 20 ліпеня 2012 года



Дарагія сябры!

Багатая культурная і гістарычная спадчына Беларусі выклікае пачуццё гонару ў кожнага яе жыхара. Адным з унікальных помнікаў архітэктуры з'яўляецца палацава-паркавы ансамбль у г. Нясвіжы, які ўключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Велічныя і магутныя формы палаца сведчаць аб выбітным таленце нашых продкаў. Не аднойчы аднаўляўся ён пасля войнаў, пажараў і перыядаў занядбання.

Дзякуючы працы рэстаўратараў, будаўнікоў і спецыялістаў музейнай справы сёння мы бачым Нясвіжскі палац ва ўсёй яго прыгажосці.

Няхай і надалей гэты цудоўны твор айчыннага дойлідства застаецца ўвасабленнем культурнага багацця Беларусі, сімвалам несмяротных стваральных сіл і здольнасцей нашага народа.

Жадаю вам поспехаў і новых здзяйсненняў у пачэснай справе даследавання і папулярызацыі слаўных старонак мінулага Радзімы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь

А. Лукашэнка



# Эканоміка – аснова дабрабыту

Нясвіжскі раён дынамічна развіваецца, па многіх паказчыках пераўзыходзячы іншыя рэгіёны краіны. Гэта вынік зладжанай работы ўсяго народагаспадарчага комплексу, якая грунтуецца на ўкараненні перадавых тэхналогій, мадэрнізацыі вытворчасці, рацыянальным выкарыстанні існуючых рэсурсаў.

Прамысловасць раёна складаецца з **10 прадпрыемстваў**, на якіх занята прыкладна **3,7 тыс. чалавек**.

На другім месцы – хімічная вытворчасць. Яна прадстаўлена прадпрыемствамі фармацэўтычнай галіны: сумесным прадпрыемствам (СП) адкрытае акцыянернае таварыства (ААТ) «Фармлэнд», ААТ «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў», замежным унітарным прадпрыемствам «Мед-інтэрпласт».

ААТ «ГАРАДЗЕЙСКІ ЦУКРОВЫ КАМБІНАТ» – таксама ў тройцы буйных прадпрыемстваў раёна. На камбінаце вырабляюцца цукар, патака, бураковыя сушаныя жамерыны, а таксама ажыццяўляюцца перапрацоўка і кансерваванне фруктаў і гародніны.

Больш за 40 % у агульным аб'ёме вытворчасці належыць таварыству з абмежаванай адказнасцю (ТАА) «Нясвіжскі завод дзіцячага харчавання», асноўным відам дзейнасці якога з'яўляецца перапрацоўка і выпуск малака, малочных і кісламалочных прадуктаў.

Свой уклад у эканоміку раёна ўносяць закрытае акцыянернае таварыства (ЗАТ) «Аблрапсгрäсэрвіс» (вытворчасць алею), сумеснае закрытае акцыянернае таварыства (СЗАТ) «Еўратарэкс» (вытворчасць поліпрапіленавых тканых мяхоў), унітарнае прадпрыемства (УП) «Нясвіжская ЖКГ» (вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі, пары і гарачай вады), філіял «Нясвіжскі хлебазавод» ААТ «Барысаўхлебпрам» (вытворчасць хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў).

Найлепшыя вынікі там, дзе, абапіраючыся на сучасныя тэхналогіі і мадэрнізацыю працэсаў, чалавек здолеў стварыць эфектыўную вытворчасць, якая дазваляе выпускаць высакаякасную канкурэнтаздольную прадукцыю. Як вынік – узрастае прадукцыйнасць працы, знаходзяцца новыя рынкі збыту. Гэта ў поўнай ступені адносіцца да ўсіх адзначаных вышэй прадпрыемстваў.











Раён спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, гадоўлі свіней, вырошчванні зерневых, цукровых буракоў. У сельскагаспадарчых арганізацыях Нясвіжчыны налічваецца 39 малочнатаварных ферм (МТФ), 2 комплексы па вырошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы, 2 свінакомплексы, ферма па вырошчванні куранят-бройлераў.

> Нясвіжскі раён з'яўляецца адным з буйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі Міншчыны. Пры тым, што займае 3,7 % плошчы вобласці, яго доля ў вытворчасці сельгаспрадукцыі складае больш за 7 %.

У аграрным сектары занята 5,2 тыс. чалавек – трэцяя частка ад усяго працаздольнага насельніцтва раёна, штогод выпрабляецца прадукцыі амаль на 325 млн рублёў.

Нездарма Нясвіж стаў першым горадам у Мінскай вобласці, дзе ў 1998 годзе быў праведзены рэспубліканскі кірмаш-свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі».





# Для зручнасці і камфорту

У раёне шмат робіцца для стварэння камфортных умоў для пражывання насельніцтва як у горадзе, так і ў вёсцы. Высокімі тэмпамі вядзецца жыллёвае будаўніцтва, у тым ліку з дзяржаўнай падтрымкай.

Адным з галоўных сацыяльных аб’ектаў у 2022 годзе стала ўзвядзенне ў райцэнтры новага будынку паліклінікі Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы (ЦРБ). Прыблізны кошт аб’екта склаў каля 29 млн рублёў. Вясковых жыхароў, у якіх няма стацыянарных кропак гандлю, абслугоўваюць аўталаўкі і аўтамагазіны.

Вабяць прыгажосцю і адмысловым асартыментам аб’екты рознічнага гандлю Нясвіжчыны. Іх у раёне 468 з агульнай гандлёвай плошчай прыкладна 26 тыс. м$^2$.

Развіваюцца сфера паслуг, энергетыка, транспартная сетка, сувязь. Адным словам, робіцца ўсё, каб жыхары раёна карысталіся ўсімі дабротамі цывілізацыі, адчувалі клопат пра сябе.







**Старшыня Нясвіжскага раённага выканаўчага камітэта Аляксандр Ломскі і яго першы намеснік Міхаіл Афанасік падчас суботніка займаюцца добраўпарадкаваннем новай паліклінікі**





# Архітэктурная спадчына і сталіца культурнага жыцця Беларусі

Сярод іншых беларускіх населеных пунктаў Нясвіж выдзяляецца сваёй архітэктурай. Быццам сапраўдны партал у мінулае, горад дыхае рамантыкай рыцарскіх легенд і вабіць сваёй прыгажосцю: кожная вуліца тут захоўвае памяць аб славутай гісторыі гэтых месцаў, а некаторыя будынкі датуюцца нават XVI стагоддзем.

Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс – візітная картка горада і ўсёй Беларусі – разам з мясцовым Фарным касцёлам з’яўляецца часткай Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. **41 аб’ект**, размешчаны на тэрыторыі раёна, у тым ліку **18 – у самім Нясвіжы**, занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Найбольш значныя з іх: комплекс былога кляштара езуітаў з касцёлам Божага Цела, былы заезны дом, гарадская ратуша з гандлёвымі радамі, комплекс былога кляштара бенедыкцінак і інш.

Зберагаюць гісторыю горада не толькі сцены тутэйшых пабудоў, але і людзі: **30 часовых экспазіцый** (выстаў) арганізаваны ў Нясвіжскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Нядзіўна, што Нясвіж такі вядомы сярод турыстаў: штогод сюды **наведваецца да 400 тыс. гасцей**.

Акрамя таго, прыгожы, утульны, з асаблівай гістарычнай аўрай горад становіцца месцам правядзення фестываляў, канцэртаў, выстаў, адраджаючы былую славу гэтых мясцін і падкрэсліваючы сваю значнасць у культурным жыцці краіны.

Традыцыйнымі сталі фестывалі «Музы Нясвіжа» з Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам Беларусі імя Міхаіла Фінберга, «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў», «Вяртанне да тэатральных вытокаў», арыгінальны фестываль гістарычнай рэканструкцый «Нясвіжская фартэцыя» і многія іншыя цікавыя мерапрыемствы.

Старажытны і вечна малады Нясвіж працягвае сваю гісторыю і ўпэўнена крочыць у будучыню, абапіраючыся на духоўныя каштоўнасці, а таксама стварае надзейны матэрыяльны падмурак для свайго дабрабыту.





# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА. ПРАЦАВІТЫМІ РУКАМІ ЧАЛАВЕКА...

## Гістарычны ракурс

Першыя саўгасы і калгасы на Нясвіжчыне пачалі з'яўляцца пасля далучэння тэрыторыі раёна да БССР. Аднак Вялікая Айчынная вайна спыніла гэты працэс.

Пасля вызвалення Нясвіжчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адразу стала аднаўляцца народная гаспадарка. У ліку першых – тры калгасы і машынна-трактарная станцыя (МТС, цяпер – **ААТ «Нясвіжскі райаграсэрвіс»**), створаная 14 мая 1940 года. У сваім распараджэнні МТС мела толькі канюшню, гумно і панскі дом. Акрамя рамонту і абслугоўвання сельскагаспадарчай тэхнікі, на ёй рыхтавалі спецыялістаў для працы на гэтай жа МТС. У 1945 годзе адбыўся першы выпуск трактарыстаў, сярод іх былі тры дзяўчыны.

Паступова невялікая машынна-трактарная станцыя ператварылася ў буйное рамонтнае прадпрыемства, якое аказвала паслугі калгасам і саўгасам у рамонце тэхнікі, механізацыі працаёмкіх працэсаў, вывазцы ўгнаенняў, забяспечвала машынамі, запчасткамі, мінеральнымі і вапнавымі ўгнаеннямі.

Вялікі ўклад у развіццё прадпрыемства ўнёс Рыгор Лазар, які ўзначаліў яго ў 1959 годзе і на працягу 28 гадоў быў тут кіраўніком. Дзякуючы мэтанакіраванасці і настойлівасці Рыгора Лазара будаваліся вытворчыя памяшканні і жыллё для работнікаў, набывалася тэхніка, асвойваліся новыя напрамкі дзейнасці. За поспехі, дасягнутыя ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці, 26 студзеня 1971 года прадпрыемства ўдастоена ордэна Леніна. Шмат перадавікоў таксама адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.



Работнікі машынна-трактарнай станцыі



У 1944 годзе аднавіла сваю работу і Ганусаўская палялводчая доследная станцыя, якая была створана яшчэ ў студзені 1928 года. У розны час яе супрацоўнікі займаліся зерневымі, кармавымі культурамі, буракамі, бульбай. У 1945 годзе ўстанова нават была ператворана ў доследную станцыю па бульбе. Аднак з 1947 года гэта тэма паступова перастала быць актуальнай і ў кола даследаванняў увайшлі пытанні сістэмы ўгнаенняў у севазвароце, агратэхнікі фасолі, грачыхі, ільну, тытуню, кукурузы, шматгадовых траў. У гэты ж перыяд праводзіліся і першыя палявыя доследы з цукровымі буракамі.

У сувязі з будаўніцтвам у рэспубліцы цукровых заводаў і развіццём фабрычнага сеяння буракоў у красавіку 1959 года ўстанова ператворана ў Ганусаўскую доследна-селекцыйную станцыю па цукровых бураках. Далей назвы прадпрыемства мяняліся, але сутнасць работы заставалася той жа. У 2006 годзе **рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства (РУП) «Доследная навуковая станцыя па цукровых бураках»** увайшло ў склад «Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве».




Ганусаўская станцыя на райсельгасвыставе, 1953 год





Доследная навуковая станцыя па цукровых бураках

Дарэчы, гэта не адзіная навуковая ўстанова на тэрыторыі раёна. **Дзяржаўная сельскагаспадарчая ўстанова (ДСГУ) «Нясвіжская сортавыпрабавальная станцыя»** была створана ў кастрычніку 1944 года як Нясвіжскі дзяржаўны сортавыпрабавальны ўчастак, які ў 1961 годзе быў пашыраны да 240 га і пачаў дзейнічаць на ўласнай гаспадарчай базе.

Напрацоўкі навукоўцаў адразу знаходзілі прымяненне на палетках мясцовых гаспадарак. Іх да 1951 года было вельмі шмат: амаль у кожнай вёсцы – свой калгас. Арганізаваны яны былі ў асноўным пасля Вялікай Айчыннай вайны. З'явіліся і новыя: «Імя Сталіна», «Імя Чкалава», «Імя Молатава» і інш. Аднавілі работу створаныя яшчэ да вайны «17 Верасня», «Чырвоны бераг».

Працавалі з вялікай самааддачай. За поспехі ў спаборніцтве па сяўбе яравых калгас «17 Верасня» быў занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару, а «Чырвоны бераг» за датэрміновае выкананне плана хлебанарыхтовак – на абласную.

Аднак наяўнасць вялікай колькасці дробных гаспадарак не дазваляла ў поўнай ступені разгарнуць інтэнсіфікацыю вытворчасці – пачаўся працэс іх узбуйнення.

У адну вялікую гаспадарку пад назвай **«17 Верасня»** аб'ядналіся калгасы «Імя Някрасава», «Маяк камунізму», «Камсамолец», «Новы шлях», «Маладая гвардыя», «17 Верасня», «Чырвоны бераг» і «Савецкая Беларусь». Агульная плошча аб'яднання склала 5 га. Асаблівых поспехаў яно дабілася ў вытворчасці льну. Паступова калгас ператварыўся ў буйное сельскагаспадарчае прадпрыемства мяса-малочнага напрамку з вырошчваннем нецелей для гаспадарак раёна і вобласці, з развітай вытворчасцю зерня і цукровых буракоў.

У 1948 годзе пачалася гісторыя **ААТ «Лань-Нясвіж»**. 17 жніўня адбыўся арганізацыйны сход, і на падставе 50 заяў ад жыхароў в. Лань утварылі калгас «Ленінскі шлях». Крыху пазней астатнія вёскі Ланскага сельсавета таксама ўключыліся ў арганізацыю калектыўных гаспадарак: калгас «Імя Сталіна» ўтварыўся ў в. Чанавічы, «Прагрэс» – у Кіркаўшчыне, «Октябрь» – у Асмолава. У 1951 годзе ўсе гэтыя гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас пад назвай «Ленінскі шлях» з цэнтрам у в. Лань.










З 1949 года вядзецца летапіс развіцця **адкрытага акцыянернага таварыства «Грыцкевічы»**. Тады на тэрыторыі Нялепаўскага сельскага савета існавала пяць сельскагаспадарчых арцеляў: «Імя Крупскай», «Імя К. Маркса», «Імя Кірава», «Рассвет» і «Беларусь». Кожнай паасобку даводзілася цяжка, і 17 сакавіка 1951 года яны вырашылі аб'яднацца ў адну буйную гаспадарку – калгас «Беларусь». Жыццё вяскоўцаў перайшло на якасна новы ўзровень. Па дадзеных Інстытута аграрнай эканомікі НАН Беларусі ААТ «Грыцкевічы» (створана ў 2011 годзе) па выніках работы ў 2014 годзе заняла пачэснае 15-е месца сярод 100 лепшых сельгасарганізацый краіны.

У 1949-м у в. Смолічы быў створаны калгас «1 Мая». Праз тры гады ён і калгасы «Суворава» (в. Лявонавічы), «Маладая Гвардыя» (в. Ляхі), «Імя Чкалава» (в. Цякалаўшчына), «Імя Кутузава» (в. Габруны) утварылі адзіную калектыўную гаспадарку «1 Мая». У 1980 годзе яе аб'ядналі з калгасам «Імя Кірава», а ў сакавіку 1996-га рэарганізавана ў калектыўнадолевае прадпрыемства. З 2004 года гэта закрытае акцыянернае таварыства.

1951 год лічыцца годам нараджэння сапраўды легендарнага **агракамбіната «Сноў»**. Ён узнік на базе шасці невялікіх гаспадарак пад назвай «Імя Калініна». Узначаліў яго ветурач Якаў Аляксанкін, які зрабіў стаўку на льнаводства. Хутка гаспадарка стала вядомай на ўвесь Савецкі Саюз. У 70-я гады мінулага стагоддзя пры ёй пабудавалі пасёлак, умовы жыцця ў якім былі набліжаны да гарадскіх. У 1975 годзе п. Сноў быў аднесены да ліку лепшых сельскіх забудоў СССР.

З 1977 года спецыялізацыя гаспадаркі змянілася: быў узяты накірунак на павелічэнне вытворчасці збожжа, цукровых буракоў, малака і мяса, а пазней і мяса птушкі. У 1981 годзе калгас «Імя Калініна» атрымаў ордэн Дружбы народаў, а ў 1984 годзе Якаў Аляксанкін – званне Героя Сацыялістычнай працы.



Міхаіл Карчміт

У 1988 годзе кіраўніком калгаса стаў Міхаіл Карчміт. Ён асаблівую ўвагу надаў укараненню прагрэсіўных тэхналогій ва ўсіх галінах вытворчасці, набыццю сучаснай тэхнікі і абсталявання. У 1990-я гады тут арганізоўваўся закончаны цыкл: ад вытворчасці прадукцыі да яе перапрацоўкі і рэалізацыі праз сетку фірменнага гандлю.

У 2001 годзе Міхаілу Карчміту (аднаму з першых у краіне) было прысвоена званне Героя Беларусі.

З 2002 года гаспадарка стала называцца сельскагаспадарчым вытворчым кааператывам (СВК) «Агракамбінат «Сноў». Праз два гады яго ўзначаліў Мікалай Радаман, пад кіраўніцтвам якога прадпрыемства ўпэўнена трымае планку, высока ўзнятую раней.

Шляхам аб'яднання дробных калектыўных гаспадарак вёсак Аношкі, Жанкавічы, Долкінды ў 1951 годзе ўтварыўся калгас «Новае жыццё». Пасля далучэння да яго калгаса «Дружба» на базе аб'яднання было створана **адкрытае акцыянернае таварыства «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ»**.

Падобным чынам узнікла і ААТ «Нясвіжскія Астроўкі». Гаспадарка з'явілася ў 1952 годзе шляхам аб'яднання дробных калгасаў «Імя Сталіна», «Імя Леніна», «Імя Кірава», «Імя Калініна», «Імя Матросава», «Чырвоная Зорка» ў адзін калгас «Імя Малянкова». Затым аб'яднанне насіла імя Дзяржынскага, а ў 2003-м стала **СВК «Нясвіжскія Астроўкі»**. З 2011 года гэта **адкрытае акцыянернае таварыства** з цэнтрам у аг. Астроўкі.

25 лютага 1964 года ў Нясвіжскім раёне з'явіўся саўгас «Буракаводчы», якому наканавана было стаць вядучай навуковай установай па вырошчванні цукровых буракоў. 13 кастрычніка 1994 года ён быў перайменаваны ў Эксперыментальную базу **(ЭБ) «Свеклавічная»**, а тая 1 сакавіка 2001 года – у РУП «ЭБ «Свеклавічная». З 2010 года гэта прадпрыемства – камунальная ўласнасць Нясвіжскага раёна.

Адна з лепшых гаспадарак рэгіёна – **ААТ «Гарадзея»** – утварылася 28 студзеня 1970 года ў выніку далучэння калгаса «Перамога» да саўгаса «Гарадзейскі».

Увогуле 1965–1970 гады былі вельмі паспяховымі для гэтай галіны эканомікі, аб чым сведчыць тое, што ў 1969 годзе па эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці Нясвіжскі раён заняў першае месца ў рэспубліцы. Чысты прыбытак калгасаў у 1970 годзе складаў 5 млн рублёў. Лепшых паказчыкаў дасягнулі калгасы «Імя Калініна», «Радзіма», «1 Мая», «Ленінскі шлях».

У 1978 годзе адбылося аб'яднанне калгасаў «Слава» і «Зара» ў калгас «Слава», які пазней быў перайменаваны ў калектыўна-долевую гаспадарку «Слава» (1996 год), затым у сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Юшавічы» (2003 год), а з 2010 года стаў **адкрытым акцыянерным таварыствам «Юшавічы»**.






**Усесаюзны семінар па селекцыі цукровых буракоў. Высадкі гібрыда «Ганусаўскі 8»**

А самая маладая гаспадарка – **ААТ «Сейлавічы»** – створана 10 лютага 2011 года. Да гэтага з 1951 па 1962 год гэта быў калгас «Імя Андрэева»; з 1962 па 2003 год – калгас «Рассвет»; з 2003 па 2011 год – СВК «Сейлавічы».

Дзякуючы рэалізацыі праграм у раслінаводстве («Зерне», «Бульба», «Цукровыя буракі», «Лён», «Кармы»), у жывёлагадоўлі («Малако», «Свініна», «Ялавічына») Нясвіжскі раён дасягнуў значных поспехаў у сельскай гаспадарцы. У 1987 годзе тут быў атрыманы самы высокі ў Беларусі ўраджай збожжавых і зернебабовых – 53,1 ц/га. У 1989-м ураджайнасць збожжавых склала 48,4 ц/га, бульбы – 240 ц/га, цукровых буракоў – 240 ц/га. Дзяржаве было прададзена 69 тыс. т малака. Гэта былі вынікі, супараўнальныя з паказчыкамі краін Заходняй Еўропы.

Таму не дзіўна, што ў 1989 годзе раён заняў першае месца ў рэспубліцы па эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці.





# Дзень сённяшні

За апошнія 10 гадоў вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў раёне ўзрасла амаль на трэць. Стратэгіяй развіцця Нясвіжскага раёна ў адпаведнай галіне выбрана малочная жывёлагадоўля. Распрацавана аптымальная структура пасяўных плошчаў сельскагаспадарчых культур, якая дазваляе ў поўнай ступені забяспечыць жывёлагадоўлю кармамі ў неабходным асартыменце.

Сёння ў карыстанні суб'ектаў рознай формы ўласнасці, чый профіль – вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі ў Нясвіжскім раёне, знаходзіцца больш за 60,6 тыс. га ўгоддзяў, у тым ліку больш за 47,7 тыс. га ворных зямель, больш за 12,8 тыс. га – сенажацей. Землі тут пладаносныя: урадлівасць ворыва складае 43,9 бала, сельгасугоддзяў – 42,4.

Валавы збор зерня ў раёне пасля дапрацоўкі ў сельскагаспадарчых арганізацыях звычайна перавышае 160 тыс. т. На адну ўмоўную галаву жывёлы назапашваецца ў сярэднім 28–30 ц кармавых адзінак травяных кармоў.

Надаецца ўвага і вытворчасці тавараёмістых культур. **Валавы збор цукровых буракоў у раёне перавышае 210 тыс. т, насення для рапсавага алею — 14 тыс. т, бульбы — 6 тыс. т.**

Агульная колькасць буйной рагатай жывёлы складае 80 тыс. галоў. Таксама ў раёне вырошчваюць свіней, птушку.

На Нясвіжчыне працуюць сучасныя малочна-таварныя фермы з бясприпвязным утрыманнем, даеннем кароў у даільных залах рабатызаванымі ўстаноўкамі. Маюцца дзве адзінкі абсталявання тыпу «манарэйка» з камп'ютарным кіраваннем функцыямі даення.

Штогод работа па будаўніцтве і рэканструкцыі МТФ працягваецца. Узвядзенне малочна-таварнага комплексу з даільным блокам на 800 галоў у ААТ «Нясвіжскія Астроўкі», кароўніка МТФ «Наруцэвічы» ў ААТ «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ», рэканструкцыя МТФ на 500 галоў дойнага статка ў ААТ «17 Верасня» і МТФ на 400 галоў у ААТ «Грыцкевічы», будаўніцтва аб'ектаў жывёлагадоўлі ў ААТ «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ», «Лань-Нясвіж», «17 Верасня» і камунальным сельгасвытворчым унітарным прадпрыемстве «Эксперыментальная база «Свеклавічная» – толькі некаторыя з буйных праектаў гэтай галіны.

Дасягнуты ўзровень вытворчасці дазваляе працаваць з прыбыткам і штогод павялічваць рэнтабельнасць продажу ў галіне. Стратных сярод сельгасвытворцаў на Нясвіжчыне няма.

Выручка на занятых у галіне з кожным годам павышаецца, а сярэднямесячная заработная плата складае сёння больш за 1 400 рублёў.

## Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Агракамбінат «Сноў»

Тут упершыню ў краіне пачалі працаваць па прынцыпе «поле – ферма – перапрацоўка – прылавак – спажывец». І цяпер СВК «Агракамбінат «Сноў» – адна з лепшых інтэграваных гаспадарак у краіне. Яе дасягненні неаднаразова адзначаліся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і з’яўляюцца арыенцірам, да якога трэба імкнуцца многім сельгаспрадпрыемствам.

Якасць прадукцыі камбіната высока ацэньваецца спажыўцамі. Пацвярджэнне гэтаму – узнагароды конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», рэспубліканскага конкурсу спажывецкіх пераваг «Прадукт года», народнага конкурсу «Чэмпіён густу», грамадскага конкурсу «Лепшая прадукцыя года». СВК «Агракамбінат «Сноў» з’яўляецца лаўрэатам Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці з 2012 года.

Вынікам руплівай працы калектыву сталі высокія лічбавыя паказчыкі агракамбіната. Так, валавы збор зерня і кукурузы ў гаспадарцы складае 37 963 т. Штогод вытворчасць малака складае каля 32 тыс. т, мяса – звыш 28 тыс. т. Удой на карову перавышае 11 тыс. кг.

Клапоцяцца тут і пра людзей: ва ўсіх населеных пунктах на тэрыторыі гаспадаркі створаны неабходныя ўмовы для камфортнага жыцця.











## Адкрытае акцыянернае таварыства «Грыцкевічы»

ААТ «Грыцкевічы» на працягу многіх гадоў знаходзіцца ў ліку перадавікоў па эканамічных і вытворчых паказчыках у раённых, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах па ўборцы зерневых і нарыхтоўцы кармоў, дабіваецца высокіх вынікаў у вытворчасці малака.

У 2000 годзе гаспадарка першай у раёне выканала план продажу зерня дзяржаве, ураджайнасць склала 50,6 ц/га, а валавы збор зерневых перавысіў 5 тыс. т. Ураджайнасць цукровых буракоў раўнялася 580 ц/га. Гэта быў адзін з лепшых паказчыкаў не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы.

ААТ «Грыцкевічы» у 2022 годзе дасягнула самых высокіх паказчыкаў у раёне па шчальнасці кароў на 100 га сельгасугоддзяў (149 галоў), ураджайнасці збожжавых зерневых культур (91,8 ц/га).

Асабліва трэба адзначыць і дасягненні ў жывёлагадоўлі. Па выніках 2022 года ўдой малака на карову склаў 10,5 тыс. кг, што перавышае паказчык за 2021 год на 222 кг, а сярэднясутачнае прыбаўленне буйной рагатай жывёлы ў вазе – 838 г.

У красавіку 2010 года ААТ «Грыцкевічы», у прыватнасці МТФ «Мацылеўшчына», падчас працоўнай паездкі наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. У тым жа годзе на рэспубліканскіх «Дажынках» тады яшчэ СВК «Грыцкевічы» атрымаў трэцяе месца сярод сельскагаспадарчых арганізацый краіны, а ў 2022 годзе прадпрыемства заняло першае месца на раённых «Дажынках».





## Адкрытае акцыянернае таварыства «Гарадзея»



ААТ «Гарадзея» з цэнтрам у аг. Новагарадзейскі размешчана ў паўночнай частцы Нясвіжскага раёна. Агульная зямельная плошча таварыства – 4 503 га, з іх ворная зямля складае 3 825 га.

Гаспадарка штогод дэманструе высокія паказчыкі работы: валавы збор зерневых складае тут звычайна 10 788 т у бункернай вазе, рэалізацыя малака – 11 998 т у заліковай вазе (ці 10 316 т – у фізічнай) пры ўдоі на карову (агульная колькасць галоў у 2022 годзе – 1 295) у 8 998 кг.

У 2017 годзе ААТ «Гарадзея» заняло першае месца ў вобласці па эфектыўнасці работы і атрымала Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ў падарунак аўтамабіль Geely. У лютым 2018 года гаспадарцы зноў была аб'яўлена Падзяка кіраўніка дзяржавы за значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў.

## Адкрытае акцыянернае таварыства «Лань-Нясвіж»

Адміністрацыйным цэнтрам гаспадаркі з'яўляецца аг. Лань, які размешчаны за 8 км ад Нясвіжа і за 120 км – ад Мінска. Назва прадпрыемства і форма ўласнасці некалькі разоў мяняліся, цяперашняя – ААТ «Лань-Нясвіж» – існуе з 21 студзеня 2011 года.

Дзейнасць гэтага адкрытага акцыянернага таварыства прадугледжвае вытворчасць прадукцыі раслінаводства, жывёлагадоўлі, уласную перапрацоўку і рознічны гандаль уласнай прадукцыяй і прадукцыяй іншых вытворцаў.

ААТ «Лань-Нясвіж» – адно з валаўтваральных прадпрыемстваў раёна. У 2022 годзе збор збожжавых і зернебабовых тут склаў 16,8 тыс. т, цукровых буракоў – 27 тыс. т пры ўраджайнасці 540 ц/га, алейнага семя рапсу – 1 679 т пры ўраджайнасці 41,5 ц/га.







## Адкрытае акцыянернае таварыства «17 Верасня»

Размяшчаецца на адлегласці 18 км ад Нясвіжа і 130 км ад Мінска. Цэнтральная сядзіба – аг. Высокая Ліпа. Землі ААТ «17 Верасня» займаюць тэрыторыі Ліпскага сельсавета, у склад якога ўваходзіць сем населеных пунктаў з насельніцтвам каля 1 370 чалавек: аг. Высокая Ліпа, вёскі Вялікая Ліпа, Баяры, Еськавічы, Завушша, Круты Бераг, Квачы.



У гаспадарцы штогод вырошчваецца больш за 9,7 тыс. т зерня, 13 тыс. т цукровых буракоў, рэалізуецца звыш 13,6 тыс. т малака і амаль 790 т мяса.

Па выніках работы за 2022 год удой на карову склаў 9 600 кг, што на 431 кг больш за паказчык 2021 года.



У апошнія гады адкрытае акцыянернае таварыства актыўна займаецца будаўніцтвам новых аб'ектаў. Так, былі ўзведзены васьмі- і чатырохкватэрны жылыя дамы, тры кароўнікі на 310, 226 і 150 галоў, адзін цялятнік на 248 галоў, пяць сіласна-сянажных траншэй у аг. Высокая Ліпа. Таксама пачалі працаваць чатыры цялятнікі на тэрыторыі в. Вялікая Ліпа на 1 360 галоў.



## Адкрытае акцыянернае таварыства «Нясвіжскія Астроўкі»

У гаспадарцы развіваюць жывёлагадоўлю мяса-малочнага напрамку, вырошчваюць зерневыя, кукурузу, рапс.

У 2017 годзе ААТ «Нясвіжскія Астроўкі» стала пераможцам раённага спаборніцтва па ўборцы зерневых і зернебабовых культур, у 2020-м дасягнула высокіх паказчыкаў па ўраджайнасці зерневых і зернебабовых і было ўзнагароджана дыпломам I ступені Нясвіжскага райвыканкама, у 2021 годзе – дыпломам III ступені Нясвіжскага райвыканкама за дасягненне высокіх паказчыкаў па прадукцыйнасці сельскагаспадарчай жывёлы і ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур.

Значных вынікаў работнікі дасягнулі і ў жывёлагадоўлі. У снежні 2022 года быў уведзены ў эксплуатацыю малочнатаварны комплекс «Прасці» на 800 галоў, удой малака на карову дасягнуў 9 607 кг, што на 513 кг больш за паказчыкі 2021 года.

Штогод гаспадарка рэалізуе звыш 10 тыс. т малака і больш за 550 т мяса.











## Адкрытае акцыянернае таварыства «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ»

Калгас «Новае жыццё» заснаваны ў 1951 годзе шляхам зліцця дробных калектыўных гаспадарак вёсак Аношкі, Жанкавічы, Долкінды. У снежні 1976 года да іх быў далучаны калгас «Дружба». У 1994 годзе на базе аб'яднання створана адкрытае акцыянернае таварыства «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ».

ААТ «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ» размешчана ў паўднёва-заходняй частцы Нясвіжскага раёна. У склад гаспадаркі ўваходзяць дзевяць населеных пунктаў з цэнтральным – аг. Аношкі. Асноўныя віды дзейнасці таварыства: сельская гаспадарка (мяса-малочная жывёлагадоўля, збожжа, цукровыя буракі), мясаперапрацоўка, гандаль.



Вытворчая структура таварыства ўключае сельскагаспадарчы ўчастак, чатыры малочнатаварныя фермы, таварную ферму, свінатаварную ферму, мясаперапрацоўчы цэх, трактарны парк, рамонтныя майстэрні, аўтагараж, будаўнічы ўчастак, брыгаду працаёмкіх працэсаў. Маецца на базе ТАА «Аношкі», якое прадстаўлена чатырма крамамі і двума сталовымі.

У раслінаводстве гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых, зернебабовых, алейных культур і цукровых буракоў. Плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складае 5 388 га. Па выніках спаборніцтва па ўборцы збожжавых культур гаспадарка займае прызавыя месцы. Ураджайнасць у 2022 годзе тут склала 91,0 ц/га.

Жывёлагадоўля арыентавана на вытворчасць малака, вырошчванне мяса буйной рагатай жывёлы, развядзенне свіней. Надой на карову ў 2022 годзе склаў 9 356 кг.

У гаспадарцы функцыянуе мясаперапрацоўчы цэх, які ўведзены ў эксплуатацыю ў 1992 годзе. На сённяшні дзень цэх мае шырокі асартымент і вырабляе больш за 50 найменняў гатовай прадукцыі, 23 з іх – паўфабрыкаты, астатняе – топленыя і харчовыя тлушчы, мясныя апрацаваныя субпрадукты. Рэалізацыя ажыццяўляецца як праз гандлёвую сетку ААТ «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ», так і праз іншыя.

Будаўніцтва прадстаўлена будаўнічымі брыгадамі, праца якіх увесь час накіравана на тое, каб узвесці за пэўны тэрмін спраектаваныя аб'екты ў адпаведнасці з патрабаваннямі якасці, бяспекі, выкарыстоўваючы наяўныя чалавечыя і матэрыяльныя рэсурсы.



## Адкрытае акцыянернае таварыства «Сейлавічы»

Агульная зямельная плошча гаспадаркі – 3 617 га.

2022 год для ААТ «Сейлавічы» характарызаваўся добрымі паказчыкамі работы. Валавы збор зерневых культур тут склаў 9 107 т пры ўраджайнасці 68,5 ц/га, пад іх было занята 1 330 га плошчы. Добры ўраджай рапсу атрымалі працаўнікі гаспадаркі. Так, с плошчы 250 га сабралі 1 039 т пры ўраджайнасці 41,6 ц/га. Пад цукровыя буракі было занята 313 га плошчы, валавы збор склаў 13 732 т, ураджайнасць – 438 ц/га.

Высокія паказчыкі характэрызуюць і жывёлагадоўчую галіну. У гаспадарцы маецца 2 834 галавы буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 1 190 галоў дойнага статка. За 2022 год валавы надой малака склаў 10 313 т, удой на карову – 8 667 кг. Прадукцыя вырошчвання буйной рагатай жывёлы – 453,9 т, сярэднясутачная вага (прыбытак) – 690 г.

Пры гаспадарцы працуе свінаводчая ферма, у якой налічваецца 6 530 галоў. Прадукцыя за 2022 год склала 980,5 т, сярэднясутачнае прыбаўленне ў вазе – 527 г.

Паступова паляпшаецца інфраструктура гаспадаркі: у 2022 годзе тут было закончана будаўніцтва двухкватэрнага жылога дома, сянажна-сіласнай траншэі, створана артэзіянская скважына ў в. Кунаса, пачалося ўзвядзенне МТФ № 2 у в. Андрушы, праводзілася рэканструкцыя жывёлагадоўчых памяшканняў. Акрамя таго, зараз у таварыстве актыўна ажыццяўляецца абнаўленне машынна-трактарнага парку.







## Адкрытае акцыянернае таварыства «Юшавічы»



Гаспадарка займае тэрыторыю ў 4 746 га, з іх пад сельскагаспадарчыя ўгоддзі адведзена 4 419 га.

Укараненне ў вытворчасць інтэнсіўных тэхналогій дазволіла «Юшавічам» выйсці на высокія паказчыкі ў раслінаводстве. Валавы збор зерневых у 2022 годзе склаў тут 8 101 т. Акрамя таго, сабрана 13 006 т цукровых буракоў, 862 т алейнага семя рапсу, 1 258 т зерня кукурузы.

У гаспадарцы маюцца тры малочнатаварныя фермы, на якіх утрымліваецца 4 457 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 1 196 кароў. Валавая вытворчасць малака складае звычайна больш за 9 100 т, сярэдні ўдой на карову – 7 564 кг.

На тэрыторыі ААТ «Юшавічы» створаны ўмовы для камфортнага пражывання насельніцтва ў сельскай мясцовасці.

На сённяшні дзень у адкрытым акцыянерным таварыстве працягваецца рэканструкцыя малочнатаварнай фермы «Юшавічы».





## Закрытае акцыянернае таварыства «1 Мая»

Адміністрацыйным цэнтрам гаспадаркі з'яўляецца в. Лявонавічы, якая размешчана ў паўднёва-ўсходняй частцы раёна ў 17 км ад Нясвіжа.

Таварыства спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, а таксама мае развітую вытворчасць збожжавых і зернебабовых культур і цукровых буракоў.

На сённяшні дзень агульная зямельная плошча гаспадаркі складае 6 100 га, з іх сельскагаспадарчых угоддзяў – 5 805 га, раллі – 4 069 га.

Налічваецца 8 383 галавы буйной рагатай жывёлы, з іх асноўны статак – 1 362 галавы.

Малочны статак размешчаны на трох малочнатаварных фермах: «Лявонавічы» – 524 галавы, «Дубейкі» – 389 галоў, «Солтанаўшчына» – 449 кароў. Маладняк буйной рагатай жывёлы змяшчаецца і адкормліваецца на комплексе па дагадоўванні і адкорме на 4 800 галоў.











## Закрытае акцыянернае таварыства «Агракамбінат Нясвіжскі»

ЗАТ «Агракамбінат Нясвіжскі» – гэта сучаснае шматгаліновае сельскагаспадарчае прадпрыемства з 26-гадовай гісторыяй развіцця.

Сёння плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складае 2 600 га, ворных зямель – 1 999 га.

Спецыялізацыя прадпрыемства ў раслінаводстве засноўваецца на вырошчванні гародніны закрытага грунту (агурок, тамат, баклажан) і цалкам арыентуецца на вытворчасць экалагічна чыстага прадукта.

Адным з асноўных відаў дзейнасці агракамбіната з'яўляецца мясаперапрацоўчая вытворчасць.

Прадпрыемства актыўна развівае і жывёлагадоўчую галіну. У 2022 годзе агульная колькасць буйной рагатай жывёлы склала тут 3 250 галоў.

У 2021 годзе ў ЗАТ «Агракамбінат Нясвіжскі» уведзены ў эксплуатацыю комплекс па гадоўлі мясной жывёлы абердзін-ангускай пароды, пагалоўе якой у 2022 годзе налічвала 160 галоў. Мяса дадзеных жывёл адрозніваецца сакавітасцю і з'яўляецца найлепшым для падрыхтоўкі стэйкаў.

У гэтым жа годзе прадпрыемства атрымала статус суб'екта племянной жывёлагадоўлі «Генафондная гаспадарка па гадоўлі авечак» літоўскай чорнагаловай пароды, мяса якой характарызуецца высокімі смакавымі якасцямі.

Адным з важных напрамкаў дзейнасці агракамбіната «Нясвіжскі» з'яўляецца вырошчванне асятровых парод, сажалкавай рыбы і пчалярства, рэалізацыя названай прадукцыі насельніцтву і арганізацыям.

За ўсёй прадукцыяй ЗАТ «Агракамбінат Нясвіжскі» ажыццяўляецца ўнутраны кантроль якасці сіламі ўласнай лабараторыі, у тым ліку праводзяцца мікрабіялагічныя даследаванні ў адпаведнасці з патрабаваннямі сістэмы HACCP.





## Адкрытае акцыянернае таварыства «Нясвіжскі райаграсэрвіс»

ААТ «Нясвіжскі райаграсэрвіс» спецыялізуецца на жывёлагадоўлі, вырошчванні цукровых буракоў і зерневых, развівае малочную галіну і ўносіць важкі ўклад у сельгасвытворчасць раёна.

Валавы збор зерневых у 2022 годзе склаў 11 251 т. Акрамя таго, сабрана 15 816 т цукровых буракоў, 852 т алейнага семя рапсу.

У гаспадарцы маюцца тры малочнатаварныя фермы, на якіх утрымліваецца 2 780 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 1 300 кароў. Таксама пры ААТ «Нясвіжскі райаграсэрвіс» працуюць пяць магазінаў рознічнага гандлю.



## Дзяржаўная ўстанова «Нясвіжская раённая ветэрынарная станцыя»

Спецыялісты райветстанцыі ажыццяўляюць ветэрынарныя мерапрыемствы, накіраваныя на папярэджанне і ліквідацыю асабліва небяспечных і інфекцыйных хвароб, у тым ліку агульных для чалавека і жывёл, удзельнічаюць у дыягнастычных і прафілактычных мерапрыемствах на сельгаспрадпрыемствах.









## Дзяржаўная сельскагаспадарчая ўстанова «Нясвіжская сортавыпрабавальная станцыя»

Сёння станцыя мае 539 га сельскагаспадарчых угоддзяў, з іх 385 ворыва ва ўрочышчах «Батлейка» і «Новыя палі» ўздоўж шашы Нясвіж – Клецк.

Асноўнай задачай прадпрыемства з’яўляецца максімальна аператыўнае выяўленне і раяніраванне высокаўраджайных і каштоўных па якасці сартоў, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням сельскагаспадарчай вытворчасці. На працягу апошніх пяці гадоў тут штогод праходзілі выпрабаванні ад 700 да 1 тыс. сортаопытаў айчыннай і замежнай селекцыі па 14–18 культурах. Вынікам гэтай работы ў 2017–2022 гадах з’явілася ўключэнне ў Дзяржаўны рэестр 425 сартоў і гібрыдаў.

У 2009 годзе тут быў адкрыты ўчастак патэнтнай экспертызы, а з 2010-га актыўнае развіццё атрымала пладаводства. Акрамя гэтага, станцыя спецыялізуецца на вытворчасці лекавай і аднаўляльнай сыравіны.







## Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Доследная навуковая станцыя па цукровых бураках»

Сёння РУП «Доследная навуковая станцыя па цукровых бураках» – вядучая ўстанова па вырошчванні буракоў у Рэспубліцы Беларусь. Адзін з важных напрамкаў дзейнасці – селекцыйная праца.

Толькі за апошнія пяць гадоў тут створаны і ўкараняюцца ў сельскагаспадарчую вытворчасць высокапрадукцыйныя, высакаякасныя і канкурэнтаздольныя гібрыды цукровых буракоў айчыннай селекцыі. У Дзяржаўным рэестры Рэспублікі Беларусь зарэгістравана дзевяць гібрыдаў цукровых буракоў. Гэта вынік працы селекцыянераў Нясвіжа.

Цяпер работа ў гэтым напрамку працягваецца, ствараюцца новыя гібрыды цукровых буракоў, у тым ліку сумесна з селекцыйнымі ўстановамі блізкага і далёкага замежжа.

Даследаванні навуковай станцыі праводзяцца таксама па многіх пытаннях апрацоўкі цукровых буракоў. Праблемы, якія стаяць перад галіной, заключаюцца перш за ўсё ў вырашэнні тэхналагічных і арганізацыйных пытанняў, накіраваных на інтэнсіфікацыю вытворчасці, паляпшэнне якасці прадукцыі. Гэта распрацоўка і прымяненне новых форм угнаенняў, асваенне прагрэсіўных сістэм аховы раслін, выкарыстанне ўсіх іншых элементаў тэхналогіі вырошчвання цукровых буракоў.

Вучоныя доследнай станцыі супрацоўнічаюць з калегамі з Германіі, Кыргызстана, Польшчы, Расіі, Сербіі, Узбекістана, Украіны. Гэта прыносіць не толькі тэарэтычныя, але і практычныя вынікі камерцыйнага выкарыстання вынікаў сумеснай дзейнасці. З лютага 2021 года РУП «Доследная навуковая станцыя па цукровых бураках» з'яўляецца членам Міжнароднага інстытута даследаванняў цукровых буракоў IIRB (Бельгія).





## Камунальнае сельскагаспадарчае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Эксперыментальная база «Свеклавічная»

Прадпрыемства размешчана ў паўночнай частцы Нясвіжскага раёна. Агульная зямельная плошча гаспадаркі складае 3 359 га, сельскагаспадарчых угоддзяў – 3 219 га, ворыва – 2 670 га.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці тут з'яўляюцца: у раслінаводстве – вырошчванне зерневых, зернебабовых, крыжакветных культур, цукровых буракоў і рэалізацыя элітнага насення; у жывёлагадоўлі – вытворчасць малака, развядзенне буйной рагатай жывёлы. Займаюцца на прадпрыемстве і перапрацоўкай мяса, вытворчасцю гатовых прадуктаў і паўфабрыкатаў, перапрацоўкай рапсу, прыгатаваннем камбікармоў, аптовым і рознічным гандлем.











# ПРАМЫСЛОВАСЦЬ. ПРАЦА ПА СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ

## З гісторыі прамысловасці раёна

Падчас Вялікай Айчыннай вайны амаль уся прамысловасць, якая нараджалася ў першыя гады савецкай улады, была знішчана. Адраджэнне пачалося адразу пасля вызвалення раёна войскамі Чырвонай Арміі. Першымі наладзілі работу цагельны, лесапільны і спіртавы заводы, крухмальна-млынавы камбінат, электрастанцыя, машынна-трактарная станцыя. Аднаўленне патрабавала вялікіх намаганняў, аднак патрыятызм і жаданне працаваць дапамагалі перадольваць усе цяжкасці.

У 1946 годзе пачалася пяцігодка развіцця народнай гаспадаркі. У Нясвіжы ўдарнай працай вызначаліся калектывы райаграпрамкамбіната, лесазавода, хлебазавода, арцелі «Новая зара». У Гарадзеі быў адкрыты цэх па вырабе цукру, у Пагарэльцах – валяльная і шавецкая майстэрні, у Нясвіжы – цэх па вырабе алюмініевага посуду. Усяго адноўлены з руін або зноў створаны 15 прамысловых прадпрыемстваў.

Стратэгічна важнай стала прадукцыя **Нясвіжскага хлебазавода**. Ён пачаў працу ў 1939 годзе на базе былой прыватнай пякарні пана Крашэўскага, якую нацыяналізавала савецкая ўлада. У 1952-м у склад хлебакамбіната ўвайшлі Гарадзейская пякарня, сушыльны цэх і цэх па вытворчасці безалкагольных напояў. У 1963-м адкрыліся кансервавы цэх і цэх па перапрацоўцы яблыкаў. У 1964 годзе да хлебакамбіната далучылі харчовыя прадпрыемствы Клеччыны і перайменавалі яго ў «Нясвіжскі райхарчкамбінат». З 1969 года прадпрыемства называецца «Нясвіжскі хлебазавод».







Цікавая гісторыя і яшчэ ў аднаго «хлебнага» месца – Гарадзейскага хлебапрыёмнага прадпрыемства. Яно (на той момант пад назвай «Загатзерне») было створана ў 1939 годзе і абслугоўвала тры раёны. Сховішчы знаходзіліся ў населеных пунктах Пагарэльцы і Гарадзея. Першым дырэктарам «Загатзерня» стаў Канстанцін Кійко. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ён вымушаны быў нарыхтоўваць зерне для нямецкай арміі, але ў сакавіку 1944 года яго арыштавалі за сувязь з партызанамі і расстралялі ў канцлагеры «Колдычава».

Работа на прадпрыемстве была вельмі цяжкай, усё рабілася ўручную, аднак паступова і сюды прыйшоў прагрэс. У 1951 годзе праклалі рэйкі, а ў 1964-м правялі рэканструкцыю, у ходзе якой амаль усе працэсы сталі механізаванымі.

Напрыканцы мінулага і ў пачатку гэтага стагоддзя на Гарадзейскім хлебапрыёмным прадпрыемстве з'явіліся важныя пабудовы: бункеры для вентыліравання сартавога насення, шэсць бункераў часовага утрымання зерня. Акрамя таго, быў адкрыты магазін. У 1988 годзе прадпрыемства ўзнагародзілі срэбным медалём за ўдзел ва Усесаюзным аглядзе якасці сартавога насення і вылучылі на Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве.

17 студзеня 1956 года было прынята рашэнне аб будаўніцтве ў Гарадзеі другога Беларускага цукровага завода, а 26 снежня 1959 года на новым прадпрыемстве ўжо атрымалі першы цукар. Завод штодня перапрацоўваў 1 500 т буракоў і даваў 150 т цукру.

У 1976 годзе створаны **Гарадзейскі цукровы камбінат.** У яго склад увайшлі Гарадзейскі цукровы завод, завод цукровабурачнага насення і саўгас «Буракаводчы». Пачалася работа па мадэрнізацыі вытворчасці і павелічэнні магутнасці з 1 500 да 2 500 т перапрацоўкі буракоў за суткі. У гэты час Гарадзейскі цукровы камбінат быў практычна поўнасцю абноўлены.



**Будынкі хлебапрыёмнага прадпрыемства у г. п. Гарадзея, 1970–1980-я гады**



У ліпені 1986 года **завод цукровабурачнага насення** і **саўгас «Буракаводчы»** аддзяліліся ад камбіната.

У гісторыі развіцця і ўмацавання эканомікі раёна пачэснае месца займалі калектывы **гарадскога малочнага завода, хлебазавода, швейнай фабрыкі, торфапрадпрыемства «Чырвоная зорка», друкарні**.

У 1997 годзе ў Нясвіжы быў пабудаваны і пачаў выпускаць прадукцыю **завод безалкагольных напояў**.

XXI стагоддзе прынесла росквіт фармацэўтычнай прамысловасці. У Нясвіжы размяшчалася адразу тры вядучыя прадпрыемствы галіны. Старэйшае з іх – **адкрытае акцыянернае таварыства «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў»** – было створана на базе Альбянскага спіртзавода. У сярэдзіне 1961 года Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў першым у Беларусі наладзіў выпуск біяміцыну, які ў тыя часы быў вельмі запатрабаваны ў жывёлагадоўлі і птушкаводстве.

У 1984 годзе тут пачаў работу цэх па вытворчасці экалагічнага мікробнага ўгнаення на тарфяной аснове – «Рызатарфіну», а сам завод атрымаў назву Нясвіжскага біяхімічнага. У 1985 годзе на ім сталі выпускаць унікальны супрацьбактэрыяльны прэпарат «Баліз-2» – высокаэфектыўны лекавы сродак для зажыўлення ран і апёкаў.

У 1991 годзе завод змяніў мікрабіялагічную спецыялізацыю на фармацэўтычную: тут паспяхова асвоілі выпуск раствораў глюкозы і хларыду натрыю. У 2004 годзе вытворчасць салявых раствораў для інфузій дасягнула 5 млн бутэлек на год і завод стаў асноўным пастаўшчыком інфузійных раствораў у Рэспубліцы Беларусь.

**Сумеснае беларуска-галандскае прадпрыемства «Фармлэнд»** пачало адлічваць сваю



Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў, 1968 год

гісторыю з 1998 года. Упершыню на тэрыторыі СНД на ім была наладжана вытворчасць інфузійнага раствору ізатанічнага хларыду натрыю, упакаванага ў ПВХ-кантэйнеры.

У 2003 годзе на «Фармлэндзе» асвоілі выпуск тэстсістэм, распрацаваных сумесна са спецыялістамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пры непасрэдным удзеле вядучых вытворцаў імунаферментных дыягнастычных тэст-сістэм і рэагентаў Расійскай Федэрацыі.

**Замежнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства (ЗВУП) «Мед-інтэрпласт»** было створана шляхам перайменавання сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Ліном» (арганізавана 19 чэрвеня 2009 года) для вытворчасці лекавых сродкаў, парфумерна-касметычнай прадукцыі і прадукцыі медыцынскага прызначэння.

Спачатку на базе складскіх памяшканняў быў створаны цэх па вытворчасці цвёрдага мыла. Першая лінейка называлася «Кроха» (5 найменняў) і прызначалася для дзяцей. Праз год асвоілі другую – туалетнае мыла «Ардынарнае» (11 найменняў), гаспадарчыя – «Ліном», «Яблык», «Хвойнае», дзягцярнае. У 2013-м пачаўся выпуск гарчычнікаў-пакетаў.

Поспехі ў сельскай гаспадарцы дазволілі стварыць у Нясвіжы вельмі важны аб'ект – **таварыства з абмежаванай адказнасцю «Нясвіжскі завод дзіцячага харчавання»**. Прадпрыемства зарэгістравана ў 2013 годзе і ў канцы 2016-га ўведзена ў эксплуатацыю.

Насенне рапсу на алей і шрот перапрацоўвае яшчэ адно адносна новае прадпрыемства – **закрытае акцыянернае таварыства «Аблрапсаграсэрвіс»**. Яно створана 22 студзеня 2010 года.

На хвалі патрабаванняў часу адно за адным узніклі два прадпрыемствы па вырабе ўпакоўкі. **Сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «Еўратарэкс»** створана ў лютым 2000 года пры ўдзеле Гарадзейскага і Скідзельскага цукровых камбінатаў з мэтай арганізацыі ўласнай вытворчасці поліпрапіленавых тканых мяхоў для ўпакоўкі цукру. Праект быў рэалізаваны ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай імпартазамяшчэння.



**Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Флексасэрвіс»** пачало выпрацоўваць папяровыя пакеты для аўтаматычнай і ручной фасоўкі харчовых і нехарчовых тавараў у 2002 годзе, а ў 2004-м, калі выпуск прадукцыі дасягнуў 17,7 млн пакетаў, было прынята рашэнне нарасціць вытворчыя магутнасці.



# Прамысловыя прадпрыемствы Нясвіжа сёння

Сённяшні дзень прамысловасці Нясвіжа – гэта перш за ўсё сучасныя тэхналогіі ў спалучэнні з высокакваліфікаванымі кадрамі, развіццё напрамкаў вытворчасці, забяспечаных якасней сыравінай. Сярод вядучых прамысловых прадпрыемстваў Нясвіжа на гэты час можна адзначыць наступныя.

## Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Нясвіжскі завод дзіцячага харчавання»

Асноўная дзейнасць прадпрыемства – перапрацоўка малака і выпуск малочнай і кісламалочнай прадукцыі з максімальна магчымай ступенню бяспекі для дзяцей усіх узростаў. Рэцэптуры ёгуртаў, малочных кактэйляў і іншых прадуктаў ствараюцца з улікам спецыфікі харчавання дзяцей, іх патрэб для росту і паспяховага развіцця.

На заводзе перапрацоўваюць 200–220 т малака на суткі, паступова павялічваючы магутнасці. Сыравінай для вытворчасці з'яўляецца малако пераважна гатунку экстра, якое пастаўляюць гаспадаркі Нясвіжскага, Стаўбцоўскага, Капыльскага, Чэрвеньскага і Валожынскага раёнаў. З 2021 года на заводзе паспяхова дзейнічае адна з самых распаўсюджаных на міжнародным рынку схема сертыфікацыі FSSC 22000, а натуральнасць біяпрадуктаў пацверджана сертыфікатамі «Натуральны прадукт».

98 % прадукцыі пастаўляецца ў Расійскую Федэрацыю.

Нясвіжскі завод дзіцячага харчавання на працягу некалькіх гадоў узнагароджваецца дыпломамі конкурсу «Лепшы экспарцёр» у намінацыі «Малочная прамысловасць».





## Адкрытае акцыянернае таварыства «ГАРАДЗЕЙСКІ ЦУКРОВЫ КАМБІНАТ»

У XXI стагоддзі ў жыцці гэтага прадпрыемства, асноўная праца якога – выпуск цукру, пачалася новая эра. З пачатку 2000-х гадоў тут з'явілася шмат новага абсталявання: дзве аўтаматычныя лініі па вытворчасці цукру, фасаванага ў пакеты па 1 кг, аўтамат для расфасоўкі цукру ў парцыённую ўпакоўку па 5 і 10 г і многае іншае. Было ўведзена ў эксплуатацыю аддзяленне бястарнага захоўвання цукру агульнай ёмістасцю 100 тыс. т.

Хутка пашыраўся асартымент: акрамя цукру, на камбінаце сталі перапрацоўваць садавіну і пад гандлёвай маркай «Фруктовый ларец» выпускаць канфіцюры, джэмы, павідла і інш.

У 2012 годзе быў створаны Стаўбцоўскі філіял ААТ «ГАРАДЗЕЙСКІ ЦУКРОВЫ КАМБІНАТ», дзе выпрабляюцца сокі, нектары, морсы, кансервы з гародніны, саленні, садавінна-ягадныя напаўняльнікі і іншае. Поўнасцю натуральная прадукцыя прадстаўлена сёння пад брэндам «Для друзей».

Зараз магутнасці камбіната па перапрацоўцы сыравіны дасягаюць 10 тыс. т цукровых буракоў штосутачна з магчымасцю атрымліваць да 1,5 тыс. т цукру.

Калектыў прадпрыемства з'яўляецца пераможцам конкурсу «Лепшы цукровы завод» Еўрапейскага эканамічнага саюза ў 2014, 2015, 2016, 2017, 2018 і 2021 гадах, прызёрам II ступені ў 2020-м.








## Філіял «Гарадзейскае хлебапрыёмнае прадпрыемства» ўнітарнага прадпрыемства «Барысаўскі камбінат хлебапрадуктаў» адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскаблхлебапрадукт»

Гарадзейскае хлебапрадпрыемства славіцца сваімі традыцыямі, пераемнасцю пакаленняў, працавітымі людзьмі.

Сёння тут займаюцца захоўваннем і складзіраваннем зерня, у тым ліку для патрэб дзяржавы, шроту сланечніку, соі, камбікармоў; рознічным і аптовым гандлем кармамі для сельскагаспадарчых жывёл; рознічным і аптовым гандлем прадуктамі харчавання, напоямі і тытунёвымі вырабамі; здачай у арэнду нерухомай маёмасці.



## Адкрытае акцыянернае таварыства «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў»

Сёння ААТ «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» адзінае ў краіне выпускае інфузійныя растворы ў поўным асартыменце. Праектныя магутнасці прадпрыемства – 32 млн адзінак прадукцыі на год.

Пачатак 2000-х гадоў адзначыўся хуткім развіццём: на заводзе была запушчана лінія па вытворчасці інфузійных раствораў у поліэтыленавай тары Bottlepack па тэхналогіі BFS; уведзены ў эксплуатацыю ўчастак па вырабе інфузійных раствораў у палімерных кантэйнерах; праведзена поўная мадэрнізацыя лініі па выпуску раствораў у шкляной тары. Гэта дазволіла стварыць аўтаматызаваную вытворчасць, якая адпавядае сусветным стандартам якасці.

У 2022 годзе мадэрнізаваны ўчастак па выпуску інфузійных раствораў у мяккіх палімерных кантэйнерах, устаноўлена абсталяванне, якое дало магчымасць выпускаць растворы па поўным цыкле: фарміраванне, напаўненне, упакоўка.







## Сумеснае прадпрыемства таварыства з абмежаванай адказнасцю «Фармлэнд»

У 2009 годзе сумеснае прадпрыемства таварыства з абмежаванай адказнасцю (СП ТАА) «Фармлэнд», якое раней працавала на тэрыторыі Нясвіжскага завода медыцынскіх прэпаратаў, справіла наваселле на ўласных плошчах.

Праца «Фармлэнда» абмяжоўвалася выпускам вадкіх лекавых форм: раствораў для ін'екцый і інфузій, канцэнтратаў для гемадыялізу.

У 2011-м тут асвоілі вытворчасць цвёрдых форм лекаў: таблетак, капсул, парашкоў. Для гэтага быў пабудаваны новы цэх. Развіццё гэтай вытворчасці з'явілася вынікам міжнароднай каапераці фармацэўтычных кампаній Holden Medical Laboratories Pvt. Ltd. (Індыя), Holden Medical B. V. (Нідэрланды) и СП ТАА «Фармлэнд». З кампаніяй Imres B. V. (Нідэрланды) быў наладжаны выпуск біялагічна актыўных дабавак да ежы. У 2014-м у Нясвіжы сталі вырабляць сумесі для энтэральнага харчавання.

У 2015 годзе на прадпрыемстве распрацавалі першыя айчынныя расходныя матэрыялы для правядзення плазмаферэзу і трамбацытаферэзу. Быў уведзены ў эксплуатацыю завод па вытворчасці лекавых сродкаў на аснове плазмы крыві. Аб'ём інвестыцый склаў 23 млн долараў ЗША. Вытворчыя магутнасці дазваляюць перапрацоўваць 650 тыс. л плазмы на год.

Кожны наступны год СП ТАА «Фармлэнд» распрацоўвае і ўкараняе ў вытворчасць шмат новых лекавых прэпаратаў. Так, у 2021-м тут упершыню ў гісторыі Беларусі і Расіі асвоены прамысловы выпуск для клінічных выпрабаванняў высокаачышчанага айчыннага прэпарату на аснове плазматычнага фактару згусання VIII «Фармаклот» і IX «Фармафікс».

У 2022 годзе наменклатура прадпрыемства склала звыш 100 найменняў лекавых сродкаў і 33 найменні тэст-сістэм для дыягностыкі розных захворванняў.

Стратэгія СП ТАА «Фармлэнд» – выпуск высакаякаснай імпартазамяшчальнай прадукцыі для нашай краіны.





## Замежнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Мед-інтэрпласт»

«Мед-інтэрпласт» за кароткі перыяд выйшаў у лідары фарміндустрыі Рэспублікі Беларусь. Зараз прадпрыемства выпускае 30 найменняў лекавых прэпаратаў у форме капсул (у тым ліку з лекавай раслiннай сыравіны), парашкоў, таблетак. Гэта гастраэнтэралагічныя прэпараты, вітамінныя комплексы, сродкі для лячэння апорна-рухальнага апарату, вострых рэспіраторных захворванняў і грыпу, анеміі і інш. Вытворчасць ажыццяўляецца па стандартах GMP (Good Manufacturing Practice ці Належная вытворчая практыка) па поўным цыкле ад кантролю паступаючай субстанцыі да выпуску канечнага прадукту. Усе лекавыя прэпараты прадпрыемства – высокай якасці. Частка з іх з'яўляецца генэрыкамі імпартных аналагаў.

Прадукцыя прадпрыемства як рэалізуецца на ўнутраным рынку, так і экспартуецца ў іншыя краіны.




## Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Флексасэрвіс»

Прадукцыя таварыства – папяровыя пакеты для аўтаматычнай і ручной фасоўкі харчовых і нехарчовых тавараў – карыстаецца вялікім попытам, асабліва сярод прадпрыемстваў цукровай галіны Рэспублікі Беларусь, патрэбы якіх тут забяспечваюцца цалкам.

Аб'ём выпускаемай прадукцыі на год складае звычайна больш за 250 млн штук пакетаў і 450 т паперы з друкам. Пашырэнне магутнасці і магчымасці вытворчасці, укараненне новых тэхналогій, набыццё сучаснага еўрапейскага абсталявання дапамагаюць прадпрыемству падтрымліваць высокі ўзровень працы, наладжваць экспартныя пастаўкі ў Расійскую Федэрацыю. Выручка ад экспарту толькі за 2022 год склала 3,76 млн долараў ЗША.

Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Флексасэрвіс» – гэта сучаснае прадпрыемства, накіраванае на выпуск прадукцыі высокай якасці ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і патрабаваннямі спажыўцоў.







## Філіял «Нясвіжскі хлебазавод» адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўхлебпрам»

Сёння філіял «Нясвіжскі хлебазавод» адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўхлебпрам» – гэта прадпрыемства з сучасным абсталяваннем, шырокім асартыментам прадукцыі, якая вядома не толькі сярод жыхароў Нясвіжа. Гандлёвыя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі суседніх Клецкага, Капыльскага, Стаўбцоўскага раёнаў, а таксама Мінска ахвотна набываюць нясвіжскія хлебабулачныя і кандытарскія вырабы.

Тэхнолагі прадпрыемства штогод распрацоўваюць новыя віды прадукцыі. У 2012 годзе наладжана вытворчасць сухой заквасачнай сумесі «Рэксол-Хмель». Яе выкарыстанне дазволіла аднавіць старажытныя тэхналогіі прыгатавання хлеба на хмелі без прымянення дражджэй. У 2018-м на заводзе распрацавалі і ўкаранілі ў вытворчасць сумесь кампазітную «Хмяляначка». Гэта інавацыйная прадукцыя, аналагаў якой няма ў Рэспубліцы Беларусь.

Філіял «Нясвіжскі хлебазавод» адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўхлебпрам» актыўна ўдзельнічае ў Рэспубліканскім аглядзе якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Смаката», Міжнароднай выставе прадуктаў харчавання, напояў і сыравіны для іх вытворчасці «ПРАДЭКСПА». Сёння ў скарбонцы завода 8 Гран-пры, 52 залатыя, 25 сярэбраных, 5 бронзавых медалёў, сертыфікат «Натуральны прадукт», узнагароды конкурсу-дэгустацыі «Густ» лепшых прадуктаў харчавання Беларусі.





## Закрытае акцыянернае таварыства «Аблрапсаграсэрвіс»

Закрытае акцыянернае таварыства «аблрапсаграсэрвис» – вытворца алею і шроту з насення рапсу. Першапачаткова, у 2010 годзе, прадпрыемства перараблала толькі 70 т насення за суткі. У 2013 годзе тут былі ўведзены ў эксплуатацыю цэх па перапрацоўцы насення метадам гарачага прэсавання з магутнасцю 200 т за суткі. У 2014-м запрацаваў цэх экстракцыі і праведзена мадэрнізацыя перапрацоўкі да 500 т за суткі. Быў атрыманы новы прадукт – шрот з рэшткамі алею 2 %.

Сярод дасягненняў калектыву – дыплом Беларускай гандлёва-прамысловай палаты за высокія паказчыкі ў экспарце прадукцыі ў 2017 годзе. Закрытае акцыянернае таварыства неаднаразова ўзнагароджвалася дыпломам конкурсу «Лепшы экспарцёр» у намінацыі «Сельская гаспадарка».

У 2020 годзе прадпрыемства ўключана ў рэестр суб'ектаў гаспадарання Рэспублікі Беларусь, дзе яно прадстаўлена як сумленны і надзейны партнёр для прадпрымальніцкай дзейнасці ў нашай краіне і за яе межамі. У 2021 годзе акцыянернае таварыства ўключана ў рэестр папячыцелей Беларускага таварыства памяці воінаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.











## Сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «Еўратарэкс»

Ужо ў першыя гады работы СЗАТ «Еўратарэкс» выпускала да мільёна поліпрапіленавых тканых мяхоў для ўпакоўкі цукру. Далейшыя мадэрнізацыі на прадпрыемстве: адкрыццё ў 2005 годзе новай лініі па вытворчасці мяхоў, рэалізацыя ў 2009-м інвестыцыйнага праекта па нарошчванні вытворчых магутнасцей – дазволілі павялічыць выпуск прадукцыі да 23 млн мяхоў на год. А паляпшэнню яе якасці садзейнічалі ўвядзенне ў эксплуатацыю ў 2012 годзе сховішча для сыравіны і гатовай прадукцыі і запуск у 2015-м лініі па вытворчасці ўласнага ўкладыша і рулоннай машыны для друку на поліпрапіленавым тканым палатне.

Сёння прадпрыемства вядома ў краіне і за яе межамі. Уся яго прадукцыя сертыфікавана па СТБ Дзяржаўнага стандарту Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага стандарту Расійскай Федэрацыі. Таксама атрыманы сертыфікаты адпаведнасці сістэме кіравання аховай працы СТБ ISO 45001–2020 і сертыфікат «Халяль» ААТ «БелХаляль».

У 2020 годзе ўведзена праграма комплекснага пераабсталявання вытворчасці прадпрыемства.





# ГАНДАЛЬ І ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

Апошнім часам на Нясвіжчыне хуткімі тэмпамі развіваецца такі сегмент рынку, як гандаль. Абслугоўванне насельніцтва раёна ажыццяўляюць **звыш 1 252 суб'ектаў гаспадарання**, з іх 225 – юрыдычныя асобы, 1 027 – індывідуальныя прадпрымальнікі.

На плошчы 26 тыс. м$^2$ размешчана каля **470 аб'ектаў рознічнага гандлю**. Жыхароў сельскіх населеных пунктаў таксама абслугоўваюць аўталаўкі і аўтамагазіны.

Актуальнай для Нясвіжа, які штогод прымае сотні тысяч турыстаў, з'яўляецца арганізацыя грамадскага харчавання. У раёне адкрыты 128 аб'ектаў харчавання амаль на 4 721 пасадачнае месца, у тым ліку ў агульнадаступнай сетцы – каля 2 046.

- **94 %** – рознічны тавараразварот арганізацый гандлю.
- **64,9 %** – доля рэалізацыі харчовай групы ў агульным аб'ёме тавараразвароту.
- **35,1 %** – доля рэалізацыі прамысловай групы ў агульным аб'ёме тавараразвароту.

Фірменны гандаль прадстаўляе сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Агракамбінат «Сноў».








Колькасць магазінаў і аб'ектаў грамадскага харчавання з кожным годам павялічваецца. Гэта стварае здаровую канкурэнцыю і стымулюе прадпрыемствы да правядзення акцый, распродажаў харчовых і нехарчовых тавараў, адзіных дзён скідак, кірмашоў, святочнага і выязнога гандлю.

Актыўна развіваюцца прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу. У цяперашні час у раёне ажыццяўляюць сваю дзейнасць **больш за 1 027 індывідуальных прадпрымальнікаў і 225 малых і сярэдніх прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці**. Іх адлічэнні складаюць амаль пятую частку ад паступленняў у кансалідаваны бюджэт раёна.

Асноўныя віды дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб недзяржаўнай формы ўласнасці: фармацэўтыка, рознічны і аптовы гандаль, будаўніцтва, транспартныя і бытавыя паслугі і інш.







# БУДАЎНІЦТВА

## У ходзе гісторыі

Пасля вызвалення раёна ад гітлераўскіх захопнікаў жыхары Нясвіжчыны з энтузіязмам сталі аднаўляць свой край: перш за ўсё ўзводзіць новыя дамы і прадпрыемствы, аб'екты адукацыі, сацыяльна-культурнага прызначэння. За пасляваенныя гады ў раёне з'явілася 826 дамоў, на гэтыя работы дзяржава адпусціла 16 566 м$^3$ лесаматэрыялаў і 661 тыс. рублёў.

Але найбольшыя аб'ёмы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва галіна паказала ў 1960–1970-я гады. У Гарадзеі адчынілі свае дзверы Палац культуры ільнозавода, школа, клуб у пасёлку цукровага завода, быў закладзены падмурак універмага і кінатэатра. Пачалі працаваць школа ў в. Астроўкі, дзіцячы сад у Ганусаўскай доследнай станцыі, завяршылася электрыфікацыя жылля і гаспадарчых аб'ектаў у калгасах «Імя Дзяржынскага», «Слава», саўгасах «Друцкаўшчына», «Буракаводчы».

Значны ўклад у будаўніцтва аб'ектаў раёна ўнесла **Нясвіжская перасоўна-механізаваная калона-218 (ПМК-218)**, створаная ў 1959 годзе пры долевым удзеле 16 калгасаў-пайшчыкаў для вядзення сельскага будаўніцтва. За гады існавання арганізацыяй пабудавана ў раёне каля 500 аб'ектаў. Менавіта яе калектыў адным з першых перайшоў на новыя метады планавання і эканамічнага стымулявання, пачаў укараняць перадавыя тэхналогіі, стварыў спецыялізаваныя і комплексныя брыгады, стаў выкарыстоўваць комплексны падыход у сельскім будаўніцтве. Прыкладам якаснай працы ПМК з'яўляецца в. Сноў, якая ў 1975 годзе была аднесена да ліку лепшых сельскіх пасёлкаў у СССР.

За высокія тэмпы і якасць работ будаўнікі неаднаразова адзначаліся ўрадам. Былы старшыня ПМК-218 Міхаіл Карвіга, па ініцыятыве якога ажыццяўляліся работы па эксперыментальных праектах, укаранялася навуковая арганізацыя працы, неаднойчы атрымліваў высокія ўзнагароды, яму прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Нясвіжа». Зараз ПМК-218 з'яўляецца даччыным будаўнічым прадпрыемствам Мінскага абласнога вытворчага праектна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаблсельбуд».



Будаўніцтва цукровага завода ў Гарадзеі





Шмат аб'ектаў у Нясвіжскім раёне пабудавала і **ПМК-217**. А ў 1965 годзе **ПМК-1** было ўзведзена 10 электрычных падстанцый. Адкрылася паветраная лінія Мінск – Нясвіж. У горадзе з'явіліся камбінат бытавога абслугоўвання, раённы Дом культуры, прадуктовы магазін на Новым месцы, а таксама 25 новых вуліц.

У лістападзе 1970 года было прынята рашэнне аб стварэнні **перасоўнай механізаванай калоны № 23 трэста «Салігорсквадбуд»** (зараз – **ААТ «Нясвіжскае ПМК-23»**), а 1 студзеня 1971 года прадпрыемства ўжо працавала.

Няпроста прыйшлося будаўнікам у 1980–90-я гады мінулага стагоддзя, асабліва пасля распаду СССР. Але кіраўніцтва раёна і профільных арганізацый здолела захаваць матэрыяльную базу, спецыялістаў. Па тэмпах і аб'ёмах засваення капітальных укладанняў і жыллёвага будаўніцтва галіна выйшла на вядучае месца ў Мінскай вобласці. Менавіта ў гэтыя гады ўзводзіўся завод па вытворчасці безалкагольных напіткаў у Нясвіжы, адбывалася рэканструкцыя Гарадзейскага цукровага камбіната, завода медыцынскіх прэпаратаў, ільнозавода, крухмальнага завода, хлебазавода, швейнай фабрыкі. З'явілася шмат аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння.

















З 1985 года акцэнт быў зроблены на развіццё сацыяльнай сферы, будаўніцтва жылля, аб'ектаў аховы здароўя, культуры, фізічнай культуры і спорту. З'явіліся новы мікраараён у Нясвіжы на 446 кватэр, школа на 1 250 месцаў, дзіцячы сад на 260 месцаў, універсам, танцавальная пляцоўка і інш.

Дынамічна развівалася будаўніцтва ў раёне Сельгастэхніка і індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. У 1990-я штогод здавалася ў эксплуатацыю больш за 200 дамоў сядзібнага тыпу, а за 2 дзесяцігоддзі для жыхароў раёна створана больш за 1 500 дамоў і кватэр.

Значныя аб'ёмы работ выкананы па комплексным добраўпарадкаванні горада да Дня беларускага пісьменства і друку (1997 год) і рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі» (1998 год). Рэканструяваны ратуша і плошча ля яе, адміністрацыйны будынак райвыканкама, будынак народнага прадпрыемства «Дабрабыт», гасцініца «Нясвіж» і шэраг іншых аб'ектаў. Усяго было асвоена 300 млрд рублёў.

23 чэрвеня 1997 года на Нясвіжчыну абрынуўся моцны ўраган. У выніку стыхіі было траўміравана 11 чалавек, пацярпела 119 населеных пунктаў, пашкоджана 508 жылых дамоў, 321 вытворчы аб'ект, з якіх 17 поўнасцю разбураны. Агульная сума страт склала 96,5 млрд рублёў. Асноўныя работы па аднаўленні і рамонце завяршылі да 1 жніўня. Значную дапамогу матэрыяламі пры гэтым аказалі рэспубліканскі і абласны бюджэты, жыхары Бранскай вобласці.

Зараз будаўнікі Нясвіжчыны, абапіраючыся на традыцыі старэйшых пакаленняў, узводзяць новыя аб'екты, прымяняюць сучасныя тэхналогіі, матэрыялы і стандарты галіны. Сярод прадпрыемстваў Нясвіжчыны гэтага напрамку варта адзначыць ААТ «Нясвіжская ПМК-23».





# Сучасны стан

## Адкрытае акцыянернае таварыства «Нясвіжская ПМК-23»



ААТ «Нясвіжская ПМК-23» мае шматгадовы вопыт у будаўнічай і меліярацыйнай галінах. Арганізацыя займаецца эксплуатацыяй (абслугоўваннем) меліярацыйных сістэм і асобна размешчаных гідратэхнічных збудаванняў, выконвае рэканструкцыю і рамонт меліярацыйных сістэм, культуртэхнічныя мерапрыемствы. Ажыццяўляе будаўніцтва аб'ектаў жыллёва-камунальнага і бытавога прызначэння, а таксама сетак водаправода і каналізацыі, іншых інжынерных камунікацый.

Якасная і добрасумленная работа калектыву ААТ «Нясвіжская ПМК-23» неаднаразова адзначалася ганаровымі граматамі і дыпломамі Нясвіжскага райвыканкама, вышэйстаячых арганізацый.


САЛЮТ

# РАЁННАЕ ЎНІТАРНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА «НЯСВІЖСКАЯ ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА»



Жыллёва-камунальная гаспадарка (ЖКГ) Нясвіжа **створана ў 1944 годзе як аддзел райкамунгаса**.

Насычанымі і багатымі на пазітыўныя змены аказаліся для работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі 80–90 гады мінулага стагоддзя. У 1984 годзе ў Нясвіжы былі ўведзены ў эксплуатацыю збудаванні, якія значна палепшылі тэхналогію ачышчэння сцёкаў.

У кастрычніку 1986-га для больш эфектыўнай эксплуатацыі водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і забеспячэння вадой райцэнтра створана **Нясвіжскае вытворчае прадпрыемства водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі**.

Першы водаправод у Нясвіжы быў пракладзены ў 1964 годзе. Яго працягласць складала 37 км, каналізацыі – 20,6 км. Было прабурана сем артэзіянскіх свідравін магутнасцю 3 350 м$^3$ штосутачна.

У 1999 годзе пабудавана першая чарга водазабора «Вінклераўскі» і горад Нясвіж атрымаў якасную пітную ваду. Комплекс мер дазволіў палепшыць камунальнае абслугоўванне ва ўсіх населеных пунктах раёна.

У верасні 2000 года камбінат камунальных прадпрыемстваў быў перайменаваны ў **раённае ўнітарнае прадпрыемства «Нясвіжская ЖКГ»**. Праз тры гады да яго далучаны Нясвіжскі водаканал, рамонтна-будаўнічы ўчастак, спецыялізаванае будаўнічае прадпрыемства.







Сёння ў кампетэнцыі ЖКГ знаходзяцца кацельная гаспадарка, гасцініца, лазні ў Нясвіжы і Гарадзеі, спецаўтатранспарт, участкі жыллёва-эксплуатацыйны і дабраўпарадкавання, цеплавых сетак у аг. Сноў і г. п. Гарадзея і інш.

Праз пэўны час да прадпрыемства быў далучаны «Зелянбуд» і выведзены са структуры ўчастак «Вада і каналізацыя».

Штогод у горадзе **высаджваецца больш за 120 тыс. штук расады кветак і каля 1 140 дрэў**.



РУП «Нясвіжская ЖКГ» забяспечвае жыццядзейнасць прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, насельніцтва горада і раёна. Яно абслугоўвае 227 жылых дамоў агульнай плошчай 273,6 тыс. м$^2$ (з іх 198 шматкватэрных), 577 вуліц агульнай працягласцю 353,4 км, 50 адзінак цеплакрыніц, якія ажыццяўляюць выпрацоўку цеплавой энергіі і перадачу яе спажыўцам па 54,2 км цеплавых сетак (парк рэспубліканскага значэння плошчай 117,63 га).







# СФЕРА ПАСЛУГ

## Адлік гісторыі



Аблягчыць чалавечае жыццё, зрабіць яго больш цікавым і дапамагчы памножыць свае зберажэнні – гэтым і займаецца сфера паслуг Нясвіжчыны, якая ў апошнія дзесяцігоддзі развіваецца вельмі дынамічна.

**Нясвіжскі раённы камбінат бытавога абслугоўвання (КБА)** пачаў адлік сваёй гісторыі з 1 кастрычніка 1960 года, а з 2000-га з'яўляецца адкрытым акцыянерным таварыствам.

Паслугі, якія прапаноўваў насельніцтву КБА, былі разнастайнымі і запатрабаванымі. Тут працавалі кансервавы, ткацкі, швейны, вязальны, шавецкі цэхі, цэх масавага пашыву, цырульня, фотамайстэрня, майстэрня па рамонце гадзіннікаў. Пазней адкрылася радыёмайстэрня, мэблевы і галантарэйны цэхі, а ў канцы 1960-х з'явіліся пракат, хімчыстка, бюро добрых паслуг. У сельскай мясцовасці былі адкрыты 23 комплексныя прыёмныя пункты.

У снежні 2017 года да прадпрыемства далучана УП «Нясвіжская швейная фабрыка».

Складаны для КБА перыяд наступіў у 90-я гады мінулага стагоддзя, пасля развалу СССР. Прыйшлося шукаць новыя формы работы, ад нечага пазбаўляцца, нешта набываць.

Немалаважную ролю ў жыцці адыгрывалі і крэдытна-грашовыя зносіны. Пасля Вялікай Айчыннай вайны дзейнасць **ашчаднай касы** ў Нясвіжы была адноўлена ў ліпені 1944 года. Першы яе калектыў – усяго шэсць чалавек – здолеў не толькі захаваць асноўную частку укладаў, але і забяспечыць прыток новых грашовых сродкаў.

Папулярнымі былі аперацыі з аблігацыямі, акрэдытывамі. Праз ашчадныя касы выплачвалі выйгрышы ў латарэю, персанальныя пенсіі, дзяржаўную дапамогу шматдзетным і адзінокім маці, прымалі аплату за кватэры. У 1970-я гады тут пачалі выдаваць заработную плату рабочым і служачым.

У кастрычніку 1995 года Ашчадны банк быў рэарганізаваны ў ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк».

**Аддзяленне Дзяржбанка** з'явілася ў Нясвіжы 1 жніўня 1944 года. У 1987 годзе яно было перайменавана ў аддзяленне Аграпрамбанка, а з 14 красавіка 2000 года – адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк» у Нясвіжы, з 22 красавіка 2017 года гэта цэнтр банкаўскіх паслуг (ЦБП).





## Наш час

Сёння сфера паслуг Нясвіжчыны прадстаўлена вялікай колькасцю прадпрыемстваў.

### Цэнтр банкаўскіх паслуг № 526 у г. Нясвіжы Рэгіянальнай дырэкцыі па Мінскай вобласці адкрытага акцыянернага таварыства «Белаграпрамбанк»

На працягу апошніх пяці гадоў ЦБП № 526 стабільна займае вядучыя пазіцыі ў выніковай рэйтынгавай адзнацы эфектыўнасці работы цэнтраў банкаўскіх паслуг 1-й катэгорыі Рэгіянальнай дырэкцыі па Мінскай вобласці ААТ «Белаграпрамбанк».

Па выніках 2018 года Нясвіжскі цэнтр быў занесены на Дошку гонару прадпрыемства як падраздзяленне, якое паказала найлепшыя паказчыкі ў рабоце, па выніках 2019-га – на Дошку гонару Рэгіянальнай дырэкцыі па Мінскай вобласці за забеспячэнне паказчыкаў карпаратыўнага і рознічнага бізнесу.

Зараз на банкаўскім абслугоўванні ЦБП знаходзіцца звыш 1 100 карпаратыўных кліентаў. Больш за 10 200 жыхароў Нясвіжа таксама аддаюць перавагу «Белаграпрамбанку».

Для зручнасці гасцей і жыхароў Нясвіжа ў 2013 годзе адкрыты дадатковы офіс ЦБП на базе абменнага пункта на вуліцы Савецкай. Тут можна аплаціць паслугі і здзейсніць валютна-абменныя аперацыі.





## Цэнтр банкаўскіх паслуг № 620 адкрытага акцыянернага таварыства «АСБ Беларусбанк» у г. Нясвіжы

На сённяшні дзень доля цэнтра банкаўскіх паслуг № 620 у абслугоўванні юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў рэгіёна складае больш за 50 %. ЦБП працуе з ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат», ААТ «Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў», ЗВУП «Мед-інтэрпласт», СВК «Агракамбінат «Сноў» і інш. Усяго тут амаль 600 кліентаў. Доля аб'ёму крэдытнага партфеля юрыдычных асоб – каля 60 %, па абслугоўванні экспартна-імпартных аперацый кліентаў на гандлёвым балансе рэгіёна – 30 %.

Банк займае лідзіруючыя пазіцыі па крэдытаванні насельніцтва, выпуску банкаўскіх плацёжных картак, сродках насельніцтва і іншых паказчыках.

Па выніках работы ў 2007 і 2020 гадах ЦБП № 620 было прызнана лепшым у рэспубліцы ў сваёй групе. У 2013 годзе нясвіжцы сталі «Лепшымі ў развіцці рознічнага бізнесу», а ў 2016-м – «Лепшымі ў развіцці карпаратыўнага бізнесу».












## Прадстаўніцтва «Белдзяржстраха» па Нясвіжскім раёне

Будынак, у якім зараз знаходзіцца прадстаўніцтва «Белдзяржстраха» па Нясвіжскім раёне, існуе з 1994 года. Дагэтуль кіраўніцтву прыходзілася арандаваць памяшканні ў гасцініцы, Доме піянераў, Нясвіжскім раённым выканаўчым камітэце. Аднак гэта не сказвалася на рабоце, бо галоўнае ў справе прадстаўніцтва – гэта людзі, іх жаданне і ўменне працаваць. Зараз калектыў тут складаецца з 27 чалавек, у тым ліку 12 страхавых агентаў.

Спектр паслуг, якія прапануе «Белдзяржстрах» жыхарам Нясвіжчыны, вельмі шырокі. Сёння гэта 10 абавязковых відаў страхавання і больш за 80 відаў добраахвотнага страхавання. Дабравольным з'яўляецца страхаванне маёмасных інтарэсаў грамадзян, асабістае страхаванне: медыцынскіх выдаткаў, ад няшчасных выпадкаў і захворванняў, небяспечных хвароб і г. д. Абавязковае – ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў; будынкаў, якія належаць грамадзянам; страхаванне з дзяржпадтрымкай ураджаю сельгаскультур, жывёлы, птушкі і інш.

Эканамічны патэнцыял дазваляе прадпрыемству страхаваць рызыку на любыя сумы, а сістэма накапляльных зніжак робіць працу прадстаўніцтва выгаднай для кожнага кліента.



## Адкрытае акцыянернае таварыства «Дабрабыт»

Сёння ААТ «Дабрабыт» – сучаснае прадпрыемства, якое аптымізуе сваю структуру, нарошчвае аб'ёмы вытворчасці, праводзіць тэхнічнае пераабсталяванне. У склад арганізацыі ўваходзяць цэх масавага пашыву, майстэрня па рамонце адзення і абутку, цырульня, рытуальны магазін, пункт пракату, пральня, тры комплексныя прыёмныя пункты ў вёсках Юшавічы, Астроўкі, Салтанаўшчына, магазін «Добры быт».



## Інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Нясвіжскім раёне

Інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Нясвіжскім раёне створана ў 1990 годзе. Пад кіраўніцтвам першага начальніка Яўгена Малайлы спачатку тут працавалі 10 чалавек.

З 2010 па 2020 год інспекцыю ўзначальваў Генадзь Ванагель, а з 2021 года на змену яму прыйшоў Ігар Кудрук.

За час існавання інспекцыі значна павялічылася колькасць яе супрацоўнікаў, плацельшчыкаў.

У 2017 годзе тут праведзена рэарганізацыя шляхам далучэння інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Клецкім раёне ў якасці ўпраўлення па рабоце з плацельшчыкамі па Клецкім раёне.







## Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Нясвіжская друкарня імя Сымона Буднага»

КУП «Нясвіжская друкарня імя Сымона Буднага» ажыццяўляе паліграфічную і выдавецкую дзейнасць. Да першай адносіцца выпуск газетнай, бланачнай, кніжна-часопіснай, рэкламнай, выяўленчай прадукцыі (у тым ліку банеры, буклеты, граматы, дыпломы і г. д. як на звычайнай паперы, так і на самаклейнай, на пластыку, ПВХ і інш.). Таксама друкарня займаецца нанясеннем выяў на тэкстыль, палімерныя матэрыялы, кераміку, метал, камень.

Ажыццяўляючы выдавецкую дзейнасць, друкарня выпускае вытворча-практычныя, даведачныя, літаратурна-мастацкія выданні, а таксама літаратуру для вольнага часу.

Вялікім попытам таксама карыстаюцца паштоўкі з элементамі фальгіравання і контурнай рэзкі.



## Дзяржаўная ўстанова «Рэдакцыя газеты «Нясвіжскія навіны»

Раённая газета «Нясвіжскія навіны» – гэта газета для несвіжан і пра несвіжан!

«Нясвіжскія навіны» сёння – гэта актуальная інфармацыя аб жыцці раёна, асноўных падзеях і людзях, якія жывуць на гэтай цудоўнай зямлі. Гэта больш за 60 розных рубрык і больш за 20 тэматычных старонак і праектаў. Гэта адлюстраванне ўсіх сфер нашай жыццядзейнасці і дыялог з чытачом, кампетэнтнае меркаванне спецыялістаў і карысныя парады.

Калектыў рэдакцыі з'яўляецца лаўрэатам нацыянальнага конкурсу «Залатая Ліцера», пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Крэпкая сям'я – моцная дзяржава», дыпламантамі конкурсу на лепшае асвятленне пытанняў міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, пераможцам абласных конкурсаў на лепшае асвятленне дзейнасці падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў унутраных спраў.



# ТРАНСПАРТ

## Па старонках мінулага

Нараджэнне Нясвіжскага аўтапарка цесна звязана з Цімкавіцкай (Капыльскі раён) машынна-трактарнай станцыяй. У 1958 годзе на яе базе стварылі Капыльскую аўтатранспартную калону (АТК), у якую ўваходзілі тры філіялы: у Нясвіжы, Гарадзеі і Уздзе. У АТК было 160 аўтамабіляў і 2 аўтобусы, у тым ліку ў Нясвіжскім філіяле – 27 аўтамабіляў. У 1962 годзе філіял Капыльскай аўтабазы № 9 рэарганізавалі ў Нясвіжскую аўтабазу № 17. У яе распараджэнні меліся 52 грузавыя аўтамабілі ЗІС-5, ЗІС-150, ГАЗ-51.



Пад аўтабазу была выдзелена тэрыторыя плошчай 3,5 га, якую ўдалося абсталяваць толькі праз год. Пазней тут з'явіліся і рамонтная майстэрня, кацельня, аўтастанцыя.

У 1971 годзе Нясвіжская і Клецкая аўтабазы аб'ядналі ў Нясвіжскі аўтакамбінат № 1. У 1976 годзе былі рэканструяваны і дабудаваны рамонтныя майстэрні, узведзены сучасны адміністрацыйна-бытавы комплекс, абсталяваны медпункт, стаматалагічны і фізіятэрапеўтычны кабінеты.

Аўтамабільным паркам № 8 прадпрыемства стала называцца ў 1987 годзе, а ў 2010-м адбылася яго рэарганізацыя ў **Філіял «Аўтапарк № 8» ААТ «Мінаблаўтатранс»**.

З 1 ліпеня 1963 года пачаў працаваць дарожна-эксплуатацыйны ўчастак (ДЭУ) № 168. Яго калектыў складаўся ўсяго з трох чалавек: начальніка, галоўнага інжынера і дарожнага майстра. Размяшчаўся ўчастак у фінскім доміку ў скверы па вуліцы Савецкай (ля Вострай брамы). У 1964 годзе гэты будынак згарэў, а работнікі арганізацыі пераехалі ў кантору ДЭУ-9, які пазней быў ліквідаваны, а тэрыторыя перададзена на баланс ДЭУ-168.

Праз чатыры з паловай гады з дня ўтварэння машынна-трактарны парк прадпрыемства складаўся ўжо з бульдозера ваеннага тыпу С-100, двух трактароў Т-40, аўтамабіля ГАЗ-5. Пагрузачных сродкаў не было, гравійна-пясчаныя сумесі перадавалі з эстакад.





ДЭУ-168 выступіла ініцыятарам будаўніцтва аўтапавільёнаў на аўтобусных прыпынках. У вёсках Квачы і Высокая Ліпа ў сувязі з такімі новаўводзінамі былі нават установлены рэпрадуктары радыёвяшчання. Пра гэта распавядае дакументальны фільм «Сялу – добрыя дарогі», які быў зняты ў 1971 годзе і дэманстраваў дарогі ДЭУ-168 у Нясвіжскім раёне. Аўтапавільёны прадпрыемства дэманстраваліся ў 1975 годзе на Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве. Пасля некалькіх перайменаванняў у 2005 годзе арганізацыя стала называцца **Філіял камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаблдарбуд» – «ДРБУ № 168»**.



У 1999 годзе ў Нясвіжскім раёне было створана **ДЭУ-65**, якое сфарміравалі на базе прарабскага ўчастка ДЭУ-57 г. Слуцка для рамонту і абслугоўвання дарог рэспубліканскага прызначэння.

## Галіна сёння

Транспартная галіна раёна прадстаўлена сёння наступным шэрагам прадпрыемстваў.



## Філіял «Аўтапарк № 8» адкрытага акцыянернага таварыства «Мінаблаўтатранс»

Асноўнай транспартнай арганізацыяй Нясвіжскага раёна з'яўляецца Філіял «Аўтапарк № 8» ААТ «Мінаблаўтатранс». Яго рухомы састаў налічвае **25 аўтобусаў, 18 вялікагрузных машын і 5 аўтамабіляў гаспадарчага прызначэння**.

Прадпрыемства ажыццяўляе перавозкі пасажыраў па **43 прыгарадных, 6 гарадскіх і 4 міжгародніх маршрутах**, прымае заказы на аўтобусныя перавозкі па Беларусі і Расіі, а таксама ажыццяўляе дастаўку грузаў. На рэгулярных аўтобусных маршрутах функцыянуе аўтаматызаваная сістэма дыспетчарскага кіравання.

Зараз на прадпрыемстве працуюць 106 чалавек, у тым ліку 43 кіроўцы, 36 рамонтных і іншых рабочых, 27 чалавек інжынерна-тэхнічнага персаналу і служачых.




Вялікая ўвага ўдзяляецца паляпшэнню ўмоў працы і адпачынку работнікаў аўтапарка. На прадпрыемстве ёсць душавыя, пральня для мыцця спецвопраткі, пакой для прыёму ежы.

У 2020 годзе філіял стаў пераможцам першага этапу рэспубліканскага конкурсу па скарачэнні выкідаў ад механічных транспартных сродкаў сярод аналагічных прадпрыемстваў.







## Філіял камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаблдарбуд» – «ДРБУ № 168»

Сёння арганізацыя забяспечвае будаўніцтва, рэканструкцыю, капітальны і бягучы рамонты гарадскіх і сельскіх дарог Нясвіжчыны, а таксама ажыццяўляе вытворчасць матэрыялаў для ўласных работ, аказвае платныя паслугі насельніцтву.

У арсенале дарожнікаў – сучасная тэхніка і высокакваліфікаваныя кадры. Усяго ў калектыве працуе **112 чалавек**. Працягласць дарог, якія абслугоўвае філіял, – **390,1 км**. У арганізацыі маецца асфальтабетонная база «Пагулянка», а таксама швейны цэх, дзе вырабляецца адзенне для работнікаў арганізацыі і філіялаў КУП «Мінскаблдарбуд».




## Філіял «Дарожна-эксплуатацыйнае ўпраўленне № 65» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства аўтамабільных дарог «Мінскаўтадар-Цэнтр»

Асноўны напрамак дзейнасці прадпрыемства – рамонт і абслугоўванне аўтадарог рэспубліканскага значэння працягласцю **300,826 км** у чатырох раёнах Мінскай вобласці, у тым ліку ў Нясвіжскім раёне – 100,691 км: Р-11 Парачаны – Навагрудак – Нясвіж, Р-54 Пяршаі – Івянец – Нясвіж, Р-91 Асіповічы – Баранавічы, Р-12 Нясвіж – Клецк, Р-107 Нясвіж – Цімкавічы, пад'езд ад аўтадарогі Р-91 Асіповічы – Баранавічы да аўтадарогі Р-11 Парачаны – Навагрудак – Нясвіж (паўночны абход горада).

Абавязкаў у працаўнікоў шмат: устаноўка дарожных знакаў, нанясенне гарызантальнай разметкі з выкарыстаннем разметачнай эмалі і халоднага пластыку, правядзенне ямачнага рамонту з прымяненнем установак струменна-ін'екцыйнага тыпу, пракладка труб пад дарожным палатном, рамонт мастоў і г. д. Акрамя таго, прадпрыемства вырабляе бітумную эмульсію і пясчана-жвіровыя сумесі, якія рэалізуе іншым арганізацыям.



# СУВЯЗЬ

## Першыя крокі

Гісторыя развіцця сродкаў сувязі ў раёне пачынаецца 6 верасня 1795 года, калі ў Нясвіжы запрацавала паштовая станцыя, якая налічвала 7 паштальёнаў, мела ў распараджэнні 35 коней.

Праз горад і яго наваколле праходзіў паштовы пуць з Масквы праз Талачын, Мінск, Нясвіж да Вены, а такса-ма праз Слуцк і Бабруйск на Рагачоў. Праз тэрыторыю цяперашняга раёна ішлі дарогі ад Мінска да Роўна, ад Нясвіжа праз Навагрудак у Ліду і ад Навагрудка ў Слонім.

У XIX стагоддзі ў Нясвіжы быў утвораны заезны двор на вуліцы Студэнцкай (цяпер – Ленінская, 10). У гэтым будынку да 2002 года знаходзіліся пошта і вузел сувязі. Зараз тут працуе толькі пошта.

1 кастрычніка 2018 года Нясвіжскі вузел паштовай сувязі набыў статус рэгіянальнага (з Клецкім участкам паштовай сувязі ў складзе), а з 1 студзеня 2022 года стаў **участкам паштовай сувязі Слуцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Мінскага філіяла РУП «Белпошта»**.

А вытокі электрасувязі ў Нясвіжы ідуць з пачатку мінулага стагоддзя. У 1925 годзе быў выпушчаны тэлефонны даведнік, у якім знаходзілася шмат тэлефонаў прыватных майстроў: цырульнікаў, краўцоў, цесляроў і г. д. Але сапраўднае развіццё атрымала тэлефонная сувязь падчас савецкай улады, у пасляваенны час.

У сярэдзіне ХХ стагоддзя са з’яўленнем у горадзе тэлефонных камутатараў пачалі ўстанаўліваць тэлефоны ў сельскай мясцовасці.

Вялікай папулярнасцю ў жыхароў вёскі карысталася радыёсетка. З яе дапамогай людзі знаёміліся з навінамі, слухалі аўдыёспектаклі і іншыя цікавыя перадачы. У 1954 годзе мясцовая газета паведамляла, што ўжо сем калгасаў радыёфікаваны, а два маюць і будуюць уласныя электрастанцыі.

З кожным годам «гаспадарка» Нясвіжскага вузла электрасувязі прырастала: з’яўляліся новыя віды паслуг і абсталявання, персанал штогод павышаў кваліфікацыю.

23 чэрвеня 1997 года на Нясвіжчыну абрынуўся моцны ўраган, які пашкодзіў 22 км ліній электрасувязі. Спецыялісты прадпрыемства хутка і якасна ліквідавалі пашкоджанні.







# У сучасным выглядзе

Цяпер тэлефоны, у якіх нумар набіраўся пры дапамозе дыска, можна пабачыць толькі ў кіно. А ў наша стагоддзе хуткасцей і магчымасцей нават цяжка ўявіць, якія прыемныя сюрпрызы ў гэтай галіне можа падрыхтаваць заўтрашні дзень. І з імі працуюць сучасныя прадпрыемствы сувязі Нясвіжа і Нясвіжскага раёна.

## Нясвіжскі ўчастак паштовай сувязі

У Нясвіжскі ўчастак паштовай сувязі Слуцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Мінскага філіяла РУП «Белпошта» ўваходзяць 18 сельскіх аддзяленняў паштовай сувязі, 3 гарадскія, 1 перасоўнае і 1 пункт паштовай сувязі.

Іх калектывы забяспечваюць высакаякаснае аказанне паштовых паслуг, трымаючы арыенцір на задавальненне патрэб спажыўцоў. За гэтым стаіць карпатлівая праца кожнага супрацоўніка, які прафесійна выконвае сваю работу.





## Нясвіжскі занальны вузел электрасувязі Мінскага філіяла рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белтэлекам»

Нясвіжскі занальны вузел электрасувязі аказвае каля 60 відаў паслуг электрасувязі рознай накіраванасці, уключаючы мясцовую, міжнародную, міжгароднюю тэлефонную сувязь, сувязь з таксафонаў, радыёсувязь, даведачна-інфармацыйныя, сэрвісна-інфармацыйныя паслугі і паслугі аўтаінфарматара (рэалізуюцца на базе цэха апрацоўкі выклікаў), перадачу дадзеных, доступ у інтэрнэт, аб'яднанне карпаратыўных сетак па IP-пратаколе.

У 2006 годзе тут была запушчана новая тэлекамунікацыйная паслуга ZALA і высакахуткасны інтэрнэт ByFly. Укаранёныя такія віды паслуг, як «Відэакантроль», «Разумны дом», распрацаваны новыя тарыфы лінейкі «ЯСНА», «СЯМЕЙНЫ». Праведзена мадэрнізацыя старых сетак шматкватэрнага жылога сектара ў Нясвіжы і Гарадзеі шляхам выкарыстання тэхналогіі пасіўных аптычных сетак (GPON) з магчымасцю падключэння інтэрнэту ByFly на хуткасці 200 Мбіт/с і інтэрактыўнага тэлебачання ZALA ў фармаце HD.

На цяперашні час пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю сотні кіламетраў валаконна-аптычных ліній сувязі. Увесь гарадскі шматкватэрны сектар забяспечаны тэхналогіяй GPON.

Таксама работнікі Нясвіжскага вузла электрасувязі абслугоўваюць амаль 20 тыс. тэлефонных апаратаў.








# ПАЛІЎНА-ЭНЕРГЕТЫЧНЫ КОМПЛЕКС

## Як усё пачыналася…

Першая гарадская электрастанцыя з'явілася ў заходняй частцы Нясвіжа ў **1931 годзе** для асвятлення замка, Фарнага касцёла, ратушы і іншых аб'ектаў і была разбурана падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Ужо ў пасляваенныя гады энергетыка Нясвіжчыны пачала развівацца паскоранымі тэмпамі. Так, у 1950 годзе ў в. Круты Бераг была пабудавана малая гідраэлектрастанцыя з генератарам магутнасцю 35 кВт. Праз восем гадоў уведзена ў эксплуатацыю падстанцыя (ПС) 110/35/6 кВ «Гарадзея» і запітаная з яе ПС 35/10 кВ «Нясвіж» з трансфарматарам магутнасцю 560 кВА.

У 1959 годзе пачаў сваю працу **Нясвіжскі электрасеткавы ўчастак**. У гэты ж час была запушчана электрыфікацыя сельскай гаспадаркі, актыўна будаваліся паветраныя лініі 0,4–10 кВ, трансфарматарныя падстанцыі, комплектныя падстанцыі. Тэхнікі не хапала, апоры ставілі ўручную. 1961 год стаў перыядам завяршэння будаўніцтва ПС 35/10 кВ «Сноў», а 1963 год – часам увядзення ў эксплуатацыю ПС 35/10 кВ «Затур'я».

У 1960 годзе Мінскімі абласнымі электрасеткамі ў рэгіёне была пабудавана паветраная лінія электраперадачы 110 кВ Гарадзея – Дзяржынск – Стоўбцы. А са снежня 1962 года Нясвіжскі электрасеткавы ўчастак знаходзіўся ў складзе Мінскіх абласных электрычных сетак і імкліва развіваўся. У гэты час урад прыняў шэраг пастаноў, накіраваных на інтэнсіфікацыю электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і аднаўлення сетак за кошт бюджэту.



**Раённыя электрычныя сеткі. Работнікі перад выездам на працоўнае месца**

**Стаўбцоўскае прадпрыемства электрычных сетак**, у склад якога ўвайшлі Стаўбцоўскі, Дзяржынскі, Клецкі, Нясвіжскі і Уздзенскі электрасеткавыя раёны, было створана ў 1967 годзе. З 1980-х пачалі працаваць ПС 110 кВ «Нясвіж» і ПС 35 кВ «Лань».

На 60-я гады мінулага стагоддзя прыйшлася актыўная газіфікацыя рэспублікі. Прычым Нясвіжскі раён стаў адным з першых газіфікаваных у Беларусі. У г. п. Гарадзея была створана **кантора газазабеспячэння**, якая падпарадкоўвалася трэсту «Мінгаз». Першым яе аб'ектам стаў Гарадзейскі цукровы завод, у гэтым жа годзе газ падалі ў мясцовы жылы пасёлак і цеплаэлектрацэнтраль.

У 1963 годзе пабудавана 3,2 км газаправода высокага ціску і два шафныя рэгулятарныя пункты (ШРП), 2,6 км газаправода нізкага ціску для газіфікацыі Сноўскага крухмальнага завода і жылых дамоў в. Сноў.

У 1964 годзе Гарадзейская кантора была перайменавана ў **Нясвіжскую эксплуатацыйна-мантажную кантору**, у 1965-м яна пераехала ў Нясвіж.

Пачалася газіфікацыя райцэнтра. Першымі пабачылі змены кацельні санаторыя «Нясвіж», воінскай часці, а таксама малочны завод і жылыя дамы па вуліцах Савецкай і 17 Верасня.

У 1987 годзе ўведзены ў эксплуатацыю першы поліэтыленавы газаправод высокага ціску, пабудаваны метадам стыкавай зваркі працягласцю 3,24 км на ўчастку ад урэзкі на газаразмеркавальнай станцыі «Любкаўшчына» Стаўбцоўскага да ШРП в. Куноса Нясвіжскага раёна. А ў жніўні 2002-га – першы ў краіне поліэтыленавы газаправод сярэдняга ціску ў в. Лявонавічы Нясвіжскага раёна працягласцю 10,62 км, створаны па нямецкай тэхналогіі (з дапамогай электрамуфт), для газіфікацыі жылых дамоў.

Нясвіжчына забяспечвае таксама бесперабойную транспарціроўку і падачу газу спажыўцам Беларусі і Заходняй Еўропы. Гэтым займаецца **Нясвіжскае ўпраўленне магістральных газаправодаў (УМГ) ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь»**, арганізаванае ў снежні 1978 года. Другая чарга кампрэсарнай станцыі «Нясвіж» уведзена ў эксплуатацыю ў 1982 годзе. У гэты ж час на базе Нясвіжскага лінейнага вытворчага ўпраўлення магістральных газаправодаў створаны аварыйна-ратавальны цягнік, які да 2009 года быў адзіным у ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь».

Менавіта ў філіяле «Нясвіжскае УМГ» пачаў свой шлях па беларускай зямлі транскантынентальны газаправод «Ямал – Еўропа»: у 1996 годзе запусцілі яго будаўніцтва, а 21 верасня адбыўся ўвод у эксплуатацыю ўчастка працягласцю 209 км (кампрэсарная станцыя «Нясвіжская» – дзяржаўная мяжа з Польшчай).

30 снежня 1999 года пачала работу кампрэсарная станцыя «Нясвіжская» з газатурбіннымі рухавікамі магутнасцю 16 МВт, аналагаў якой не было ў СНД.








# Поспехі новага дня

Сучасны паліўна-энергетычны комплекс Нясвіжчыны прадстаўлены наступным шэрагам прадпрыемстваў.

## Нясвіжскі раён электрычных сетак філіяла «Стаўбцоўскія электрычныя сеткі» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскэнерга»

Сёння Нясвіжскі раён электрычных сетак – сучаснае прадпрыемства, укамплектаванае высокакваліфікаванымі кадрамі і абсталяванае неабходнай спецыяльнай тэхнікай. Гэта дазваляе надзейна, бесперабойна і эканамічна эксплуатаваць складанейшае электратэхнічнае абсталяванне, забяспечваць народную гаспадарку і насельніцтва электраэнергіяй.

Укараненне аўтаматызаваных сістэм кіравання тэхналагічнымі працэсамі падтрымлівае іх надзейную і эканамічную работу. Шмат гадоў працуе і ўдасканальваецца аўтаматызаваная сістэма кантролю і ўліку электраэнергіі. Паскоранымі тэмпамі ў раёне ідзе замена абсталявання, устаноўленага ў 60–80 гады мінулага стагоддзя.

У 2004-м каманда аператыўна-рамонтнага персаналу размеркавальных сетак прызнана пераможцай абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў «Лепшы па прафесіі», заняла II месца ў I Міжнародных спаборніцтвах прафесійнага напрамку.







## Нясвіжскі раён газазабеспячэння вытворчага ўпраўлення «Стоўбцыгаз»

Сёння ў Нясвіжскім раёне газіфікавана 100 % населеных пунктаў, налічваецца 21 090 спажыўцоў блакітнага паліва, а агульная даўжыня газавых сетак складае 914 км.

У снежні 2021 года ў адміністрацыйным будынку філіяла «Нясвіжскі раён газазабеспячэння» вытворчага ўпраўлення «Стоўбцыгаз» па вуліцы Кутузава пачаў працаваць новы цэнтр абслугоўвання насельніцтва, у якім прадугледжана ўсё, што можа быць неабходна кліентам. Абсталяваны тры вокны, у якіх па электроннай чарзе з дапамогай спецыялістаў прадпрыемства можна вырашыць усе пытанні, не заходзячы ў адміністрацыйнае памяшканне. Маецца нават месца, дзе можна бавіць час дзецям, пакуль бацькі чакаюць у чарзе або размаўляюць з супрацоўнікамі.

**Колькасць газіфікаваных прыродным газам населеных пунктаў Нясвіжскага раёна:**



| | |
|---|---|
| 1965 год | 3 |
| 1970 год | 9 |
| 1980 год | 21 |
| 1990 год | 41 |
| 2000 год | 59 |
| 2010 год | 63 |
| 2020 год | 73 |
| 2023 год | 74 |



## Філіял «Нясвіжскае ўпраўленне магістральных газаправодаў» адкрытага акцыянернага таварыства «Газпрам трансгаз Беларусь»

Нясвіжскае ўпраўленне магістральных газаправодаў забяспечвае значную частку ўсёй транспарціроўкі газу ў краіне. Аб'екты філіяла размешчаны ў 14 раёнах Мінскай, Брэсцкай, Гродзенскай абласцей. За час існавання арганізацыяй пабудаваны 24 газаразмеркавальныя станцыі, на якіх устаноўлена сучасная сістэма тэлемеханікі, што адказвае за іх стабільнае функцыянаванне. Спажыўцам пастаўлены сотні мільярдаў кубаметраў газу.

Кіраўніцтва ўпраўлення ўдзяляе вялікую ўвагу рашэнню сацыяльных праблем: пабудаваны два 40-кватэрныя і адзін 18-кватэрны жылыя дамы, узведзена спартыўная пляцоўка, штогод уносяцца сродкі на развіццё Нясвіжа. У прадпрыемства ёсць свае магазін-кафетэрый, сталовая, спартыўная і трэнажорная залы.







# КАБ БЫЛІ ШЧАСЛІВЫМІ ЛЮДЗІ: САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА

## Ахова здароўя

У 1944 годзе, адразу пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, аднавіла сваю работу Нясвіжская раённая бальніца на 40 ложкаў. У той жа час адкрылася і Сейлавіцкая ўрачэбная амбулаторыя, а ў 1945 годзе – Сноўская і Гарадзейская бальніцы на 10 ложкаў кожная, у 1946-м – Ланская ўрачэбная амбулаторыя. У прыстасаваных памяшканнях пачалі працаваць фельчарска-акушэрскія пункты.

1946 год паклаў пачатак станаўленню і развіццю санітарнай службы ў раёне. У 1950-я гады яе асноўнымі задачамі з'яўляліся барацьба з інфекцыйнымі захворваннямі і работа па імунапрафілактыцы дзіцячых і іншых інфекцый, паколькі ў азначаны перыяд рэгістравалася высокая колькасць выпадкаў дыфтэрыі, адру, коклюшу, паратыту, шкарлятыны, фіксаваліся поліяміэліт, успышкі тыфу. Ствараліся спецыяльныя медыцынскія брыгады, якія праводзілі падворны ўлік дзяцей да 12 гадоў і рабілі прышчэпкі ад небяспечных захворванняў.

У 1952 годзе раённую бальніцу перавялі ў больш прыдатны для дзейнасці будынак. Установа была разлічана на 150 ложкаў, для пацыентаў функцыянавалі фізіятэрапеўтычны, рэнтгеналагічны, зубаўрачэбны і зубапратэзны кабінеты.







Міжраённае ўралагічнае аддзяленне Нясвіжскай раённай бальніцы на 40 ложкаў працуе з 1969 года. У ім выконваўся ўвесь спектр профільных умяшанняў, уключаючы складаныя рэканструкцыйныя аперацыі на верхніх мачавых шляхах і органах малога таза. У аддзяленні ў 1995 годзе ўпершыню ў Рэспубліцы Беларусь зроблена ілеацыстапластыка (стварэнне штучнага мачавога пузыра з тонкай кішкі).

У верасні 1973 года Нясвіжскую цэнтральную раённую бальніцу перавялі ў новыя памяшканні па вуліцы Сыракомлі, 29. Пашырэнне плошчаў дазволіла разгарнуць 400 ложкаў у стацыянары і размясціць паліклініку на 430 наведванняў за змену.

У 1979 годзе да 60 ложкаў павялічыўся радзільны дом, пачала работу жаночая кансультацыя пры ім. Акрамя таго, быў здадзены будынак для Гарадзейскай гарадской бальніцы на 100 ложкаў і рэканструявана Сноўская ўчастковая бальніца на 75 ложкаў. У 1988 годзе падрыхтавана тыпавое памяшканне для Аношкаўскай урачэбнай амбулаторыі. У студзені 2006 года на базе Астроўскага фельчарска-акушэрскага пункта адкрыта Астроўская амбулаторыя, а ў лютым 2009-га – Ударненская.

З 2007 года на базе Гарадзейскай гарадской бальніцы разгарнулі міжраённае аддзяленне рэабілітацыі на 30 ложкаў.

У 2010–2011 гадах уведзены ў эксплуатацыю новыя будынкі Сноўскай і Ланскай амбулаторый.

Працуюць міжраённыя спецыялізаваныя аддзяленні: уралагічнае, медыцынскай рэабілітацыі, гемадыялізу, трансфузіялогіі, а таксама кабінеты (мамаграфічны, рэнтгенакамп'ютарнай дыягностыкі).








**Медыцынскія ўстановы Нясвіжскага раёна:**

- Нясвіжская ЦРБ (261 ложак і 530 наведванняў за змену);
- Гарадзейская гарадская бальніца (80 ложкаў і 150 наведванняў за змену);
- амбулаторыі ўрача агульнай практыкі: Сноўская (100 наведванняў за змену), Ланская (30), Лявонавіцкая (20), Аношкаўская (80), Астроўская (20), Сейлавіцкая (30), Ударненская (25), Ліпская (25).

На тэрыторыі раёна адкрыты 15 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, кожны з якіх абслугоўвае ў сярэднім 548 чалавек. Пастаянна ўдасканальваецца аказанне медыцынскай дапамогі: абнаўляецца матэрыяльна-тэхнічная база, праводзяцца высокатэхналагічныя і складаныя аперацыйныя ўмяшанні, працягваецца інфарматызацыя і развіццё праграмы лічбавага здароўя.




У Нясвіжскай ЦРБ працуюць 867 чалавек: 132 урачы, 415 работнікаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй, 320 чалавек малодшага і іншага персаналу.

У 2021 годзе Нясвіжская раённая бальніца сярод устаноў аховы здароўя Рэспублікі Беларусь у ліку першых паспяхова прайшла медыцынскую акрэдытацыю з атрыманнем пасведчання па ўсіх заяўленых профілях.

У рамках рэалізацыі праекта «Экстраннае рэагаванне на COVID-19 у Рэспубліцы Беларусь» у Нясвіжы з'явіўся камп'ютарны тамограф.

Для абслугоўвання сельскага насельніцтва ў 2022 годзе пачаў работу перасоўны медыцынскі комплекс.

Аднак самай значнай падзеяй 2022 года ўсё ж стала ўзвядзенне ў райцэнтры новага будынка паліклінікі Нясвіжскай ЦРБ. Гэта дазволіць значна павысіць узровень медыцынскага абслугоўвання.







## Дзяржаўная ўстанова «Нясвіжскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі»

У Нясвіжскім раённым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі (РЦГіЭ) для забеспячэння санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва функцыянуюць аддзелы гігіены, эпідэміялогіі, лабараторны, аддзяленне прафілактычнай дэзінфекцыі. На кантролі знаходзіцца амаль 1 тыс. аб'ектаў.

Вялікая работа праведзена спецыялістамі ўстановы ў галіне захавання гістарычнай спадчыны. Гэта і ўдзел у распрацоўцы і карэкціроўцы праектнай дакументацыі, і нагляд за ўсімі этапамі будаўніцтва, і актывізацыя кантролю за турыстычнымі месцамі, аб'ектамі сферы абслугоўвання.

Падчас пандэміі COVID-19 сіламі Нясвіжскага РЦГіЭ зроблена ўсё неабходнае для спынення масавага распаўсюджвання хваробы, забеспячэння бесперабойнай працы прадпрыемстваў, устаноў, у тым ліку праведзена апрацоўка каля 1 900 ачагоў інфекцыі.








## Аптэчная справа

Падчас Вялікай Айчыннай вайны нясвіжская аптэка разам з іншымі медыцынскімі ўстановамі горада была прыстасавана немцамі пад сховішча, а падчас адступлення ворага – спалена. Пасля вызвалення Беларусі ад захопнікаў аптэку размясцілі ў месцы непадалёку, побач з цэнтральнай плошчай, а ў 1974 годзе перавялі ў новы будынак.

Пасля заканчэння вайны ў вёсках Лань і Сейлавічы пачалі працаваць аптэчныя пункты. У 1959 годзе аптэка в. Сноў пераведзена з прыватнага дома ў асобнае памяшканне. У 1961-м у пасёлку цукровага завода адчыніла дзверы для мясцовых жыхароў аптэка № 140. У 1973 годзе ў Нясвіжскай раённай бальніцы для забеспячэння стацыянара медыкаментамі з'явілася аптэка № 200. А аптэка № 5 г. п. Гарадзея ў 1996 годзе была рэарганізавана ў аптэчны кіёск.








Нясвіжская аптэка № 4 з 1966 года мае статус цэнтральнай раённай установы, які дзейнічае і па сённяшні дзень. На дадзены момант на тэрыторыі Нясвіжскага раёна функцыянуюць дзевяць аптэк РУП «Мінская Фармацыя», адна – РУП «БелЛекаЦэнтр», пяць – недзяржаўнай формы ўласнасці. Заключаны дагаворы падраду на рэалізацыю лекавых сродкаў з 23 медыцынскімі работнікамі ўстаноў аховы здароўя.







Выхаванцы дзіцячага сада № 4

## Адукацыя

Пасля Вялікай Айчыннай вайны пачалі адраджацца ўстановы адукацыі Нясвіжчыны, і ўжо ў 1947 годзе на яе тэрыторыі налічвалася 66 школ: 4 сярэднія, 16 няпоўнасярэдніх і 46 пачатковых. У іх, калі лічыць разам з педагагічным вучылішчам, было каля 10 тыс. дзяцей і падлеткаў. У той жа час завяршылася будаўніцтва школ у вёсках Дубейкі, Петкавічы, Нялепава і інш. Жыхары гэтых населеных пунктаў праявілі выдатную ініцыятыву – арганізавалі школам грамадскую дапамогу.

Гісторыя развіцця дашкольнай адукацыі вядзе адлік з лютага 1945 года, калі ў Нясвіжы адкрыўся першы дзіцячы садок. У яго былі прыняты 70 дзетак ад трох да сямі гадоў.

У 1960–1970-я гады пабудаваны школы ў г. п. Гарадзея, в. Астроўкі, дзіцячы сад пры Ганусаўскай доследнай станцыі.

Сёння сістэму адукацыі Нясвіжскага раёна прадстаўляюць 39 устаноў. Сярод іх 13 – дашкольнай адукацыі (у тым ліку цэнтр развіцця дзіцяці «Сонейка» ў в. Рудаўка), 19 – агульнай сярэдняй (уключаючы гімназію), Гарадзейская спецыяльная школа-інтэрнат, Цэнтр дзіцячай творчасці Нясвіжскага раёна, Нясвіжскі раённы сацыяльна-педагагічны цэнтр, Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі Нясвіжскага раёна, дзіцячы дом сямейнага тыпу, аздараўленчы лагер «Арляня», Нясвіжскі раённы вучэбна-метадычны кабінет.

У 2020 годзе ў раённым цэнтры адкрыўся новы дзіцячы сад № 7 «Чароўная краіна». У сучасным трохпавярховым будынку размясціліся 12 груп на 230 дзяцей рознага ўзросту. Для іх усебаковага развіцця створаны найлепшыя ўмовы. Тут жа працуе STEM-цэнтр.

Развіццё робататэхнікі на Нясвіжчыне пачалося ў 2018 годзе. Цяпер аб'яднанні па інтарэсах ёсць у пяці ўстановах адукацыі, ва ўсіх школах праводзяцца факультатыўныя заняткі па Scratch-праграмаванні. У развіцці гэтага накірунку фінансавую падтрымку аказвае раённы выканаўчы камітэт.

Вялікая ўвага ў школах раёна надаецца патрыятычнаму выхаванню. У сярэдняй школе № 4 створаны ваенна-патрыятычны клас. Акрамя таго, працуюць Цэнтр ваенна-патрыятычнага выхавання і Раённы рэсурсны цэнтр для правядзення заняткаў клубаў юных ратаўнікоў-пажарных. Вынікам мэтанакіраванай работы стала перамога Нясвіжскага раёна ў XVII абласным палявым лагеры «Юны ратаўнік». Каманда сярэдняй школы № 4 г. Нясвіжа «Ястрабы» на працягу пяці гадоў прадстаўляе краіну на міжнародных спаборніцтвах ратаўнікоў-пажарных у Рэспубліцы Азербайджан і займае прызавыя месцы.

















## Установа адукацыі «Нясвіжскі дзяржаўны каледж імя Якуба Коласа»

Новы летапіс установы пачаўся ў 1984 годзе, і з таго часу яна годна працягвае традыцыі пасляваеннага Нясвіжскага педагагічнага вучылішча (працавала з 1944 па 1956 год). Калектыў шануе і захоўвае шматгранную спадчыну і Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (з 1875 па 1918 год). Амаль 40-гадовая гісторыя каледжа – гэта 5 тыс. падрыхтаваных спецыялістаў.

Багаты шлях развіцця педагагічнай адукацыі ў Нясвіжы адлюстроўваецца ў экспазіцыі музея, якую супрацоўнікі ўстановы стварылі з 2012 па 2017 год. Паколькі сам каледж размяшчаецца ў помніку архітэктуры XVI–XVIII стагоддзяў – комплексе кляштара бенедыкцінак, пастаянна вядзецца вялікая работа па захаванні культурнай спадчыны. Таксама частка экспазіцыі прысвечана знакамітаму выпускніку – народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу. Штогод у дзень нараджэння творцы праводзіцца свята «Каласавіны».





У каледжы працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, 29 вучэбных кабінетаў абсталяваны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі, створаны ўсе ўмовы для заняткаў спортам, мастацкай самадзейнасцю, праводзіцца шмат цікавых мерапрыемстваў.

Пераможца шматлікіх міжнародных інтэлектуальных конкурсаў – навуковае таварыства навучэнцаў «Спасціжэнне» – часты госць на канферэнцыях музея-запаведніка «Нясвіж». Мужчынскі інструментальны ансамбль навучальнай установы «Нясвіжскія лыжкары» ў 2009 годзе атрымаў званне народнага. Вакальная група «Шанс», фальклорны калектыў «Кола», інструментальны ансамбль «Дыліжанс» – лаўрэаты рэспубліканскіх конкурсаў мастацкай творчасці моладзі «АРТ-вакацыі», «Беларускі вянок», «ПрафАрт». Усе яны актыўна супрацоўнічаюць з Нясвіжскім гарадскім маладзёжным цэнтрам. Навучэнцы спецыяльнасці «дызайн», пераможцы рэспубліканскіх конкурсаў мастацкай і тэхнічнай творчасці «АрхНавацыя», «ТэхнаІнтэлект», «ТэхнаЁлка», узаемадзейнічаюць з вучнямі і педагогамі мастацкага аддзялення дзіцячай школы мастацтваў.

Нясвіжскі дзяржаўны каледж імя Якуба Коласа неаднаразова атрымліваў званне «Лепшая ўстанова сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінскай вобласці».

# Культура

У Вялікую Айчынную вайну акупанты спалілі бібліятэку ў Нясвіжы (у ёй налічвалася 10 тыс. кніг), Гарадзейскую, а таксама бібліятэку ў польскай гімназіі і 18 раённых. Таксама значна пацярпелі два будынкі культуры і сем хат-чытальняў. Але практычна адразу пасля вызвалення Нясвіжчыны ў раёне зноў распачалося культурнае жыццё. У красавіку 1945 года ў гарадской ратушы адкрылася раённая бібліятэка (яе фонд тады складаў 1,2 тыс. кніг). Для наведвальнікаў узнавілі працу хаты-чытальні ў вёсках Быхаўшчына, Казлы, Качановічы, Квачы, Лань, Ліпа, Лысіца, Лявонавічы, Нялепава, Пагарэльцы, Сноў.

У канцы 1940-х гадоў амаль у кожным малым населеным пункце быў свой аркестр. Танцавальны калектыў Ланскай хаты-чытальні ў 1946 годзе паспяхова выступіў на Усесаюзным аглядзе мастацкай самадзейнасці з беларускімі танцамі «Крыжачок» і «Лянок».

1 верасня 1957 года ў Нясвіжы адкрылася дзіцячая музычная сямігадовая школа. Спачатку заняткі праходзілі ў будынку раённага Дома культуры, але ўлады зрабілі ўсё магчымае для пошуку найлепшага месца і хутка праца ўстановы працягвалася ўжо на базе былога дзіцячага садка № 2. У 2012 годзе школа атрымала статус дзяржаўнай.

Так паступова ствaралася сетка ўстаноў культуры, кожная з якіх стала жамчужынай у каралях цяперашняга дня Нясвіжчыны.

У замку Радзівілаў **з мая 1945 па 2002 год працаваў санаторый**. У тыя часы была зроблена частковая перапланіроўка і праведзена паравое ацяпленне. У 1993 годзе, пасля стварэння **музея-запаведніка «Нясвіж»**, пытанне рэстаўрацыі палаца набыло асаблівую актуальнасць. Будаўнічыя работы стартавалі ў 2004 годзе і завяршыліся ў 2011-м.



Нясвіжскі замак падчас размяшчэння ў ім санаторыя, 1980 год

Яшчэ адна знакавая ўстанова культуры – **Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей**, які адчыніў дзверы для наведвальнікаў 14 студзеня 1995 года. Экспазіцыя размясцілася ў будынку канца XIX стагоддзя і грунтавалася на гістарычным і этнаграфічным матэрыяле, што збіраўся з 1986 года. З 1 студзеня 2005 года музей быў рэарганізаваны ў дзяржаўную ўстанову «Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей», куды ўвайшлі непасрэдна музей, кватэра-музей мастака Міхася Сеўрука (1996 год), ганчарная майстэрня (2001 год) і музейны аб'ект «Кузня» (2006 год).





У 1996 годзе шляхам рэарганізацыі раённых Дома культуры і метадычнага цэнтра быў створаны Нясвіжскі раённы цэнтр культуры.

Такім чынам жыццё Нясвіжа напоўнілася новым зместам. Горад паляпшаўся на вачах. Нездарма ў 2012 годзе Нясвіж быў аб'яўлены культурнай сталіцай Беларусі.

Сёння ў Нясвіжскім раёне працуюць 47 устаноў культуры і мастацтва, у ліку якіх 24 клубы, 18 бібліятэк, 4 дзіцячыя школы мастацтваў і дзяржаўная ўстанова «Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей».










## Дзяржаўная ўстанова «Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей»

Жыхары і госці Беларусі могуць наведаць пяць стацыянарных і дзве выставачныя залы.

Экспазіцыя «Зберагаючы самабытнасць» адлюстроўвае сялянскі ўклад жыцця, побыт, культуру менавіта Нясвіжскага рэгіёна канца XIX – першай чвэрці XX стагоддзя.

У экспазіцыі «Гандаль і рамёствы Нясвіжчыны» сярод каштоўных адзінак прадстаўлены фрагмент Ратушнай плошчы канца XIX – 30-х гадоў XX стагоддзя, калі Нясвіж уваходзіў спачатку ў склад Расійскай імперыі, а затым – Польшчы.

З гісторыяй горада пазнаёміць гасцей экспазіцыя залы «Нясвіж на скрыжаваннях эпох», адкрыццё якой адбылося ў канцы 2016 года.

Экспазіцыя «Вайна. Трагедыя. Подзвіг» пераносіць у часы ваенных канфліктаў XX стагоддзя, якія закранулі тэрыторыю Нясвіжскага раёна. Прадстаўлены дакументы, фатаграфіі, прадметы ваеннай амуніцыі салдат і афіцэраў, якія змагаліся на франтах Першай сусветнай вайны, Вялікай Айчыннай вайны. У лютым 2022 года створана новая экспазіцыя пад назвай «Генацыд. Ведаць. Памятаць», якая раскрывае тэму генацыду беларускага народа ў перыяд акупацыі Нясвіжчыны нямецка-фашысцкімі войскамі. Падчас падрыхтоўкі выкарыстаны матэрыялы з уласных фондаў музея, а таксама экспанаты, перададзеныя пракуратурай Нясвіжскага раёна.

У экспазіцыі «Выратаваныя каштоўнасці» прадстаўлены абразы, складні, настольныя крыжы XIX–XX стагоддзяў, якія перададзены ў музей з Брэсцкай і Гродзенскай мытняў.

Асноўны фонд Нясвіжскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея налічвае звыш 13,5 тыс. адзінак, навукова-дапаможны – звыш 2,5 тыс., размеркаваных паміж 18 калекцыямі. Найбольш значныя з апошніх – «Жывапіс і графіка», «Фотадакументы», «Дакументы», «Посуд», персанальная калекцыя мастака Міхася Сеўрука.






## Дзяржаўная ўстанова культуры «Нясвіжскі раённы цэнтр культуры»

Цэнтр каардынуе і накіроўвае работу 24 устаноў культуры раёна, аказвае практычную і метадычную дапамогу ўсім клубным установам, кантралюе іх дзейнасць.

Усяго пры цэнтры культуры працуе 24 клубныя фарміраванні (з іх 11 – для дзяцей), у якіх бярэ ўдзел 341 чалавек, з якіх больш за 100 – дзеці.

Візітнай карткай раённага цэнтра культуры з'яўляюцца народныя ансамблі песні «Млечны шлях» і «Ліра», народны клуб майстроў «Дыяменты Нясвіжскага краю», народны інструментальны ансамбль «Нясвіжскія лыжкары», заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Тэатр імя Уршулі Радзівіл».

У клубных установах раёна створаны 169 фарміраванняў, у тым ліку 94 для дзяцей. Іх удзельнікамі з'яўляюцца 1 666 чалавек, з іх 907 – дзеці.

У дзейнасці выкарыстоўваюцца не толькі традыцыйныя формы работы, але і інавацыйныя: аўдыяканцэрты, велаквэсты, інтэрактыўныя пляцоўкі, квэсты, квіз-віктарыны, Kids-інтэрактывы і інш.

Працягваецца работа па адраджэнні і захаванні народных абрадаў, промыслаў і рамёстваў, усебакова падтрымліваюцца майстры народнай творчасці, ствараюцца неабходныя ўмовы для іх работы і перадачы каштоўных ведаў моладзі і дзецям.







## Дзяржаўная ўстанова культуры «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы»

З'яўляецца метадычным цэнтрам для 2 гарпасялковых і 15 сельскіх бібліятэк, сярод якіх 7 інтэграваных сельскіх бібліятэк і 1 бібліятэка-клуб.

Штогод паслугамі ўстановы карыстаюцца каля 17 тыс. жыхароў Нясвіжа і Нясвіжскага раёна, з якіх больш за 5 тыс. – непаўналетнія. Кніжны фонд складае амаль 254 тыс. выданняў, штогод паступае каля 2 тыс. новых.

З 2021 года ў раёне па 25 маршрутах працуе бібліятэчны аўтобус, які абслугоўвае жыхароў аддаленых і маланаселеных пунктаў.

У 2022 годзе Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы стала пераможцай рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ў намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем». Першае месца ўстанова заняла і ў VIII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання» ў намінацыі «Духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі». Актыўна ўдзельнічаюць нясвіжскія бібліятэкары і ў іншых конкурсах, акцыях, форумах, фестывалях.

Актыўную работу з чытачамі вядуць 28 аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах. Створаны 35 праектаў, 18 з іх – у раённай бібліятэцы (духоўна-асветніцкі цэнтр «Існасць», «Парады з вуснаў несвіжан», «Нясвіж чытае», «Лёсам з Нясвіжчынай», «Вандроўкі па ваколіцах», «Пакаленне» і інш.).

Цікавыя ініцыятывы ажыццяўляюцца ў Заазерскай, Слаўкаўскай сельскіх, Гарадзейскай гарпасялковай дзіцячай, Ланскай і Затур'янскай, Карцэвіцкай інтэграваных сельскіх бібліятэках.














## Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Нясвіжская дзіцячая школа мастацтваў»

У дзіцячай школе мастацтваў навучаюцца 334 чалавекі па 4 напрамках: музычны, харэаграфічны, выяўленчы, тэатральны. У школе працуюць 30 настаўнікаў, 14 з якіх – былыя выпускнікі гэтай жа ўстановы.

Музычны кірунак уключае ў сябе інструментальнае і харавое аддзяленні. Авалодваюць музычнымі інструментамі 183 навучэнцы. У школе адкрыты яшчэ некалькі аддзяленняў: фартэпіяннае, народных (баян, акардэон, домра, гітара, цымбалы) і духавых (флейта, труба, саксафон) інструментаў, тэарэтычна-харавое, а таксама клас скрыпкі.

Сакрэты тэатральнага майстэрства спасцігаюць 22 вучні, харэаграфіі – 68, выяўленчага мастацтва – 61.

Усяго Нясвіжскую дзіцячую школу мастацтваў з 1957 па 2022 год скончылі звыш 2 тыс. выпускнікоў. Многія з іх звязалі лёс з мастацтвам. Ларыса Жук працуе выкладчыцай Мінскага дзяржаўнага музычнага вучылішча, Таццяна Ульянава – канцэртмайстрам Нацыянальнага тэатра оперы і балета, кіраўнікі амаль усіх мастацкіх калектываў Нясвіжчыны – таксама «родам» з гэтай установы адукацыі.

На ліку несвіжан – шмат узнагарод рознага кшталту, якія навучэнцы здабылі на прэстыжных конкурсах і фестывалях.

Добра вядомы ў раёне і за яго межамі народны ансамбль народнай музыкі і песні «Зараніца», яго ўдзельнікамі з'яўляюцца выкладчыкі Нясвіжскай дзіцячай школы мастацтваў.





## Дзяржаўная ўстанова культуры «Нясвіжскі гарадскі маладзёжны цэнтр»

Працуе са жніўня 2014 года. На базе цэнтра створаны 13 разнажанравых студый: аніматарскага майстэрства «Рэтвіт», народнага вакалу «Вяночкі», арыгінальнага жанру «Свае людзі», дыджэінгу DJ SCHOOL, дзіцячая тэатральная студыя «Мімі дом», узорная студыя акцёрскага майстэрства «Тваракі», клуб аматараў настольных гульняў «Твой ход», аматарскія аб'яднанні «Цудоўны ўзрост», «Экалэнд», «Навучыся і здзівіся», сямейны клуб «Сямейнікі», арт-студыя «Знічкі», ізастудыя для дзяцей «Дзеці Шагала».

Некаторыя мерапрыемствы цэнтра сталі іміджавымі і асабліва папулярнымі ў моладзі. Гэта перш за ўсё раённыя конкурсы «Міс Маладзёжная хваля», «Будзь мужчынам», «Папяровае шоу для дзяцей і бацькоў», свята татаў «Рэальны тата», свята да Дня пажылых людзей Retro-New Battle, конкурс агітбрыгад «Статус: ЗДАРОЎЕ», гарадскі квэст «Вела-Шэрлак», фестываль моладзі «Вайбова» і інш.









# Моладзь

Актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Нясвіжчыны прымаюць новыя пакаленні: на тэрыторыі раёна пражывае звыш за 6,5 тыс. маладых людзей. Самая буйная арганізацыя маладых патрыётаў – грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» (БРСМ) – налічвае ў сваіх радах 1,2 тыс. чалавек. Нясвіжская раённая арганізацыя БРСМ складаецца з 71 пярвічнай арганізацыі (20 – ва ўстановах адукацыі, 1 – у сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе, 50 – на прадпрыемствах і ў арганізацыях горада і раёна).

БРСМ рэалізуе шэраг рэспубліканскіх праектаў: «100 ідэй для Беларусі», «Уладар сяла», «Адкрыты дыялог», «Кветкі Вялікай Перамогі», «Беларусь памятае». Хлопцы і дзяўчаты Нясвіжчыны актыўна ўдзельнічаюць ва ўсебеларускай акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі!», дабрачынных акцыях «У школу з «Добрым Сэрцам», «Цуды на Каляды», «Аднаўленне святынь Беларусі», сельскагаспадарчай акцыі «Моладзь Міншчыны – за ўраджай!», турыстычных злётах сярод працуючай моладзі, злётах маладых спецыялістаў.

Адным з самых запатрабаваных сярод моладзі з'яўляецца студатрадаўскі рух. У 2022 годзе былі сфарміраваны 8 атрадаў, у якіх працаваў 141 баец.

Удзельнікі валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» аддаюць увесь свой вольны час карысным справам. У Нясвіжскім раёне 244 валанцёры аб'яднаны ў 16 атрадаў.

Пры Нясвіжскім раённым Савеце дэпутатаў створаны і актыўна функцыянуе маладзёжны парламент.









# Фізічная культура і спорт

Фізічная культура і спорт заўжды ідуць побач з несвіжанамі па жыцці. У нялёгкі пасляваенны час у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гадоў у раёне былі створаны спартыўнае таварыства «Калгаснік» і аддзел аховы здароўя пры райвыканкаме. У сярэдзіне 1950-х таварыства перайменавана ў Саюз спартыўных таварыстваў і арганізацый, а ў 1962 годзе – у добраахвотнае сельскае спартыўнае таварыства.

У 1959 годзе ў Нясвіжы створана дзіцяча-юнацкая спартыўная школа з аддзяленнямі фехтавання, лёгкай атлетыкі, валейбола, баскетбола і лыжных гонак.

У 1975 годзе дзякуючы народнай будоўлі і пры дапамозе ўсіх арганізацый горада і раёна пачалося стварэнне стадыёна на 2,5 тыс. месцаў.

У 1990-я гады здадзены ў эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Нясвіжы, плавальны басейн Гарадзейскага цукровага камбіната, а ў 1998 годзе праведзена рэканструкцыя стадыёна «Ураджай» у райцэнтры.

Па стане на 2000 год у раёне функцыянавалі 3 стадыёны, 29 спартыўных залаў, 2 плавальныя басейны, 25 спартыўных пляцовак.

Футбольны клуб «Верас» – прызёр Кубка СНД сярод сельскіх калектываў фізічнай культуры, чэмпіён Рэспублікі Беларусь, двухразовы ўладальнік Кубка Беларусі па міні-футболе. Мужчынская каманда па валейболе – чэмпіён Мінскай вобласці.



У 2016 годзе створана дзяржаўная ўстанова «Фізкультурна-аздараўленчы цэнтр Нясвіжскага раёна», у якую ўвайшлі фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Нясвіж», фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Замкавы» і спартыўна-аздараўленчая база «Завітая». Цэнтр аказвае насельніцтву больш за 40 профільных паслуг.

Для заняткаў фізічнай культурай, спортам і турызмам у раёне працуюць 26 спартыўных залаў, 2 спартыўныя стралковыя ціры, 3 плавальныя басейны, 2 міні-басейны, гарадскі стадыён на 2 634 месцы і стадыён на 1 625 месцаў у Гарадзеі, 16 спартыўных пляцовак для гульні ў футбол і іншыя збудаванні. У школах раёна створаны восем спецыялізаваных класаў па спорце: па футболе і плаванні – у сярэдняй школе № 4 г. Нясвіжа і сярэдняй школе № 2 г. п. Гарадзея; па баскетболе – у сярэдніх школах № 1, 3 г. Нясвіжа.

У раёне працуюць дзве дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, у якіх праходзяць заняткі па такіх відах спорту, як валейбол, футбол, баскетбол, мастацкая гімнастыка, плаванне, лыжныя гонкі.









# Сацыяльная абарона

Сістэма сацыяльнай абароны Нясвіжскага раёна ўключае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, ДУ «Нясвіжскі раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва», ДУ «Нясвіжскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў». Усяго ў сістэме працуе 334 чалавекі.

Упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама забяспечвае рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне працоўнага заканадаўства, аховы працы, пенсіённага заканадаўства, садзейнічання занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва.

Дзейнасць ДУ «Нясвіжскі раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» накіравана на аказанне дапамогі грамадзянам, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. У структуры тэрытарыяльнага цэнтра працуе сем аддзяленняў: першаснага прыёму, аналізу, інфармавання і прагназавання; сацыяльнай дапамогі дома; дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту; дзённага знаходжання для інвалідаў; сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі; пражывання з суправаджэннем; кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, якое размешчана ў в. Лявонавічы Нясвіжскага раёна. На ўліку ў тэрытарыяльным цэнтры стаіць 11 212 чалавек. Арганізавана работа васьмі сацыяльных пунктаў. Найбольш запатрабаваны паслугі сацыяльнай дапамогі дома і паслугі сядзелкі. Развіваюцца малазатратныя формы жыццяўладкавання пажылых грамадзян: замяшчаючыя, гасцявыя і патранатныя сем'і. Аказваюцца паслугі дзённага нагляду.







ДУ «Нясвіжскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў», размешчаны ў в. Асмолава Нясвіжскага раёна, забяспечвае пражыванне 147 чалавек. Штогод умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы, ствараюцца камфортныя і бяспечныя ўмовы для пражывання грамадзян, забяспечваецца даступнае асяроддзе для інвалідаў і фізічна аслабленых асоб.

Работа ўстаноў сацыяльнай абароны Нясвіжскага раёна накіравана на якаснае аказанне сацыяльных паслуг і павелічэнне колькасці іх атрымальнікаў.

# Сілавыя структуры

У ліпені 1944 года г. Нясвіж і раён былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адразу аднавілася і дзейнасць аддзела ўнутраных спраў. Міліцыянерам прыходзілася працаваць у вельмі цяжкіх умовах. У мясцовасці дзейнічала восем банд, якія тэрарызавалі, забівалі і рабавалі людзей. Ліквідацыя злодзеяў цягнулася са жніўня 1944 па май 1951 года. Цаной уласнага жыцця плацілі тады супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі і Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), актывісты раёна за мірнае жыццё.

З 1962 па 1967 год усе здзейсненыя злачынствы ў раёне атрымалася раскрыць, паступова зніжаўся пакazчык правапарушэнняў. Добра была арганізавана работа добраахвотных народных дружын.

З 1969 па 1971 год **Нясвіжскі раённы аддзел унутраных спраў (РАУС)** лічыўся ўзорным. А ў 1986 годзе 20 яго супрацоўнікаў прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Пачынаючы з 2004 года гэта структура неаднаразова прызнавалася лепшай у вобласці і рэспубліцы па выніках аператыўна-службовай дзейнасці, узнагароджвалася пераходным прызам батальёна міліцыі імя Канстанціна Уладзімірава.

Было чым ганарыцца і структурнаму падраздзяленню службы аховы. Як самастойная адзінка яно з'явілася 19 красавіка 1960 года ў якасці **міжраённага аддзялення пазаведамаснай службы аховы (ПСА) пры Нясвіжскім аддзеле міліцыі**. У маі ў ім купілі машыну ГАЗ-51, а ўсім ахоўцам магазінаў выдаваліся веласіпеды. З сакавіка 1962 года ў састаў Нясвіжскага міжраённага аддзялення ПСА ўвайшлі Капыль, Цімкавічы. Службу неслі 35 вартаўнікоў, якія ахоўвалі ў асноўным гандлёвыя кропкі. У снежні 1963 года да міжраённага аддзела далучыліся Дзяржынск, Стоўбцы, Негарэлае, Узда, Фаніпаль. Сіламі 232 чалавек ахоўваліся 202 аб'екты. Пры гэтым шырока выкарыстоўваліся сабакі, якіх налічвалася 19.

Паступова колькасць ахоўваемых аб'ектаў павялічвалася, з'явілася неабходнасць стварэння самастойных падраздзяленняў у Дзяржынску, Стоўбцах, Уздзе, Негарэлым, Фаніпалі. Яны выйшлі са складу Нясвіжскага міжрайаддзела ў 1966–1968 гадах.

У 1972-м аддзяленнем быў набыты першы пульт аховы «Нява» на 120 нумароў (у 1980-м такі з'явіўся і ў Гарадзеі). У штаце пачалі працаваць міліцыянеры. А з 1979-га са складу аддзела выйшла ахова Клецка, а затым і Капыля (1984 год). Пульт кіравання быў перанесены ў будынак Нясвіжскага РАУС. Паступова ўдасканальвалася матэрыяльна-тэхнічная база, з'яўляліся аўтамабілі.







Указ
Президиума
Верховного
Совета СССР

«О награждении капитана милиции Шимко Н. А. орденом Красной Звезды»

За мужество и отвагу, проявленные при задержании опасного преступника

НАГРАДИТЬ

орденом Красной Звезды капитана милиции ШИМКО Николая Александровича (посмертно)

Председатель Президиума Верховного Совета СССР — Л. Брежнев

Секретарь Президиума Верховного Совета СССР — М. Георгадзе

Москва, Кремль
28 декабря 1963 года

У 1976 годзе аддзяленню аховы было прысвоена званне «Лепшае аддзяленне аховы МУС СССР».



Сёння проста немагчыма ўявіць наша жыццё без службы ратаўнікоў. **Пажарная частка** пасля вызвалення Нясвіжа ў 1944 годзе аднавіла сваю работу ў старым дэпо. Сярод яе «ўзбраення» былі насосы, дзве помпы і польская машына са звонам. Ратаўнікі самі імкнуліся палепшыць аснашчэнне, і адзін баец з нямецкага аўтамабіля «Опель» зрабіў пажарную машыну з адкрытым верхам, на якой у 1946–1947 гадах служба з гонарам выязджала на тушэнне.

Да 1994 года ў Нясвіжскім раёне існавала прафесійная пажарная ахова, якая складалася ў асноўным з добраахвотнікаў. У маі 1994-га адбыўся I этап яе ваенізацыі: ваенізіраванымі сталі пажарная частка (ВПЧ) г. Нясвіжа, ВПЧ г. п. Гарадзея і асобны пост ваенізаванай пажарнай службы завода медыцынскіх прэпаратаў. На той час у падраздзяленнях было 6 машын і 36 чалавек асабістага саставу.

З лістапада 1995 года праходзіла ваенізацыя пажарнай службы сельскай мясцовасці. Былі арганізаваны пасты ваенізаванай пажарнай аховы ў вёсках Сноў, Астроўкі (ліквідаваны ў 2005 годзе), Высокая Ліпа (існаваў да 1999-га), Салтанаўшчына, Лань (працаваў да 2016 года).

У лістападзе 2005 года кіраўніцтва Нясвіжскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях (РАНС) і пажарная аварыйна-ратавальная частка (ПАРЧ) № 1 пераехала ў новы будынак, у якім яшчэ размяшчалася ПАРЧ № 3. А са студзеня 2011 года ў раёне працуе **штаб ліквідацыі надзвычайных сітуацый**.





## Нясвіжскі раённы аддзел унутраных спраў

Па выніках аператыўна-службовай дзейнасці за 2020 і 2021 гады Нясвіжскі РАУС прызнаваўся лепшым сярод падраздзяленняў Мінскай вобласці і ўзнагароджваўся пераходным прызам імя Генадзя Васільевіча Пукава – крыштальнай вазай.

У Нясвіжскім РАУС створаны ўсе ўмовы для якаснага выканання службовых абавязкаў супрацоўнікамі. За апошнія гады праведзена велізарная праца па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы аддзела: выканаы рамонт ізалятара часовага ўтрымання, адкрыта спартыўная зала з сучаснымі трэнажорамі, адрамантаваны фасад асноўнага будынка, праведзены рамонт будынка міліцыі грамадскай бяспекі, закуплена новая мэбля, расчыніла свае дзверы міжраённае экзаменацыйна-рэгістрацыйнае аддзяленне ДАІ, а таксама створаны міжраённы аддзел ДАІ па абслугоўванні Нясвіжскага і Клецкага раёнаў, значна абнавіўся аўтапарк службовага транспарту.












## Нясвіжскі аддзел Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў

Сёння гэта структура мае тэхнічную магчымасць прадастаўляць паслугі па цэнтралізаванай ахове любых аб'ектаў у г. Нясвіжы і Нясвіжскім раёне.

Нясвіжскі аддзел неаднаразова выходзіў пераможцам па выніках службовай дзейнасці сярод падраздзяленняў Дэпартамента аховы Рэспублікі Беларусь і Мінскай вобласці.





## Нясвіжскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях

У склад Нясвіжскага гарнізона РАНС уваходзяць тры пажарныя аварыйна-ратавальныя часткі (№ 1 – у Нясвіжы, № 2 – у г. п. Гарадзея, № 3 – на аб'ектах Нясвіжскага ўпраўлення магістральных газаправодаў адкрытага акцыянернага таварыства «Газпрам трансгаз Беларусь») і пажарныя аварыйна-ратавальныя пасты (№ 11 – у г. Нясвіжы, № 12 – у в. Салтанаўшчыне, № 14 – у аг. Сноў). Штатная колькасць райаддзела па надзвычайных сітуацыях складае 105 чалавек. Падраздзяленні маюць 23 адзінкі баявой тэхнікі, пажарна-тэхнічнае абсталяванне і амуніцыю, аварыйна-ратавальныя інструменты.

На базе аддзела працуе інавацыйна-адукацыйны цэнтр для навучання дзяцей і падлеткаў асновам бяспечнай жыццядзейнасці. Штогод у ім атрымліваюць неабходныя веды больш за 700 дзяцей і звыш 100 дарослых, у тым ліку з суседніх раёнаў вобласці.







# Духоўнасць

На тэрыторыі Нясвіжскага раёна зарэгістравана 31 рэлігійная суполка: 17 – праваслаўнай канфесіі, 4 – рымска-каталіцкай, 9 – хрысціян веры евангельскай, 1 – хрысціян-адвентыстаў сёмага дня.

Пры праваслаўных храмах працуюць 7 нядзельных школ, у якіх займаюцца каля 170 дзяцей. Для іх і моладзі ў прыходзе касцёла Божага Цела дзейнічае катэхізацыя.

На Нясвіжчыне знаходзяцца 45 культавых будынкаў: 17 храмаў, царкоўнапрыходскі дом і 6 капліц праваслаўнай канфесіі; 5 касцёлаў, будынак плябаніі і 6 капліц рымска-каталіцкай канфесіі; 9 цэркваў хрысціян веры евангельскай.

У 2022 годзе пачалося ўзвядзенне новай капліцы прыхода храма Сабора Беларускіх святых па вуліцы Макоўскага ў Нясвіжы.





У горадзе, дзе ўсё дыхае даўнінай, 10 культавых будынкаў з'яўляюцца аб'ектамі гісторыка-культурнай спадчыны. 7 праваслаўных храмаў маюць ІІІ катэгорыю каштоўнасці, 2 касцёлы і капліца – аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны. 2 з іх маюць ІІІ катэгорыю, а касцёл Божага Цела – самую высокую.

Штогод на тэрыторыі прыхода храма Святой Жыватачальнай Тройцы ў аг. Салтанаўшчына праходзяць маладзёжныя злёты Слуцкай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама разгортвае работу праваслаўны лагер «Святая Русь» па аўтарскай праграме настаяцеля храма протаіерэя Алега Абрамовіча. У мерапрыемствах прымаюць удзел каля 400 маладых людзей. У 2016 годзе ў лагеры было створана першае ў гісторыі Нясвіжчыны праваслаўнае братэрства ў гонар Праабражэння Гасподняга. У 2020 годзе Алегу Абрамовічу прысуджана прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».



# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Час імкліва праносіцца, і адзінае, што могуць людзі, – зафіксаваць яго асобныя яркія моманты. Гэта мы і імкнуліся зрабіць у нашай кнізе. Нават чалавечае жыццё ўмяшчае ў сябе шмат падзей, уражанняў, згадак. А што памятаюць дрэвы ў парку Радзівілаў, Фарны касцёл, старажытны замак? Яны не скажуць, але мы ведаем шмат з таго, што адбывалася ў Нясвіжы ў апошнія восем стагоддзяў. Большай часткай – з кніг, якія напісалі сучаснікі далёкіх падзей і якія захавала для нас гісторыя. Хочацца, каб і гэта выданне данесла да нашчадкаў праўду пра тое, як жывуць людзі ў XXI стагоддзі на старажытнай зямлі, як працуюць і адпачываюць, як шануюць мінуўшчыну і ствараюць сучаснасць.

Зараз Нясвіж вядомы ва ўсёй Беларусі і далёка за яе межамі. І не толькі сваім гістарычным мінулым. А дасягненнямі ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, культуры і іншых галінах. Нясвіжскі раён упэўнена крочыць у будучыню. Усім яго жыхарам – далейшых поспехаў, новых здзяйсненняў і перамог!





# ЗМЕСТ


**ВІНШАВАННЕ СТАРШЫНІ НЯСВІЖСКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА** 2

**ГІСТОРЫЯ** 4

Старажытны вянок Нясвіжа 6
Пра што расказалі гарадзішчы 8
Нашы продкі – дрыгавічы 10
Калі нарадзіўся Нясвіж? 13
Замак на стагоддзі 15
Бляск і заняпад Радзівілаў 18
Чорная панна – каханне караля 20
Каменнае аблічча горада 21
Герб і сцяг 22
Папялішча Паўночнай вайны 27
Як птушка Фенікс 29
У складзе Расійскай імперыі 33
Маці нясвіжскіх паркаў – Марыя 35
Першая сусветная вайна 38
Другая сусветная. Уз'яднанне 44
Уставай, краіна! На смяротны бой... 45
У жыцці Нясвіжчыны пакінулі свой след... 48
Яны кіравалі раёнам 49

**СУЧАСНАСЦЬ** 50

Родны край – прыгожы, дзіўны... 52
Сельская гаспадарка. Працавітымі рукамі чалавека... 64
Прамысловасць. Праца па сучасных тэхналогіях 84
Гандаль і прадпрымальніцтва 96
Будаўніцтва 98
Раённае ўнітарнае прадпрыемства «Нясвіжская жыллёва-камунальная гаспадарка» 104
Сфера паслуг 106
Транспарт 112
Сувязь 116
Паліўна-энергетычны комплекс 119
Каб былі шчаслівымі людзі: сацыяльная сфера 124

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** 148

*Навукова-папулярнае выданне*

**НЯСВІЖ**
ДА РОДНАГА КРАЮ З ЛЮБОЎЮ

Аўтар тэксту *Л. М. Дзядзюра*

Рэдакцыйная калегія: *Л. І. Вітко, В. В. Цвірко, К. Г. Харашылава, Т. А. Байкаш, А. У. Рыжыкава, В. У. Шкрабіна, Л. М. Ясевіч*

Фота: *В. В. Ражкоў*

У кнізе выкарыстаныя фотаздымкі і матэрыялы, перададзеныя Нясвіжскім раённым выканаўчым камітэтам, а таксама з архіваў рэдакцыі газеты «Нясвіжскія навіны»

Адказны за выпуск *А. С. Пацей*
Менеджар праекта *А. А. Івашкова*
Літаратурны рэдактар *А. С. Федарака*
Тэхнічны рэдактар *А. В. Лапава*
Дызайн, мастацкае афармленне і камп'ютарная вёрстка *А. Д. Уваравай*
Карэктары: *Б. Ю. Ганушкіна, А. Т. Гардзей, В. М. Падароўская, Д. І. Смірнова*

Падпісана да друку 02.05.2023. Фармат 230×230. Папера мелаваная.
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 19,0. Ул.-выд. арк. 24,2. Тыраж 150 экз. Заказ 22653.

Выпушчана па замове дзяржаўнай установы «Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Нясвіжскага раёна».

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Колорград».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/471 ад 28.07.2015.
Зав. Веласіпедны, 5-904, 220033, г. Мінск.
www.segment.by

16+

УДК 908(476.1)
ББК 26.89(4Беи)
Н99

**ISBN 978-985-896-430-6**

© Дзяржаўная ўстанова «Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Нясвіжскага раёна», 2023
© Афармленне. ТАА «Колорград», 2023